Национальная академия наук Беларуси
Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И.С. Лупиновича
Институт истории
Научный совет по книжной культуре, книгоизданию и библиотекам
Международной ассоциации академий наук

Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований

Доклады II Международной научной конференции
Минск, 29 сентября 2023г.



НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ

Белорусская сельскохозяйственная библиотека
им. И.С. Лупиновича

Институт истории

Научный совет по книжной культуре, книгоизданию и
библиотекам Международной ассоциации академий наук

СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО БЕЛАРУСИ СКВОЗЬ ПРИЗМУ НАУЧНЫХ ИССЛЕДОВАНИЙ

Доклады II Международной научной конференции,
приуроченной к 95-летию
Национальной академии наук Беларуси,
Минск, 29 сентября 2023 г.

Минск
УП «ИВЦ Минфина»
2023

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 63(091)(476)
ББК 4г
С29

Редакционная коллегия:
Ю. О. Каракулько (отв. ред.),
В. Б. Бабарико-Омельченко, М. В. Глеб, В. Н. Жук, В. Г. Мазец, О. А. Морозова, Н. С. Шакура

Рецензенты:
доктор исторических наук, доцент Н. В. Смехович
кандидат исторических наук, доцент Е. А. Гребень

С29 **Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований** : доклады II Международной научной конференции, приуроченной к 95-летию Национальной академии наук Беларуси, Минск, 29 сентября 2023 г. / Национальная академия наук Беларуси, Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И. С. Лупиновича, Институт истории, Научный совет по книжной культуре, книгоизданию и библиотекам Международной ассоциации академий наук ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.] ; рец.: Н. В. Смехович, Е. А. Гребень. – Минск : ИВЦ Минфина, 2023. – 339 с.

ISBN 978–985–880–361–2

В сборник включены доклады участников II Международной научной конференции, приуроченной к 95-летию Национальной академии наук Беларуси, «Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований».

Опубликованы доклады представителей различных отраслей науки – исторических, сельскохозяйственных, педагогических, архитектуры: ученых академических научных учреждений, аспирантов, докторантов, преподавателей учреждений образования, руководителей и специалистов библиотек и архивов Беларуси и России.

Материалы сборника могут представлять интерес для историков, специалистов, работающих в сфере науки, образования, сельского хозяйства, информационной и библиотечной отрасли, ученых и исследователей, преподавателей, аспирантов, магистрантов и студентов, а также всех, кто интересуется вопросами истории.

Авторы опубликованных статей несут персональную ответственность за точность и достоверность представленной информации.

УДК 63(091)(476)
ББК 4г

ISBN 978–985–880–361–2

©ГУ «Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И.С. Лупиновича» Национальной академии наук Беларуси, 2023

©Оформление. УП «ИВЦ Минфина», 2023

1В 490739
ЦНБ им. Я.Коласа
НАН Беларуси

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS

I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library

Institute of History

Scientific Council for Book Culture, Book Publishing and Libraries
of the International Association of the Academies of Sciences

AGRICULTURE OF BELARUS THROUGH THE PRISM OF SCIENTIFIC RESEARCH

Proceedings of the International scientific conference, dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023

Minsk
UE «Information and Computing Center of the Ministry of Finance»
2023

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

UDC 63(091)(476)

Editorial board:
Yu. A. Karakulka (managing editor),
V. B. Babaryka-Amelchanka, M. V. Hleb, V. M. Zhuk, V. G. Mazets,
O. A. Morozova, N. S. Shakura

Reviewers:
Grand PhD in Historical sciences, associate professor N. V. Smekhovich
PhD in Historical sciences, associate professor E. A. Greben

Agriculture of Belarus through the prism of scientific research:. proceedings of the II International scientific conference dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023 – Minsk : Information and Computing Center of the Ministry of Finance, 2023. 339 p.

ISBN 978–985–880–361–2

The proceedings include papers presented at the II International scientific conference "Agriculture of Belarus through the prism of scientific research", dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus.

Researchers of different branches of science (historical, agricultural, pedagogical and architectural) have submitted their papers: scientists of academic scientific institutions, PhD and grand PhD students, lecturers of educational institutions, managers and specialists of libraries and archives of Belarus and Russia.

The papers in the proceedings may be of interest to historians, specialists working in science, education, agriculture, information and library sector, scientists and researchers, PhD and Master's degree students, students, as well as to all interested in history.

The accuracy and reliability of the information presented in the papers belong solely to the authors.

UDC 63(091)(476)

ISBN 978–985–880–361–2

© I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, 2023

©Design. UE «Information and Computing Center of the Ministry of Finance», 2023

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

СОДЕРЖАНИИЕ

РЕШЕНИЕ АГРАРНОГО ВОПРОСА И ВНЕДРЕНИЕ ДОСТИЖЕНИЙ АГРАРНОЙ НАУКИ В СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО БЕЛАРУСИ

Голубеў В.Ф. Вялікая аграрная рэформа XVI ст. – першая спроба комплекснай перабудовы ў галіне сельскай гаспадаркі на тэрыторыі Беларусі..... 11
Доўнар А.Б. Актуальныя пытанні даследаванняў па аграрнай гісторыі Беларусі XVI–XVIII стст..... 25
Саракавік І.А., Мардачова К.А. Асноўныя акты ветэрынарнага заканадаўства на тэрыторыі Беларусі. 1919–1941 гг..... 36
Сергачев С.А. Сельскохозяйственные выставки в БССР в 1950-е гг.: обмен опытом, наука, архитектура..... 51
Третьяк Е.И. Забытые сельскохозяйственные культуры (кок-сагыз): каучуководство в БССР по материалам Белорусского государственного архива кинофотофонодокументов..... 64

РОЛЬ НАУКИ, ОБРАЗОВАНИЯ И ПРОСВЕЩЕНИЯ В РАЗВИТИИ АГРАРНОЙ ОТРАСЛИ БЕЛАРУСИ

Шимукович С.Ф. К вопросу о высшем сельскохозяйственном образовании на белорусских землях в XIX – начале XX в..... 75
Ерашэвіч А.У. Горы-горацкія сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы ў 1836–1863 гг.: арганізацыйна-фінансавыя аспекты стварэння і дзейнасці..... 85
Носевич Л.И. «Не притащенная» наука: институциализация сельскохозяйственного опытного дела в России и Беларуси..... 115
Глеб М.В. Становление исследований по аграрной науке в Институте белорусской культуры..... 138
Дубовик Е.А., Дубовик А.К. Белорусский государственный институт сельского и лесного хозяйства: создание и деятельность (1922–1925 гг.)..... 147

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Жук С.А. Организационное развитие сельскохозяйственных наук в АН БССР (вторая половина 1940-х гг.)..... 160
Жук В.Н. Академия сельскохозяйственных наук БССР: организационное оформление..... 169
Дубовик А.К. Из истории научно-технических обществ в сельском хозяйстве БССР..... 192
Мазец В.Г. Акадэмія аграрных навук Рэспублікі Беларусь на шляху фарміравання механізму ўкаранення дасягненняў навукі ў сельскагаспадарчую вытворчасць (1992–1995 гг.)..... 207

РАЗВИТИЕ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОЙ НАУКИ БЕЛАРУСИ В БИОГРАФИЯХ

Морозов В.Н. Выпускники Горы-Горецкого земледельческого института – авторы первого энциклопедического справочника сельскохозяйственных знаний Российской Империи..... 215
Мяньчэня С.В. Ксёндз Генрык Бэта як папулярызатар беларускага пчалярства..... 225
Берёзкина Н.Ю. Вклад Я. Наркевича-Иодко в развитие сельского хозяйства: по материалам печати конца XIX – начала XX в..... 231
Барапоўскі А.В. Унёсак Д.Ф. Прышчэпава ў дзяржаўнае будаўніцтва Савецкай Беларусі і яе сацыяльна-эканамічнае развіццё ў 1920-я гады..... 239

АГРАРНАЯ НАУКА В КОНТЕКСТЕ БИБЛИОТЕЧНО-ИНФОРМАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

Пирогова О.В. Библиографические указатели по сельскому хозяйству Фундаментальной библиотеки им. В.Г. Белинского Академии наук БССР : к истории вопроса..... 248
Пирумова Л.Н., Костин А.К., Дунаев А.Н. Научное наследие белорусской аграрной науки в информационных продуктах ЦНСХБ..... 258

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Гринкевич О.А., Богиня К.В. Фонд электронных изданий ФАО ФГБНУ ЦНСХБ..... 268
Аксюто Е.В., Муравицкая Р.А., Шакура Н.С., Слемнева В.В. Инструменты модернизации информационного обслуживания в удаленном режиме: опыт Белорусской сельскохозяйственной библиотеки..... 275
Нохрина В.А., Кочеткова Ю.О. Мониторинг тематической структуры документного фонда ФГБНУ ЦНСХБ (2018–2022 гг.)..... 292
Морозова И.А. Авторитетные записи имен лиц как средство поиска и представления информации об ученых-аграриях Беларуси в электронном каталоге Центральной научной библиотеки НАН Беларуси..... 301
Семенова О.Ф., Ласточкина Н.В. Электронный каталог научной отраслевой библиотеки: особенности и направления развития..... 310
Бабарыка-Амельчанка В.Б., Джумкова М.В., Бальнікаў А.А. Аграрная навука – вытворчасці: публікацыйная актыўнасць навукоўцаў у выданнях вытворча-практычнага прызначэння на сучасным этапе..... 319
Сведения об авторах..... 331

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

CONTENTS

THE SOLUTION TO THE AGRARIAN QUESTION AND INTRODUCTION OF AGRICULTURAL RESEARCH ACHIEVEMENTS INTO THE AGRICULTURE OF BELARUS

HolubeuV.F. The 16th century great agrarian reform – the first attempt at a comprehensive restructuring in the field of agricultural production on the territory of Belarus..... 11
Dounar A.B. Topical issues of research on the agrarian history of Belarus of the 16th – 18th centuries..... 25
Sorokovik I.A., Mardacheva K.A. The main acts of veterinary legislation on the territory of Belarus1919–1941... 36
Sergachev S.A. Agricultural exhibitions in the BSSR in the 1950s: exchange of experience, science, architecture..... 51
Tratsiak A.I. Forgotten agricultural crops (kok-saghyz): rubber plant cultivation in the BSSR according to the materials of the Belarussian State Archives of Films, Photographs and Sound Recordings..... 64

THE ROLE OF SCIENCE, EDUCATION AND ENLIGHTENMENT IN THE DEVELOPMENT OF THE AGRICULTURAL SECTOR IN BELARUS

Shymukovich S.F. On the issue of higher agricultural education in the Belarusian lands in the 19th – early 20th centuries..... 75
Yerashevich A.V. Gory-Goretsky agricultural educational institutions in 1836–1863: organizational and financial aspects of their creation and activity..... 85
Nosevich L.I. "Non-brought-in" science: institutionalization of agricultural experimentation in Russia and Belarus..... 115
Hleb M.V. The beginnings of research in agricultural science at the Institute of Belarusian Culture..... 138
Dubovik A.A., Dubovik A.K. Byelorussian State Institute of Agriculture and Forestry: establishment and activity (1922–1925)..... 147

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Zhuk S.A. Organizational development of agricultural sciences in the Academy of Sciences of the BSSR (second half of the 1940s)..... 160
Zhuk V.M. Academy of Agricultural Sciences of the BSSR: organizational establishment..... 169
Dubovik A.K. From the history of scientific and technical societies in agriculture of the BSSR..... 192
Mazets V.G. The Academy of Agrarian Sciences of the Republic of Belarus on the way of forming a mechanism for introducing scientific achievements into agricultural production (1992–1995)..... 207

DEVELOPMENT OF AGRICULTURAL SCIENCE IN BELARUS IN BIOGRAPHIES

Marozau V.N. Graduates of the Gory-Goretsky Agricultural Institute who were the authors of the first encyclopedic reference book of agricultural knowledge of the Russian Empire..... 215
Mianchenya S.V. Priest Henrik Beta as a popularizer of belarusian beekeeping..... 225
Beryozkina N.Yu. Contribution of J. Narkiewicz-Jodko in the development of agriculture: based on materials from the press of the late 19th – early 20th centuries..... 231
Baranouski A.V. D.F. Pryshchepau's contribution to state building of Soviet Belarus and its socio-economic development in the 1920s..... 239

AGRARIAN SCIENCE IN THE CONTEXT OF LIBRARY AND INFORMATION ACTIVITIES

Pirogova O.V. Indexes on agriculture of the Fundamental Library named after V.G. Belinsky of the Academy of Sciences of the BSSR: on the history of the issue..... 248
Pirumova L.N., Kostin A.K., Dunaev A.N. Scientific heritage of belarusian agrarian science in the information products of the CSAL..... 258
Grinkevich O.A., Boginya K.V. The collection of FAO electronic publications in the CSAL..... 268

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Aksiuta E.V., Muravitskaya R.A., Shakura N.S., Slyamnyova V.V. Tools for modernization of information services in remote mode: the experience of Belarusian Agricultural Library..... 275
Nokhrina V.A., Kochetkova Y.O. Monitoring of the thematic structure of the Central Sientific Agricultural Library document fund (2018–2022)..... 292
Morozova I.A. Personal names authority records as means of search and presentation of information about Belarusian agriculture researchers in the electronic catalogue of the Central Science Library of the NAS of Belarus..... 301
Semienova O.F., Lastochkina N.V. Electronic catalog of the scientific branch library: features and directions of development..... 310
Babaryka-Amelchanka V.B., Dzhumkova M.V., Balnikov A.A. Agrarian science for production: publication activity of scientists in the editions of production and practical purpose at the present stage..... 319
Information about the authors..... 335

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

РЕШЕНИЕ АГРАРНОГО ВОПРОСА И ВНЕДРЕНИЕ ДОСТИЖЕНИЙ АГРАРНОЙ НАУКИ В СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО БЕЛАРУСИ

THE SOLUTION TO THE AGRARIAN QUESTION AND INTRODUCTION OF AGRICULTURAL RESEARCH ACHIEVEMENTS INTO THE AGRICULTURE OF BELARUS

УДК 94(476)+338.24.021.8(091)(476)«15»
https://doi.org/10.5281/zenodo.8333725

В. Ф. Голубеў

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

ВЯЛІКАЯ АГРАРНАЯ РЭФОРМА XVI ст. – ПЕРШАЯ СПРОБА КОМПЛЕКСНАЙ ПЕРАБУДОВЫ Ў ГАЛІНЕ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Анатацыя. Паказаны знешнія і ўнутраныя перадумовы, арганізацыя і асноўныя вынікі правядзення ў Вялікім Княстве Літоўскім у сярэдзіне – другой палове XVI ст. рэформы ў аграрным сектары эканомікі. Даказана, што аграрная рэформа праводзілася як асобная частка агульнай перабудовы сістэмы кіравання дзяржаўнымі ўладаннямі ў ВКЛ у XVI ст. Падрэслена значэнне вялікай аграрнай рэформы для развіцця эканомікі краіны. Выказана абгрунтаванае меркаванне, што “Устава на валокі” ад 1 красавіка 1557 г., складзеная як інструкцыя для рэвізораў і мернікаў, выконвала і ролю праграмнага дакумента па перабудове ўсіх галін гаспадаркі ВКЛ.

Ключавыя словы: аграрная рэформа XVI ст., дзяржаўныя ўладанні, рэформа кіравання, сельская гаспадарка, “Устава на валокі”, эканамічнае развіццё, Вялікае Княства Літоўскае, Беларусь.

Для цытавання. Голубеў, В. Ф. Вялікая аграрная рэформа XVI ст. – першая спроба комплекснай перабудовы ў галіне сельскагаспадарчай вытворчасці на тэрыторыі Беларусі / В. Ф. Голубеў // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси, Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории, Науч. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 11–24.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

В. Ф. Голубев

Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

ВЕЛИКАЯ АГРАРНАЯ РЕФОРМА XVI в. – ПЕРВАЯ ПОПЫТКА КОМПЛЕКСНОЙ ПЕРЕСТРОЙКИ В ОБЛАСТИ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ПРОИЗВОДСТВА НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

Аннотация. Показаны внешние и внутренние предпосылки, организация и основные результаты проведения в Великом Княжестве Литовском в середине – второй половине XVI века реформы в аграрном секторе экономики. Доказано, что аграрная реформа проводилась как отдельная часть общей перестройки системы управления государственными владениями ВКЛ в XVI веке. Подчеркнуто значение Великой аграрной реформы для развития экономики страны. Высказано обоснованное предположение, что «Устава на волоки» от 1 апреля 1557 г., составленная как инструкция для ревизоров и землемеров, сыграла также роль программного документа по перестройке всех отраслей экономики ВКЛ.

Ключевые слова: аграрная реформа XVI века, государственные владения, реформа управления, сельское хозяйство, «Устава на волоки», экономическое развитие, Великое Княжество Литовское, Беларусь.

Valentine F. Holubeu

The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

THE 16TH CENTURY GREAT AGRARIAN REFORM – THE FIRST ATTEMPT AT A COMPREHENSIVE RESTRUCTURING IN THE FIELD OF AGRICULTURAL PRODUCTION ON THE TERRITORY OF BELARUS

Abstract. The paper shows external and internal prerequisites, organization and main results of the reform in the agrarian sector of the economy in the Grand Duchy of Lithuania (GDL) in the middle - second half of the 16th century. It is proved that the agrarian reform was carried out as a separate part of the general reorganization of the system of management of state estates of the GDL in the 16th century. The importance of the Great Agrarian Reform for the development of the country's economy was emphasized. There is a reasonable assumption that the "Ustava na voloki" dated April 1, 1557, compiled as an instruction for inspectors and surveyors, also played the role of a program document for the restructuring of all sectors of the economy of the GDL.

Keywords: agrarian reform of the 16th century, state possessions, management reform, agriculture, "Ustava na voloki", economic development, Grand Duchy of Lithuania, Belarus.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

For citation. Holubeu V. F. The 16th century Great Agrarian Reform – the first attempt at a comprehensive restructuring in the agricultural production field on the Belarus territory. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the II International scientific conference dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023. Minsk, 2023, pp. 11–24 (in Belarusian).

XVI стагоддзе сталася найцікавейшым перыядам у гісторыі Беларусі. У гэты час перабудова ахапіла практычна ўсе бакі жыцця – унутраную і знешнюю палітыку, дзяржаўнае ўладкаванне, культуру, адукацыю, навуку, канфесійную арганізацыю і інш. Змяненні, якія адбываліся, мелі ў пераважнай большасці прагрэсіўны характар (прагрэсіўны ў рамках тагачаснага феадальнага грамадства). Найбольш заўважныя і станоўчыя змены адбываліся ў сферы эканомікі, што дало падставу некаторым даследчыкам назваць XVI ст. “залатым векам” у гісторыі Беларусі.

Крытычны аналіз гістарыяграфіі, прысвечанай сацыяльна-эканамічнаму развіццю Беларусі ў XVI ст., увядзенне ў навуковае абарачэнне больш шырокага кола крыніц і прымяненне новых метадаў навуковага даследавання, дэталёвы аналіз тэкста “Уставы на валокі” дазволілі выказаць меркаванне, што ў XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) была праведзена шырокая перабудова сістэмы кіравання дзяржаўнымі ўладаннямі – гарады, сельская і лясная гаспадарка, пашырэнне сферы таварна-грашовых адносін і інш. [1]. У аснову гэтай перабудовы была пакладзена аграрная рэформа, таму што галоўнай галіной эканомікі з’яўлялася сельская гаспадарка і ад узроўню яе развіцця залежала становішча ўсёй краіны.

На правядзенне такога комплекса рэформ паўплываў шэраг як унутраных, так і знешніх фактараў. Так, ужо ў канцы XV – пачатку XVI ст. на эканоміку Беларусі, як і ўсяго ВКЛ, значны ўплыў аказаў рост попыту на хлеб у тых заходнееўрапейскіх краінах, дзе ішоў працэс першапачатковага назапашвання капітала (найперш Галандыя і Англія). Развіццё рынкавых адносін прывяло ў краінах Заходняй Еўропы да адмовы ад прымацавання сялянства да зямлі і да адмены прыгоннага права, стварэння рынка свабоднай рабочай сілы, што, у сваю чаргу,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

выклікала хуткі рост прамысловасці і імклівую урбанізацыю. Гэтыя з'явы вялі да актывізацыі гаспадарчай актыўнасці не толькі ў вышэйзгаданых краінах, але і ў іншых, у першую чаргу тых, з якімі ў іх меліся гаспадарчыя і гандлёвыя адносіны. Разам з тым, у заходнееўрапейскіх краінах у сувязі з перамяшчэннем значнай часткі сельскага насельніцтва ў гарады, намеціўся некаторы спад вытворчасці традыцыйнай для іх сельскагаспадарчай прадукцыі. У гэтых краінах узрастаў попыт не толькі на збожжа, але і на жывёлу, на прадукцыю лясной гаспадаркі, на тэхнічныя культуры, што таксама вяло да росту зацікаўленасці феадалаў ВКЛ у павялічэнні экспарта прадукцыі.

Стварылася магчымасць зарабіць добрыя грошы на экспарце збожжа ў Еўропу. У ВКЛ ініцыятыву перабудовы сельскай гаспадаркі для вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі на продаж за мяжу ўзяла на сябе дзяржава, а таксама некаторыя магнаты, якія правялі перабудову сваёй гаспадаркі.

Але сельская гаспадарка ВКЛ не была поўнасцю арыентаваная на замежныя рынкі, развіццё эканомікі краіны вызначалася не толькі еўрапейскай збожжавай кан'юнктурай. Хаця шырокі еўрапейскі рынак стымуляваў экспарт, гаспадарка працавала ў першую чаргу на забеспячэнне ўласных патрэбаў.

Важнейшым фактарам эвалюцыі гаспадаркі ВКЛ у гэты час было далейшае паглыбленне грамадскага падзелу працы і значнае развіццё на гэтай аснове таварна-грашовых адносін. Выразным паказчыкам гэтага працэса стаў хуткі рост гарадоў, якія з'яўляліся цэнтрамі развіцця рамяства і гандлю, а таксама мястэчак, як аграрна-рамесніцка-гандлёвых паселішчаў. Па падліках М.Ф. Спірыдонава ў Беларусі ў канцы XVI ст. налічвалася прыблізна 30 гарадоў і 400 мястэчак, большасць з якіх атрымала статус паселішчаў гарадскога тыпу на працягу XVI ст. [2, с. 50]. З'яўленне новых гарадоў і мястэчак спрыяла складванню і развіццю ўнутранага рынка, павялічэнне колькасці гарадскога насельніцтва суправаджалася ростам попыту на прадукцыю сельскай гаспадаркі і промыслаў, што таксама было адной з важных перадумоваў і стымулаў эканамічнага развіцця краіны.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Эканамічная сітуацыя ў першай палове XVI ст. у ВКЛ была вельмі напружанай. Грошай у скарба амаль не было. Гаспадарскія двары прыбыткаў прыносілі мала, а грошы патрабаваліся ў асноўным на вядзенне ваенных дзеянняў з усё больш мацнеючым Вялікім Княствам Маскоўскім. Пад час ваенных дзеянняў замаруджваўся гандаль, прыходзіла ў заняпад сельская гаспадарка. Пастаянныя экстраардынарныя зборы, у першую чаргу серабшчына, выклікалі незадавальнене шляхты. Спробы павялічыць паступленні ў скарб, заснаваныя на нязменнасці асноў землекарыстання і павіннаснага і падаткавага абкладання залежнага насельніцтва поспеху не прыносілі. І таму менавіта ў гэты час урад запланаваў радыкальныя змены ў сістеме кіравання дзяржаўнымі ўладаннямі.

Актыўны пошук дзяржавай грошай на ваенныя патрэбы вымушаў да правядзення такой гаспадарчай палітыкі, якая б спрыяла новым грашовым паступленням. Войны ВКЛ у XVI ст. з суседнім Маскоўскім княствам вымусілі дзяржаву да выпрацоўкі і правядзення спецыяльнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі. Прычым, яна значна адрознівалася па рэгіёнах: на захадзе і ў цэнтры была праведзена глыбокая эканамічная рэформа, на ўсходзе змяненні былі менш радыкальнымі, з улікам таго, што тут адбываліся падзеі Лівонскай вайны 1558–1583 гг.

Такім чынам, асноўны ўплыў на характар гаспадарчага развіцця ВКЛ у канцы XV – XVI ст. аказвалі эканамічныя складнікі, як знешнія, так і ўнутраныя. Натуральна, што яны знаходзілі сваё адлюстраванне ў палітычных рашэннях, якія былі канчаткова сфармуляваны і аформлены ў агульнадзяржаўным маштабе ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг., а таксама ва “Уставе на валокі” 1557 г.

Да 1540-х гадоў XVI ст. у большасці дзяржаўных уладанняў ВКЛ існавала састарэлая сістэма землекарыстання і абкладання сялянства павіннасцямі. Яна абапіралася на розныя па сваіх назвах і памерах адзінкі абкладання (службы, жарэбі, дворышчы, айчыны і інш.). Верагодна, што некалі яны ўключалі ў сябе прыблізна аднолькавую колькасць ворыўнай зямлі і абкладаліся прыблізна аднолькавымі павіннасцямі. Але з цягам часу

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

названыя зямельныя адзінкі пачалі значна адрозніваць па сваіх памерах нават у межах аднаго канкрэтнага ўладання. Прычыны былі розныя: некаторыя гаспадаркі мацнелі, пашыралі памеры свайго надзела, іншыя наадварот, з-за недахопу рабочых рук ці цяглавай сілы звужалі памеры свайго землекарыстання. А павіннасці прызначаліся не з колькасці зямлі, а з адзінкі абкладання (служба, дворышча і інш.). У разглядаемы час гэтыя адзінкі былі неаднолькавыя па памерах і не адлюстроўвалі рэальных памераў сялянскага землекарыстання. Такім чынам, існуючая сістэма павіннаснага абкладання недастаткова поўна ўлічвала вытворчыя рэсурсы сялянскай гаспадаркі, у першую чаргу памеры зямельных надзелаў. Выйгравалі ў гэтай сітуацыі тыя сяляне, у якіх зямельныя надзелы былі больш за сярэдні. Землеўладальнік, у дадзеным выпадку дзяржава, у такой сітуацыі губляў частку феадальнай рэнты.

Такім чынам, склалася сітуацыя, калі ў краіне не была ўлічана дакладная колькасць ворыўнай зямлі, сялянскія павіннасці за карыстанне надзелам прызначаліся “па-старому” і напрамую не залежалі ад памераў надзела. Некаторыя сялянскія гаспадаркі з малым надзелам адбывалі такія ж павіннасці як і тыя, у каго зямлі было значна больш. Іншыя ж карысталіся значна большымі надзеламі, але выплачвалі з іх заніжаную рэнту.

Для ліквідацыі вышэйзгаданых недахопаў і быў праведзены шэраг мерапрыемстваў, якія ў тагачасных крыніцах звычайна абазначаліся як “валочная памера”.

Першыя спробы аграрных пераўтварэнняў адбыліся ва ўладаннях каралевы Боны (жонкі вялікага князя Жыгімонта Старога і маці вялікага князя Жыгімонта Аўгуста) яшчэ ў 1533 г. “У шырокіх маштабах вымярэнне (“помера”) зямлі на валокі ўпершыню было праведзена ў канцы 40 – пачатку 50-х гадоў XVI ст. ва ўладаннях каралевы Боны Гарадзец (Давыд-Гарадок), Пінск, Клецк, Кобрын, а таксама ў Гродзенскім і Брэсцкім старостваx” [3, с. 77]. Тут зямля была перамерана на стандартную адзінку – валоку, упарадкавана павіннаснае і падаткавае абкладанне сялянства, якое залежала ад колькасці і якасці зямлі, якая была ў распараджэнні сялянскай сям’і. У выніку даходы з

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

рэфармаваных уладанняў каралевы Боны значна выраслі, рэформай зацікавіўся вялікі князь Жыгімонт Аўгуст.

Верагодна, што рашэнне аб неабходнасці ажыццяўлення зменаў не толькі ў сферы землекарыстання, але і ў іншых галінах эканомікі, былі зроблены кіраўніцтвам краіны пасля не зусім удалай "першай памеры", якая была праведзена ў дзяржаўных уладаннях ВКЛ прыблізна ў 1540-я – пачатку 1550- х гадоў. Шырока рэформа ў ВКЛ пачала праводзіцца з 1551 г. "паводле Уставы яго каралеўскай міласці ў Вялікім Княстве Літоўскім" [4, s. 147]. Вядома, што ў жніўні 1551 г. памера была праведзена ў Ашмянскай воласці, а ў кастрычніку 1551 г. на Віленскім сейме шляхта спрабавала дабіцца адмены прад'яўлення дакументаў на маёнткі ў сувязі з правядзеннем памеры [3, с. 77].

На жаль, ні Устава 1551 г., ні інструкцыя каралеўскім мернічым, аб існаванні якой сведчаць некаторыя крыніцы, пакуль не знойдзены і аб правядзенні самой аграрнай рэформы ў гэты час можна меркаваць у асноўным толькі па адзінкавых, а ў шэрагу выпадкаў і па ўскосных сведчаннях. Вядома толькі, што памеры пачаткова падлягалі тыя гаспадарскія землі, дзе здавён існавалі "двары" – гаспадаркі, заснаваныя на працы прыгонных сялян, правобразы будучых фальваркаў.

Галоўным дакументам, які сведчыць аб характары эканамічных мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў дзяржаўных уладаннях ВКЛ у сярэдзіне – другой палове XVI ст. з'яўляецца "Устава на валокі" ад 1 красавіка 1557 г. і дадаткі да яе [5].

Пры правядзенні першапачатковай памеры (найперш пры вымярэнні дзяржаўнай зямлі) былі дапушчаны значныя парушэнні, недакладнасці і таму кіраўнік дзяржавы быў вымушаны даць указанне аб праверцы (рэвізіі) яе правядзення. Як сведчыць тэкст самой "Уставы на валокі", менавіта для рэвізораў у першую чаргу яна і была зацверджана. У 1557 г. і наступным, 1558 г. былі прыняты некаторыя дадаткі да "Уставы на валокі" і надалей яна стала інструкцыяй не толькі для рэвізораў, а і для ўпраўляючых гаспадарскімі ўладаннямі.

У ходзе новай памеры там, дзе зямля была памерана на валокі да 1557 г., адбываўся яе перамер, праверка правільнасці і

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

дакладнасці правядзення “старой” памеры. Выпраўляліся недахопы і памылкі папярэдняй памеры, уводзілася аднастайнасць яе правядзення на тэрыторыі ўсяго ВКЛ. У мясцовасцях, дзе папярэдняй рэарганізацыі не было, адбывалася вымярэнне зямлі на валокі: “а писати кгрунтъ, яко велики волоки вдложъ и поперокъ на которыхъ местъцахъ, и, естъли бы съ прычыны лихого кгрунъту наддавъки чынили, то мають пры томъ же описывати; а где могуть быти волоки прогоняные, мерыти въ тры поля, въ кожъдое поле 11 моркговъ, то естъ у волоку 33 моркги з наддавъкомъ” [5, с. 570]. Такім чынам, у якасці пазямельнай меры ўводзілася валока, якая складалася з 33-х моргаў (21,36 га), яна ж станавілася і стандартнай адзінкай павіннаснага абкладання сялянства.

Памера была толькі адным з інструментаў і адначасова састаўной часткай больш шырокіх пераўтварэнняў, якія праводзіліся як у сістэме кіравання дзяржаўнымі ўладаннямі, так і ў самой сістэме дзяржаўнага кіравання. Усяго ва “Уставе” утрымліваецца 49 артыкулаў і толькі два з іх, артыкул 20 (“О фолваркох у гумнех, о засеваню и ужатю и о даваню в отсоп, о евьях и о семи волоках”) і артыкул 29 (“О ревизорах, мерникох и о помере волочной и о селидбах и о отменах им, о затаенных кгрунтех”) можна напрамую аднесці да зямельнай рэформы. І то не да валочнай памеры, а ў асноўным да стварэння фальваркаў і арганізацыі іх дзейнасці.

“Устава на валокі” найперш вызначала асноўныя мэты аграрнай рэформы, прадугледжвала шэраг тэхнічных мерапрыемстваў (перамер зямлі), а таксам сацыяльных (змены ў становішчы феадальна залежнага насельніцтва), эканамічных (стварэнне новых гаспадарак, змены ў сістэме павіннаснага абкладання).

Важным момантам перабудовы эканомікі ВКЛ у канцы XV – першай палове XVI ст. стала паступовае ўсталяванне фальварачна-паншчыннай сістэмы. Гаворачы пра вялікую аграрную рэформу XVI ст. даследчыкі звычайна робяць акцэнт на словы гаспадара з “Уставы на валокі”: “Фольварки хочем мети абы везде становены, яко наболшы быти могуть, пры каждых

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

замках и дворех нашых, окром где бы кгрунты злые и непожиточные были...” [5, с. 555]. Часта з гэтага сказа рабілася выснова, што асноўным зместам аграрнай рэформы з’яўлялася ўвядзенне і замацаванне ў дзяржаве фальварачна-паншчыннай сістэмы гаспадарання. Не адмаўляючы таго, што валочная памера сапраўды стала адным з асноўных мерапрыемстваў, якія стымулявалі развіццё фальварка і паншчыны, на наш погляд, нельга сцвярджаць, што асновай аграрнай рэформы было толькі ўвядзенне феадальнай гаспадаркі, заснаванай на паншчыне. Больш таго, зробленыя намі падлікі паказваюць, што і адразу пасля правядзення аграрных мерапрыемстваў, і пазней паншчына і цяглы надзел (а, значыць, і фальварак) не занялі пераважаючага, вядучага месца ў эканоміцы краіны, а толькі сталі яшчэ адным сродкам, побач з чыншам і данінай, павелічэння прыбыткаў феадальных уласнікаў [6, с. 153, 156, 160].

Фальваркі ствараліся ў мясцовасцях з урадлівай глебай і зручных для вывазу збожжа за мяжу. Суадносіны велічыні фальварачнага і сялянскага ворыва складалі адпаведна “Уставы на валокі” прапорцыю 1:7, г. зн. на апрацоўку адной фальварачнай валокі адводзілася сем сялянскіх валок. Кожная сялянская сям’я атрымлівала ў якасці зямельнага надзелу валоку ці яе частку, з якой выконвала дакладна ўстаноўленыя павіннасці. Валочныя надзелы ў залежнасці ад павіннасцей сялян, пасаджаных на іх, дзяліліся на “цяглыя” і “асадныя” (чыншавыя).

Дарэчы, у артыкуле 15 “Уставы на валокі”, які папярэднічаў артыкулу 20 “Фольварки хочем мети…” ідзе размова пра чынш, які збіраўся як з цяглых, так і з асадных валок. Прычым асноўнай часткай рэнты, якая збіралася з асадных сялян была грашовая. Дзяржаве былі патрэбны грошы – іх павінны былі аддаць у розных прапорцыях за карыстанне зямлёй і чыншавыя і цяглыя сяляне. Добра вядома, што для таго, каб у селяніна з’явіліся грошы, ён павінен быў што-небудзь прадаць. Такім чынам, валочная памера з пераводам значнай колькасці сельскага насельніцтва на грашовую рэнту і замена ў гэтыя ж часы даніны ў гаспадарскіх Падняпроўскіх валасцях грашовым эквівалентам стымулявалі развіццё гандлю і таварна-грашовых адносін у ВКЛ.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Сельскае насельніцтва прадавала ў гарадах прадукцыю сваіх гаспадарак у асноўным для таго, каб атрымаць грошы на выплату чыншу зямельнаму ўласніку.

У выніку правядзення аграрнай рэформы гаспадарка ВКЛ паступова ўцягвалася ў кругазварот заходнееўрапейскага тавараабмена, развіваўся ўнутраны рынак, што, у сваю чаргу, аказвала ўплыў на агульны стан эканомікі краіны. Натуральна, што былі і мінусы ад значнага вывазу прадукцыі за мяжу – гэта некалькі тармазіла развіццё ўнутранага рынку. Такога, праўда, нельга сказать пра рэгіёны, дзе ў сялянскіх павіннасцях пераважала грашовая рэнта. А такіх рэгіёнаў было нямала і на працягу XVI – першай паловы XVII ст. іх колькасць пастаянна ўзрастала. Такім чынам, сялянства ўсё больш звязвалася з рынкам, іншай магчымасці знайсці сродкі для выплаты чыншу ў яго папросту не было.

Такім чынам, галоўнымі мерапрыемствамі аграрнай рэформы былі: дакладны ўлік сялянскай зямлі і ўвядзенне сістэмы павіннаснага абкладання сялянства прапарцыянальна колькасці і якасці зямлі; стварэнне і пашырэнне ў прыдатных месцах фальваркаў, як гаспадарак для вытворчасці збожжа на продаж; перамер зямлі на валокі і ў тых месцах, дзе фальваркі не ствараліся і перавод там сялян на грашовую рэнту (чынш).

Пад час правядзення памеры і раздачы валок сялянам з кожнай валокі вызначаліся дакладныя павіннасці ў залежнасці ад якасці глебы (добрая, сярэдняя, дрэнная і вельмі дрэнная). Асаблівых абмежаванняў і строгай рэгламентацыі ў надзяленні сялян зямлей не было. Землеўласнік ніколі не настойваў, каб сялянская гаспадарка ўзяла менавіта валоку зямлі. Як паказваюць крыніцы, цэлая валока не была абавязковым і нязменным зямельным надзелам, які павінен быў узяць селянін, а толькі стандартным, дакладна вымераным участкам зямлі, эталонам для прызначэння павіннасцей. Селянін мог узяць валоку ці яе частку. Калі ён мог апрацаваць надзел большы за адну валоку і адбыць з яго павіннасці і выплаціць падаткі і чынш, ніхто не пярэчыў таму, каб сялянская гаспадарка брала надзел большы за валоку.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Выраз пра надзяленне сялян зямлёй падчас памеры не зусім дакладна адпавядае тагачасным рэаліям. У крыніцах, як правіла, указвалася інфармацыя аб тым, што сяляне самі валокі “разбіралі” ці “прымалі”. Гэта таксама можа сведчыць пра тое, што сялян не прымушалі браць тую ці іншую колькасць зямлі, яны яе самі “прымалі” ў той колькасці, з якой маглі выплаціць абазначаную пазямельную рэнту і адбыць павіннасці.

Цяглыя сяляне былі абавязаны адбываць з валокі паншчыну два дні на тыдзень (98 дзён у год) і выходзіць на дадатковыя работы – гвалты, талокі. Акрамя таго, яны павінны былі плаціць чынш у памеры 6 грошаў з валокі вельмі дрэннай зямлі, 8 – з дрэннай, 12 – з сярэдняй і 21 грош з валокі добрай зямлі.

Асадныя сяляне павінны былі плаціць з кожнай валокі па 30 грошаў “асады”, адбываць на год 12 талок ці плаціць за іх 12 грошаў, а за гвалты даваць бочку жыта ці 10 грошаў.

Былі яшчэ дадатковыя павіннасці, аднолькавыя як з цяглых, так і з асадных валок: дзякла аўсом, сенам, гусямі, курамі, яйкамі і інш. Звыш названага, сельскае насельніцтва было абавязана хадзіць на варту, “даваць падводы” (перавозіць неабходныя для фальварка грузы), рамантаваць грэблі і масты і г.д.

Былая чэлядзь нявольная ператваралася ў агароднікаў, якія атрымлівалі па тры моргі зямлі. Яны былі абавязаны выконваць паншчыну адзін дзень на тыдзень.

Жанчыны хадзілі летам 6 дзён на талокі ў асноўным на праполку агародаў.

Сяляне-слугі і вясковая адміністрацыя атрымлівалі па 2 валокі, а рамеснікі, якія таксама адносіліся да катэгорыі сялян-слуг, – па адной. Звычайна гэтыя валокі былі вольнымі ад паншчыны.

Рэвізія пачатковай памеры на падставе “Уставы на валокі” была скончана ў 1568 г. На тэрыторыі Беларусі да гэтага часу памера ахапіла ўсе гаспадарскія ўладанні, якія знаходзіліся ў Ашмянскім, Брэсцкім, Браслаўскім, Ваўкавыскім, Віленскім, Гродзенскім, Лідскім, Менскім, Наваградскім, Пінскім і Слонімскім паветах.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Аграрная рэформа ў Беларусі мела, аднак, асаблівасці ў асобных рэгіёнах. Так, на ўсходзе ў першую чаргу з прычыны Лівонскай вайны (1558–1583 гг.) нават у гаспадарскіх Падняпроўскіх валасцях валочная памера ў сярэдзіне XVI ст. у поўным аб'ёме праведзена не была, а ў Паддзвінні нават не пачыналася. У дачыненні да ўсходніх ("рускіх") валасцей краіны вялікі князь выказаўся пра тое, каб у іх усё заставалася па-старому "да іншай навукі і пастанаўлення нашага" [5, с. 584].

Спроба распачать аграрныя пераўтварэнні ў гаспадарскіх уладаннях усходу Беларусі адбылася ў 1560–1561 гг. У гаспадарскіх уладаннях, размешчаных тут, была праведзена палавінчатая рэформа "параўнанне грунтаў і платаў". На жаль, дакументы, якія вызначалі мэты і рэгламентавалі характар аграрных пераўтварэнняў на ўсходзе Беларусі (як гэта зрабіла "Устава на валокі" для цэнтра і захаду), не захаваліся. Меркаваць аб ходзе аграрных мерапрыемстваў тут можна ў асноўным па інвентарных вопісах тых маёнткаў, дзе рэформа была праведзена. Добра вядома, што да 1561 г. закончылася "рэвізія" Бабруйскага, Гомельскага, Крычаўскага, Рэчыцкага, Прапойскага старостваў, Свіслацкай, Магілёўскай, Аршанскай, Дубровенскай валасцей і некаторых іншых уладанняў. Былі праведзены рэвізіі Дзісненскага (1579 г.) і Полацкага (1580 г.) замкаў з валасцямі [6, с. 53].

Асноўнай мэтай рэформы на ўсходзе Беларусі таксама было павелічэнне даходнасці гаспадарскіх уладанняў. У гарадах землі былі перамераны на валокі і ўстаноўлены выплаты з іх у адпаведнасці з "Уставай на валокі". У сельскіх валасцях было зроблена прыблізнае "параўнанне грунтаў" і прызначаны новыя выплаты і павіннасці. Ажыццяўлялася гэта шляхам увядзення ці замацавання "службы" – адзінкі вымярэння зямлі і абкладання павіннасцямі, якая была роўнай па плошчы 30 салянкам (бочкам высеву зерневых), што адпавядала 30 моргам, ці валоцы зямлі. Асноўнай павіннасцю са службы была грашовая рэнта, якая прызначалася ў залежнасці ад якасці глебы: з адной службы добрага грунту – 1 капа грошаў, сярэдняга – 50 грошаў, дрэннага – 40 грошаў. Дадаткова з кожнай службы збіралася па адной

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

бочцы жыта і адной бочцы аўса, браліся поплаты за сена, мёд і інш. Такім чынам, прадпрымалася спроба пераводу былых сялянданнікаў гаспадарскіх Падняпроўскіх валасцей у разрад сялянчыншавікоў, асноўным іх абавязкам павінна была стаць выплата грашовай рэнты. Гэта была менавіта спроба змены характара павіннаснага абкладання сялян гаспадарскіх Падняпроўскіх валасцей, таму што з розных прычын і надалей, па меншай меры да сярэдзіны XVIII ст., у сялянскіх павіннасцях насельніцтва Падняпроўскіх валасцей даніны цесна перапляталіся з чыншам. Завяршылася аграрная рэформа на ўсходзе Беларусі ў 30-40-я гады XVII ст., хаця ў некаторых дробных уладаннях зямля не была перамерана і ў XVIII ст.

Такім чынам, аграрная рэформа, распачатая па ініцыятыве правячых асоб, вялікай княгіні і каралевы Боны Сфорца і яе сына Жыгімонта Аўгуста, найперш у іх уласных і дзяржаўных уладаннях, у выніку дала пачатак перабудове ўсёй сельскай гаспадаркі ВКЛ. Увядзенне валокі як аднастайнай адзінкі пазямельнай меры і абкладання павіннасцямі, дакладны і зараней вызначаны памер апошніх сведчыў пра пераход эканомікі на новы ўзровень, спрыяў гаспадарчай стабільнасці дзяржавы. Па прыкладу гаспадара многія прыватныя і духоўныя феадалы сталі праводзіць “валочную памеру” у сваіх уладаннях, прымаючы нават свае адмысловыя Уставы. У выніку правядзення рэформы адбыліся радыкальныя змены ў эканамічным становішчы ВКЛ: былі створаны фальваркі як гаспадаркі па вытворчасці збожжа на продаж, усталявана аднастайная сістэма павіннаснага абкладання сялянства ў дзяржаўных уладаннях, пашырылася сфера таварна-грашовых адносін у краіне. Рэформа затармазіла дыферэнцыяцыю сялянства, стварыла прыкладна роўныя ўмовы сялянам для атрымання зямельнага надзела і адбывання павіннасцей з яго. Дакладна вызначаныя і зараней абвешчаныя павіннасці, дастаткова роўны павіннасны цяжар (2 дні паншчыны з валокі на тыдзень) ці дакладна вызначаная сума чыншу не выклікалі значных пярэчанняў падданства. Эканамічныя ідэі, закладзеныя ва “Уставе на валокі”, спрыялі ўмацаванню

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

эканомікі краіны ў цэлым і разам з тым давалі падставы для стварэння атмасферы гаспадарчай стабільнасці.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Голубеў, В. Ф. Рэформа кіравання дзяржаўнымі ўладаннямі ў ВКЛ у XVI ст. / В. Ф. Голубеў // Беларус. гіст. часоп. – 2023. – № 3. – С. 28–34.
2. Спиридонов, М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.) / М. Ф. Спиридонов. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 223 с.
3. Спірыдонаў, М. Ф. Аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. / М. Ф. Спірыдонаў // Гісторыя сялянства Беларусі: са старажытных часоў да 1996 г. : у 3 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: В. І. Мялешка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск , 1997. – Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. – С. 76–88.
4. Zespoł Archiwum Tyzenhauzów (AT) // Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD) w Warszawie. – Sign. D–1/ XIV.
5. Русская историческая библиотека издаваемая императорскою археографическою комиссиею // Литовская метрика. Отделы 1–2. – Юрьев , 1914. – Ч. 3 : Книги публичных дел, т. 1. – С. 539–628. – (Русская историческая библиотека ; т. 30).
6. Голубеў, В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі, XVI–XVIII стст. / В. Ф. Голубеў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 175 с.

References:

1. Golubeu V. F. Reform of state property management in the GDL in the 16th century. *Belaruski gistarychny chasopis* [Belarusian historical magazine], 2023, no. 3, pp. 28–34 (in Belarusian).
2. Spiridonov M. F. *Consolidation of the peasantry of Belarus (XV–XVI centuries*). Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1993. 223 p. (in Russian).
3. Spirydonau M. F. Agrarian reform of the middle of the 16th century. *History of the peasantry of Belarus: from ancient times to 1996. Vol. 1. History of the Belarusian peasantry from ancient times to 1861*. Minsk, 1997, pp. 76–88 (in Belarusian).
4. Zespoł Archiwum Tyzenhauzów (AT). *Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD*) [The Central Archives of Historical Records in Warsaw]. Sign. D–1/ XIV. (in Polish).
5. Russian historical library published by the Imperial Archaeographic Commission. *Lithuanian Metrics. Units 1–2. Part 3: Books of public affairs. Vol. 1*. Yuriev, 1914, pp. 539–628 (in Russian).
6. Golubeu V. F. *Peasant land ownership and land use in Belarus, XVI-XVIII centuries*. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1992. 175 p. (in Belarusian).

Дата паступлення артыкула 05.09.2023
Received 05.09.2023

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 94(476)+338.431(091) «15/17»
https://doi.org/10.5281/zenodo.8333760

А. Б. Доўнар

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ПА АГРАРНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ XVI–XVIII стст.

Анатацыя. У гістарыяграфіі даволі добра распрацаваны пытанні аграрнай гісторіі Беларусі XVI–XVIII стст. Разам с тым існуе шэраг праблем, якія патрабуюць далейшага вывучэння. У артыкуле паказана, што гэта адносіцца ў першую чаргу да становішча сельскага насельніцтва. Да такіх пытанняў можна аднесці функцыянаванне прыгоннага права і становішча асобных катэгорый сельскага насельніцтва Беларусі (напрыклад, панцырных, путных, замкавых баяр і інш.) у XVI–XVIII стст. Актуальным з'яўляецца вывучэнне метадаў кіравання сельскім насельніцтвам і іх рэформаванне на працягу XVI–XVIII стст. Чакаюць свайго вывучэння сацыяльныя працэсы ў асяроддзі сялянства («аземяніванне» канца XVII–XVIII ст.) і штодзённае жыццё сялянства XVI–XVIII стст.

Ключавыя словы: аграрная гісторыя, сялянства, катэгорыі насельніцтва, прыгоннае права, штодзённасць, XVI–XVIII стст., Беларусь.

Для цытавання. Доўнар, А. Б. Актуальныя пытанні даследаванняў па аграрнай гісторыі Беларусі XVI–XVIII стст. / А. Б. Доўнар // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси, Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории, Науч. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 25–35.

А. Б. Довнар

Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

АКТУАЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ ИССЛЕДОВАНИЙ ПО АГРАРНОЙ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ XVI–XVIII вв.

Анотация. В историографии достаточно хорошо разработаны вопросы аграрной истории Беларуси XVI–XVIII вв. Вместе с тем существует ряд проблем, требующих дальнейшего изучения. В статье указано, что это касается, в первую очередь, положения сельского населения. К значимым темам можно отнести изучение особенностей функционирования крепостного права и положения отдельных категорий сельского населения Беларуси (например, панцирных, путных и замковых бояр) на протяжении XVI–XVIII вв. Актуальным является исследование методов управления сельским населением

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

и их реформирование в этот период. Ждут своего рассмотрения социальные процессы в крестьянской среде («аземянивание» конца XVII–XVIII в.) и повседневная жизнь крестьянства XVI–XVIII вв.

Ключевые слова: аграрная история, крестьянство, категории населения, крепостное право, повседневность, XVI–XVIII вв., Беларусь.

Aliaksandr B. Dounar

Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

TOPICAL ISSUES OF RESEARCH ON THE AGRARIAN HISTORY OF BELARUS OF THE 16TH – 18TH CENTURIES

Abstract. The issues of agrarian history of Belarus of the 16th – 18th centuries are well enough developed in historiography. However, there are a number of problems that require further study. The article states that this applies primarily to the situation of the rural population. Significant topics include the study of the peculiarities of the functioning of serfdom and the situation of certain categories of the rural population of Belarus (e.g., pantsyrnye, putnye and zamkovye boyars) during the 16th–18th centuries. It is relevant to study the methods of rural population governance and their reformation during this period. The social processes in the peasant environment ("azemyanivanie" late 17th-18th centuries) and everyday life of the peasantry of the 16th – 18th centuries are waiting for consideration.

Keywords: agrarian history, peasantry, population categories, serfdom, everyday life, 16th – 18th centuries, Belarus.

For citation. Dounar A. B. Topical issues of research on the agrarian history of Belarus of the 16th – 18th centuries. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the II International scientific conference dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023. Minsk, 2023, pp. 25–35 (in Belarusian).

У гістарыяграфіі даволі добра распрацаваны пытанні аграрнай гісторіі Беларусі XVI–XVIII стст. У першую чаргу гэта датычыцца пытанняў стану і асноўных тэндэнцый развіцця сельскай гаспадаркі, забеспячэння зямлёй сялян, комплексаў павіннасцяў сельскага насельніцтва, сацыяльнай барацьбы, месца абшчыны ў жыцці сялян і т.д. [1, с. 102–410; 2, с. 24–218]. Зразумела, што, нягледзячы на вывучанасць, дадзеныя тэмы патрабуюць далейшай распрацоўкі. Разам с тым ёсць шэраг праблем аграрнай гісторыі Беларусі XVI–XVIII стст., якія неабходна даследаваць, як мы лічым, першапачаткова.

Да такіх тэм можна аднесці перш за ўсё розныя пытанні становішча сялянства. Напрыклад, праблему практычнага прымянення палажэнняў прыгоннага права і вольнага стану

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

насельніцтва «простага саслоўя». Як функцыянавала прыгоннае права пасля свайго юрыдычнага афармлення Статутам ВКЛ 1588 г., якія катэгорыя сельскага насельніцтва заставаліся вольнымі, ці існавала пэўная дынаміка ў стане прыгоннага/вольнага чалавека – вось далёка не поўны спіс пытанняў, на якія неабходна шукаць адказы. Напрыклад, панцырныя баяры ўяўлялі сабой катэгорыю асабіста вольнага сельскага насельніцтва, якая за ўладанне і карыстанне зямлёй несла ваенную службу ў мясцовых замках. Але ці захоўвалася дадзенае вольнае становішча пры перасяленні панцырнага баярына ў іншае ўладанне? Вядома, што ў 1630 г. панцырныя баяры Дзісенскага староства Якаў, Лявон, Павел, Марк, Ісак і Васька Арлы як «людзі вольныя свабодныя» «без ніякіх цяжкасцяў выйшлі дабраахвотна» з староства для перасялення ў маёнтак Куровічы Полацкага ваяводства шляхціча Яна Карбоўскага. Я. Карбоўскі прыняў іх і даў ім 3,5 службы зямлі. 7 жніўня 1630 г. ён выдаў баярам «дабравольны вячысты» ліст, што яны разам з іх семьямі з'яўляюцца вольнымі і маюць права выйсці з маёнтка Куровічы разам з усёй рухомай маёмасцю, нават калі пражывуць у маёнтку 10 і больш год, гэтым самым «засядзяць земскую даўнасць». Пры чым Я. Карбоўскі устанавіў памер зарукі ў памеры 600 коп грошаў з кампенсацыяй шкод і судовых затрат у выпадку стварэння перашкод самім Карбоўскім, ці яго нашчадкамі, уласнікамі маёнтка Куровіч, для згаданых Арлоў пры іх магчымым перасяленні ў іншае месца. У наступным дадзены «вольны ліст» неаднаразова прадстаўляўся ў XVII–XVIII стст. баярамі Арламі ў суды для засведчання іх вольнага становішча [3, спр. 37, арк. 592–595адв.; 4, s. 122–123]. Тлумачылася гэтая «воля» сацыяльным становішчам панцырнага баярына ці згаданым «вольным лістом» – пытанне застаецца, пакуль, нявырашаным.

Унікальны запіс мы знаходзім у актавай кнізе поразаўскага магістарта за 21 красавіка 1735 г. – гэта пісьмовы акт перадачы сябе вольным чалавекам, селянінам («працавітым») у падданства да шляхціча (г.зн. пераход з вольнага стана ў прыгонны практыкаваўся і ў XVIII ст.) У акце быў акрэслены час яго дзеяння – з моманту падпісання і на вечныя часы. Пісьмовы акт быў выкананы лацінаграфічным пісьмом на старабеларускай

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

мове з элементамі польскай мовы. Ён быў афармлены ў адпаведнасці з неабходнымі прававымі нормамі. Найперш, у ім падкрэслівалася, што ён быў «дабраахвотным і вячыстым». Згаданы дакумент быў напісаны ад імя вольнага чалавека Яські і яго жонкі Настуські Варанікоўны (яны былі непісьменнымі, таму свае подпісы засведчылі крыжыкамі) і прызначаўся для шляхціча, стольніка Аршанскага павета Яна Яльца і яго жонкі Канстанцыі з Тамашовічаў. Акт быў складзены ў Вярдовічах Ваўкавыскага павета 15 красавіка 1735 г. Ён быў падпісаны селянінам Яськам і яго жонкай. У якасці сведкаў выступалі канюшы і каптуровы суддзя Ваўкавыскага павета Аляксандр Бяляўскі, Ян Шчукоцкі і Стэфан Адахоўскі (сацыяльны статус апошніх двух у дакуменце не быў пазначаны). Пры чым Яська падкрэсліваў, што ён быў вольным: «nie bądąc nie do kogo blizszemi do zwierzchnosci nad nami y podanstwa» ні ў паноў Яльцоў, ні ў варшаўскага чэшніка Паўла Млоцкага. Апошні згадваўся ў сувязі з тым, што трымаў у залогу маёнтак Вярдовічы і запісаў Яську ў якасці падданага ў інвентар дадзенага маёнтка[1]. Яська на гэты конт пісаў: «Не маючы на мне ніякай улады і вечнага права, а я як вольны чалавек такому запісу не буду падначалены, (так як) ніякага на сябе старога ані новага права, ані абавязку нікому іншаму не даваў, не зашкодзіў і ў ніякае падданства не запісваўся». «А цяпер ўжо хочачы мець сабе аднаго пана» Яська з жонкай, з будучымі дзецьмі, з маёмасцю падаліcся ў вечнае падданства да вышэйзгаданых паноў Яльцоў, як удзячнасць падданых за тое, што пан не пакараў іх за правінасць. Яська з жонкаў бралі на сябе абавязак быць вернымі толькі сваім панам і не шукаць лепшай долі ў іншых шляхцічаў, ад якіх яны «выракаліся». Калі б іншыя шляхцічы крыўдзілі б Яську і яго жонку, то апошнія абавязваліся шукаць паратунку і справядлівасці толькі ў сваіх «вячыстых» паноў Яльцоў, г. зн. падаліся пад поўную іх уладу [5, арк. 122–126; 6, с. 120–123]. Дадзены акт дае прыклад афармлення акта пераходу ў падданства вольнага чалавека і акрэслівае розныя нюансы такога пераходу.

[1] Цікава, што запіс селяніна ў інвентары маёнтка расцэньвалася ім, вольным чалавекам, як запіс у прыгонныя.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Актуальным з’яўляецца вывучэнне пытання становішча асобных катэгорый сялянства Беларусі XVI–XVIII стст. (у папярэдняй гістарыяграфіі разглядалася становішча даннікаў, цяглых, чыншавых сялян, сялян-слуг, выбранцаў Слуцкага княства і інш.), але ёсць шэраг нявырашаных пытанняў, напрыклад, становішча розных катэгорый баяраў і інш.). Так, геаграфічна рэгіён размяшчэння такой катэгорыі сельскага насельніцтва як панцырных баяр дзяржаўных уладанняў абмяжоўваўся паўночным усходам ВКЛ (Полацкае, Віцебскае, Мсціслаўскае ваяводствы, г.зн. тэрыторыямі, якія з’яўляліся пагранічнымі). Баяры панцырныя і путныя Полаччыны канцэнтраваліся ў Полацкай эканоміі. Яны мелі свае прывілеі, якія гарантавалі ім іх правы, найперш права ўласнасці на зямлю – г. зн. дадзеная катэгорыя сельскага насельніцтва была «ўпрывілеяванай». Так, 12 снежня 1746 г. баяры панцырныя і путныя Полацкага ваяводства праз сваіх упаўнаважаных Лявона Грышманоўскага, Сямёна Пузына, Емельяна Філіпёнка і Стэфана Зарэмба, атрымалі пацвярджэнне ад караля польскага вялікага князя літоўскага Аўгуста III сваіх прывілеяў 15 ліпеня 1593 г., 19 красавіка 1670 г., 15 снежня 1681, 3 сакавіка 1720 г. і інш. А 19 жніўня 1766 г. кароль польскі вялікі князь літоўскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі па просьбе баяр панцырных і путных Полацкага ваяводства Лявона Грышманоўскага, Яна Пузыны, Андрэя Шэршня, Стэфана Зарэмба, Томаша Філіпёнка пацвердзіў вышэйзгаданы прывілей [4, s. 123–124]. Дадзеныя прывілеі гарантавалі баярам панцырным і путным Полаччыны спадчыннае валоданне землямі «Непаратавічы» і «Ісцец» з умовай нясення панцырнай службы на Полацкі замак. Неабходна адзначыць, што дадзеныя землі, нягледзячы на спадчыннае валодданне панцырных і путных баяр, з’яўляліся дзяржаўнымі ўладаннямі і падпадалі пад юрыздыкцыю Полацкай эканоміі. Акрамя прывілеяў на свае землі баяры панцырныя і путныя Полацкага ваяводства мелі пацвярджэнне полацкага агульназемскага прывілея ад 21 лютага 1547 г. і 1580 г., якое яны атрымалі на сваё імя 25 чэрвеня 1593 г. ад караля польскага вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы. Дадзенае пацвярджэнне баяры панцырныя і путныя Полацкага ваяводства актыкавалі ў розных судах:

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

– 12 мая 1663 г. – у гродскім судзе Віцебскага ваяводства;

– 24 жніўня 1752 г. – у актавыя кнігі віленскага магістрата;

– 13 мая 1763 г. – у гродскім судзе Полацкага ваяводства. У апошнім выпадку копію вышэйзгаданага пацвярджэння ў гродскі суд прадставіў згаданы раней Лявон Грышманоўскі [4, s. 124; 7, с. 221].

Наяўнасць ў баяр панцырных і путных Полацкага ваяводства прывілеяў, і іх пастаяннае пацвярджэнне сведчыць пра высокі сацыяльны статус і прававую культуру дадзенай катэгорыі сельскага насельніцтва. Разам з тым можна канстатаваць, што баяры панцырныя і путныя Полацкага ваяводства з'яўляліся асобнай катэгорыі сялянскага саслоўя і не былі прадстаўнікамі шляхецкага стана. Так, у дакументах яны ні разу не называліся шляхтай. Разам з тым панцырныя і путныя баяры Полацкай эканоміі ў XVIII ст. свае акты куплі-прадажы зямель складалі пісьмова, завяралі сваімі бортнымі клейнамі – «клейнавымі подпісамі», засведчывалі іх на сходах сваіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак-войтаўстваў, а часта актыкавалі ў актавыя кнігі полацкага магістрата і гродскага суда Полацкага ваяводства [4].

Цікавасць выклікае становішча замкавых баяр ў другой палове XVI – XVIII ст. Замкавыя баяры ў Беларусі канцэнтраваліся ў Рэчыцкім павеце. Так у 1726 г. замкавыя баяры жылі ў 16 асобных вёсках Чачэрскага староства. У першай трэці XVIII ст. яны выконвалі цэлы шэраг ваенных і гаспадарчых павіннасцяў, сярод якіх была і павіннасць штогод ахоўваць грамадскі парадак у Чачэрску падчас кірмашоў, з'яўляючыся пешымі са зброя па адным чалавеку з вёскі [7, с. 31–40; 8, с. 36–40]. Але ў другой палове XVIII ст. замкавыя баяры знікаюць з інвентароў дзяржаўных уладанняў. Як склаўся іх лёс? Для адказу на дадзенае пытанне неабходна прыцягненне новых крыніц.

Актуальным з'яўляецца вывучэнне метадаў кіравання сельскім насельніцтвам і іх рэформаванне на працягу XVI–XVIII стст. Метады кіравання не былі аднолькавымі, яны відазмяняліся, рэфармаваліся [9; 10]. Вось напрыклад, 14 красавіка 1795 г. у Ружанах Ф. Сапега падпісаў інструкцыю па ўвядзенню сельскіх

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

судоў у сваіх уладаннях – «Увядзенне сельскіх судоў». Ідэя ўстанаўлення сельскіх судоў узнікла ў сувязі з тым, што складальнік інструкцыі рэальна ацэньваў існуючую сітуацыю ў сялянскім асяроддзі. Аўтар інструкцыі лічыў, што колькі б панская адміністрацыя не клапацілася аб паляпшэнні становішча сялян, яны не любяць панскі двор, бо нянавісць да яго «ўсмоктваюць яшчэ з мацярынскім малаком». Як і ўлічвалася, што «селянін целам і душой роўны кожнаму чалавеку, якога Бог узнагародзіў розумам і даў яму магчымасць усведамляць, што ёсць добрае, і што ёсць дрэннае». У сувязі з усім сказаным, «клапоцячыся пра здароўе і дабрабыт сялян», землеўласнік, як «пан і дабрадзей для сваіх падданых» уводзіў сельскія суды, якія павінны складацца з сялян і разглядаць сялянскія справы. Узначальваць такі суд павінен быў вясковы войт, які выбіраўся сялянамі і зацвярджаўся панскай адміністрацыяй («такім чынам ён стане першым гаспадаром і першым суддзёй той грамады, у якой з'яўляецца войтам»). У дапамогу войту ў кожнай вёсцы планавалася выбіраць па 2 гаспадары «богабаязных і вартых даверу, якія б разам з войтам судзілі розныя справы, што ўзнікалі б у іх вёсках». Месцам правядзення суда вызначаўся дом войта, а на судовых пасяджэннях павінны былі прысутнічаць як абвінаваўцы, так і абвінавачаныя. Неабходна адзначыць, што палажэнні вышэйадзначанай інструкцыі па ўвядзенню сельскіх судоў былі рэалізаваныя ў жыццё. Пра гэта сведчыць тое, што ў дакуменце канца XVIII ст. згадваецца адзін з сялянскіх суддзяў Зэльвенскага маёнтка Юф Мацеевіч, які быў абраны суддзёй у 1795 г. і быў ім на працягу як мінімум двух з паловай гадоў [11; 12, с. 162–165, 197–199].

Чакаюць свайго вывучэння разнастайныя сацыяльныя працэсы ў асяроддзі сялянства. Так, у канцы XVII–XVIII ст. пэўныя катэгорыі сельскага насельніцтва (чыншавікі, баяры) сталі пераводзіцца на зямянскія павіннасці [13, с. 69–236 ; 14, с. 51–206] – гэты працэс атрымаў назву «аземяніванне». Але гэта з'ява да цяперашняга часу не вывучана.

Цікавым накірункам даследавання з'яўляецца вывучэнне штодзённага жыцця сялянства XVI–XVIII стст. Нажаль, факталагічнага матэрыялу па дадзенай праблематыцы адносна няшмат, што робіць дадзены накірунак яшчэ больш актуальным.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

28 студзеня 1728 г. на сходзе панцырных і путных баяр Азярышчанскага войтаўства Полацкай эканоміі Селівон Фёдаравіч Цюця і яго жонка Параска Ісакаўна засведчылі, што яны з'яўляюцца старымі, а так як не мелі сына, а толькі дочку Тэрэзію, то «прынялі да дачкі … за свайго сына баярына Юр. Логінава» і запісалі яму як зяцю «вечнасцю» сваю частку Якаўцовай службы, якая ім дасталася па падзела паміж іх «братамі», таксама палову шасціны і палову асьмухі Заазерскай службы. За тое Ю. Логінаў павінен быў цесця і цёшчу «да смерці шанаваць, слухаць …, а пасля смерці дастойна па-хрысціянску пахаваць». Акрамя таго агаварвалася, што калі б з'явіўся іх пляменнік Цімох Асіповіч, то яму як дзедзічу неабходна было б аддаць полову асьмухі службы на Захарчыне і полову шасціны службы на Глухораве (другая полова шасціны на Глухораве павінна была застацца Ю. Логінаву, зяцю баяр Цюцяў). Прычым Цюці агаварылі, што згаданы пляменнік забраў у іх «вялікі кацёл для брагі» з усім начыннем коштам 13 расійскіх рублей. Таму зяць павінен быў перадаць Ц. Асіповічу яго землі толькі пасля таго як ён аддасць палову сумы за кацёл. Дадзенае рашэнне было занатавана пісьмова. 16 студзеня 1733 г. гэты дакумент быў прадстаўлены Ю. Логінавым на сходзе Азярышчанскага войтаўства і зацверджаны скарбавым дваранінам ВКЛ Антонам Кульвінскім, які пысутнічаў на сходзе. А 29 красавіка 1752 г. Ю. Логінаў актыкаваў дадзены дакумент у актавыя кнігі гродскага суда Полацкага ваяводства [3, спр. 41, арк. 309–310 адв.; 4, s. 131].

Неабходна адзначыць, што сходы баярскіх войтаўстваў Полацкай эканоміі мелі і пэўныя судовыя паўнамоцтвы, асабліва, калі на іх прысутнічалі прадстаўнікі адміністрацыі Полацкай эканоміі. Так, 12 жніўня 1753 г. абозны Рэчыцкага павета, эканом Полацкай эканоміі Лявон Юр. Кушка на сходзе баяр Непаратаўскага войтаўства разглядаў справу Лявона Жолуда. Справа заключалася ў тым, што стрыечны дзядзька апошняга Цімофей Мікалаевіч Жолуд, запісаў свайму пляменіку Лявону свае землі за тое, што той выплаціў яго даўгі ў 19 талераў. Пасля Цімох захацеў вярнуць свае землі – надумаўшы атруціць Лявона разам с яго сям'ёй, для чаго ўжо набыў атруту. Але «войт з мужамі, даведаўшыся пра дадзены намер», ў Цімоха атруту

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

адабралі і прадставілі яго разам з доказамі на суд полацкага эканома. Апошні «за такое правапарушэнне» узяў ад Ціхана прысягу, што ён ніякіх шкодных учынкаў больш рабіць не будзе супраць свайго пляменніка Лявона і будзе жыць мірна з ім у адной хаце. А калі Цімох дапусціў хаця бы якія пагрозы, то «павінен быў падлягаць пакаранню кáта». У сваю чаргу Лявон Жолуд абавязваўся жыць мірна з Цімохам да яго смерці, пад віной у 50 коп грошаў [3, спр. 44, арк. 221–224 адв.; 4, s. 132]. Аналагічныя факты штодзённага жыцця (сямейнага жыцця, шлюбу, сялянскай культуры, пісьменнасці, маргінальных паводзінах (п'янства, злачыннасці, бадзяжніцтва) у асяроддзі сялянства: і г. д.) напрацягу XVI–XVIII стст. неабходна вывучаць не толькі адносна панцырных баяр, а і іншых катэгорыях сельскага насельніцтва…

Такім чынам, вывучэнне аграрнай гісторіі Беларусі XVI–XVIII стст. і ў цяперашні час з'яўляецца актуальным і перспектыўным накірункам далейшых даследаванняў з вялікім патэнцыялам навізны як факталагачнага плана, так і тэматычных накірункаў.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Гісторыя сялянства Беларусі: са старажытных часоў да 1996 г. : у 3 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; пад рэд. В. І. Мялешкі [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. – 431 с.
2. Иоффе, Э. Г. Из истории белорусской деревни: советская историография социально-экономического развития белорусской деревни середины XVII – первой половины XIX в. / Э. Г. Иоффе. – Минск : Ураджай, 1990. – 345 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 37, 41, 44.
4. Dounar, A. Położenie społeczne bojarów putnych i pancernych województwa połockiego w Wielkim Księstwie Litewskim w świetle źródeł z połowy XVIII wieku / A. Dounar // Chłopi na ziemiach dawnej Rzeczypospolitej do czasów uwłaszczenia / red. D. Michaluk. – Ciechanowiec ; Warszawa, 2019. – S. 119–133.
5. НГАБ. – Ф. 1808. Воп. 1. Спр. 1.
6. Доўнар, А. Б. Даныя пра жыхароў Свіслацкага краю ў актавых кнігах Поразава (першая палова XVIII ст.) / А. Б. Доўнар // Беларусь, Свіслацкі край і Эдвард Вайніловіч: (да 765-годдзя г. Свіслач : матэрыялы навук.-практ. канф., Свіслач, 13–14 жн. 2021 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2021. – С. 108–123.
7. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в центральном архиве в

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Витебске и изданные под редакцией архивариуса сего архива Созонова : [в 32 вып.]. – Витебск, 1871–1906. – Вып. 28. – 1900. – XVI, 356, 167, V с.

8. Доўнар, А. Б. Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. / А. Б. Доўнар. – Мінск : Беларус. навука, 2007. –193 с.

9. Доўнар, А. Б. Устава Чачэрскай і Рагачоўскай воласцей 1629 года / А. Б. Доўнар // Рэчыцкі край: да 150-годдзя з дня нараджэння Мітрафана Доўнара-Запольскага : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі, Гомел. дзярж. ун-т ; уклад.: А. Б. Доўнар, В. М. Лебедзева ; навук. рэд. В. Ф. Голубеў. – Мінск, 2019. – С. 226–245.

10.Кітурка, І. Ф. Дзяржаўныя ўладанні на землях Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.: палітыка гаспадарчага аднаўлення і развіцця / І. Ф. Кітурка ; навук. рэд. В. Ф. Голубеў. – Гродна : ГрДУ, 2003. – 172 с.

11.Голубеў, В. Новыя дакументы пра арганізацыю сацыяльна-эканамічнага жыцця ва ўладаннях князёў Сапег у канцы XVIII ст. (стварэнне сельскіх судоў і рэгламентацыя абавязкаў сялянскіх дзесятнікаў) / В. Голубеў, А. Доўнар // Соціально-економічні трансформації в Україні та Білорусі в XVI–XVIII ст.: фактор реформ / Нац. акад. наук України, Ін-т історії України. – Київ, 2016. – С. 207–230.

12.Доўнар, А. Б. Рэформа кіравання горада і вёскі канца XVIII ст. у прыватных уладаннях (на прыкладзе маёнткаў Францішка Сапегі ў Заходняй Беларусі) / А. Б. Доўнар // Studia Historica Europae Orientalis. – 2017. – Вып. 10. – С. 149–200.

13.Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII – XVIII вв. Владение Сморгонь / Гл. арх. упр. при СМ БССР, Ин-т истории АН БССР, Центр. гос. ист. арх. БССР в г. Минске ; [сост.: П. Г. Козловский, Е. П. Шлоссберг, Е. Л. Бравер ; редкол.: Е. М. Корпачев и др.]. – Минск : Наука и техника, 1977. – 254 с.

14.Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII – XVIII вв. Владение Тимковичи / Гл. арх. упр. при СМ БССР, Ин-т истории АН БССР, Центр. гос. ист. архив БССР в г. Минске ; сост. П. Г. Козловский. – Минск : Наука и техника, 1982. – 216 с.

References:

1. Myaleshka V. I. (ed.) *History of the peasantry of Belarus: from ancient times to 1996. Vol. 1. History of the Belarusian peasantry from ancient times to 1861*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 1997. 431 p. (in Belarusian).

2. Ioffe E. G. *From the history of the Belarusian village: Soviet historiography of the social and economic development of the Belarusian village of the middle of the 17th – the first half of the 19th centur*y. Minsk, Uradzhai Publ., 1990. 345 p. (in Russian).

3. *National Historical Archive of Belarus (NGAB)*. F. 1734. Op. 1. Ref. 37, 41, 44. (in Belarusian).

4. Dounar A. Położenie społeczne bojarów putnych i pancernych województwa połockiego w Wielkim Księstwie Litewskim w świetle źródeł z połowy XVIII wieku. *Chłopi na ziemiach dawnej Rzeczypospolitej do czasów uwłaszczenia* [The social position of the putny and armoured boyars of the Polotsk voivodeship in the Grand Duchy of Lithuania in the light of sources from the mid-18th century.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Peasants on the lands of the former Republic of Poland until the enfranchisement]. Ciechanowiec, Warzszawa, 2019, pp. 119–133 (in Polish).

5. *National Historical Archives of Belarus*. F. 1808. Op. 1. Ref. 1. (in Belarusian).

6. Dounar A. B. Data on the inhabitants of the Svislatsky region in the act books of Porazov (the first half of the 18th century). *Belarus', Svislatski krai i Edvard Vainilovich: (da 765-goddzya g. Svislach: materyyaly navukova-praktychnai kanferentsyi, Svislach, 13–14 zhniunya 2021 g*. [Belarus, the Svislatsky region and Edward Vainilovich: (to the 765th anniversary of the city of Svislach: papers of the scientific-practical conference, Svislach, August 13–14, 2021]. Minsk, 2021, pp. 108–123 (in Belarusian).

7. *Historical and legal materials extracted from the act books of the Vitebsk and Mogilev provinces, kept in the central archive in Vitebsk and published under the editorship of the archivist of this archive Sozonov. Issue 28.* Vitebsk, 1900. XVI, 356, 167, V p. (in Russian).

8. Dounar A. B. *Peasants-servants of Belarus in the second half of the 16th – mid-18th centuries*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2007. 193 p. (in Belarusian).

9. Dounar A. B. Statute of the Chachersk and Rohachov volosts of 1629. *Rechytski krai: da 150-goddzya z dnya naradzhennya Mitrafana Doŭnara-Zapol'skaga: zbornik navukovykh artykulau* [Rechitsa region: to the 150th anniversary of the birth of Mitrofan Downar-Zapolsky: collection of scientific articles]. Minsk, 2019, pp. 226–245 (in Belarusian).

10. Kiturka I. F. *State possessions on the lands of Belarus in the second half of the 17th and 18th centuries: the policy of economic recovery and development*. Grodno, Grodno State University, 2003. 172 p. (in Belarusian).

11. Golubeu V., Dounar A. The new documents about the organization of social and economic life in dukes Sapieha possessions in the late 18th century (creation of the rural courts system and regulation of the rural foremen duties). *Socio-economic transformation in Ukraine and Belarus in the 16th–18th centuries: factor reforms*. Kyiv, 2016, pp. 207–230 (in Belarusian).

12. Dounar A. B. Reform of town and village management at the end of the 18th century in private possessions (on the example of Franziska Sapieha's estates in Western Belarus). *Studia Historica Europae Orientalis*, 2017, iss. 10, pp. 149–200 (in Belarusian).

13. Kozlovskii P. G., Shlossberg E. P., Braver E. L. (comp.). *Inventory of magnate estates of Belarus in the 17th – 18th centuries. The Smorgon property*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1977. 254 p. (in Russian).

14. Kozlovskii P. G. (comp.). *Inventory of magnate estates of Belarus in the 17th – 18th centuries. The Timkovici property*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1982. 216 p. (in Russian).

Дата паступлення артыкула 31.08.2023
Received 31.08.2023

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 340.1:619(091)(476)
https://doi.org/10.5281/zenodo.8333768

І. А. Саракавік[1], К. А. Мардачова[2]

[1]Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск, Беларусь
[2]Мінская абласная ветэрынарная станцыя, Мінск, Беларусь

АСНОЎНЫЯ АКТЫ ВЕТЭРЫНАРНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ. 1919–1941 гг.

Анатацыя. Артыкул прысвечаны асноўным актам ветэрынарнага заканадаўства на тэрыторыі Беларусі, пачынаючы з Сярэднявечча, іх правапрымяненне ў наступныя стагоддзі аказала істотны ўплыў на стан жывёлагадоўлі і пасадзейнічала яе развіццю на сучасным гістарычным этапе.

Ключавыя словы: жывёлагадоўля, Ветэрынарны статут, заканадаўства, Савецкі Саюз, Беларусь.

Для цытавання. Саракавік, І. А. Асноўныя акты ветэрынарнага заканадаўства на тэрыторыі Беларусі. 1919–1941 гг. / І. А. Саракавік, К. А. Мардачова // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси, Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории, Науч. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. А. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 36–50.

И. А. Сороковик[1], К. А. Мардачева[2]

[1]Академия управления при Президенте Республики Беларусь, Минск, Беларусь
[2]Минская областная ветеринарная станция, Минск, Беларусь

ОСНОВНЫЕ АКТЫ ВЕТЕРИНАРНОГО ЗАКОНОДАТЕЛЬСТВА НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ. 1919–1941 гг.

Аннотация. Статья посвящена основным актам ветеринарного законодательства на территории Беларуси, начиная со средних веков, их применение в последующие столетия оказало существенное влияние на состояние животноводства и способствовало его развитию на современном историческом этапе.

Ключевые слова: животноводство, Ветеринарный устав, законодательство, Советский Союз, Беларусь.

Ivan A. Sorokovik[1], Ksenia A. Mardacheva[2]

[1]Academy of Management under the President of the Republic of Belarus, Minsk, Belarus
[2]Minsk Regional Veterinary Station, Minsk, Belarus

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

THE MAIN ACTS OF VETERINARY LEGISLATION ON THE TERRITORY OF BELARUS 1919–1941

Abstract. The article is devoted to the main acts of veterinary legislation on the territory of Belarus, since the Middle Ages, their enforcement in subsequent centuries had a significant impact on the state of animal husbandry and contributed to its development at the present historical stage.

Keywords: animal husbandry, veterinary regulations, legislation, Soviet Union, Belarus.

For citation. Sorokovik I. A., Mardacheva K. A. The main acts of veterinary legislation on the territory of Belarus 1919–1941. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the II International scientific conference dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023. Minsk, 2023, pp. 36–50 (in Belarusian).

Адзначаная тэма не знайшла шырокага даследавання сярод вучоных Беларусі. На сёння маюцца ў асноўным некалькі артыкулаў дацэнта кафедры экалагічнага і аграрнага права БДУ, кандыдата юрыдычных навук, дацэнта І.П. Кузьміч*. Яны, як правіла, адносяцца да перыяда дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У іх у асноўным разглядаюцца пытанні прававога рэгулявання ў сферы жывёлагадоўлі, аднак практычна

*Кузьмич И. П. Правовое обеспечение развития животноводства в контексте возможной систематизации норм аграрного законодательства [Электронный ресурс] // Теоретико-правовые аспекты развития аграрного законодательства Республики Беларусь в области растениеводства и животноводства / И. П. Кузьмич [и др.]. – Минск, 2017.– URL: chrome-extension://efaidnbmnnnibpcajpcglclefindmkaj/https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/257018/1/Kuzmich.pdf. – (Дата доступа 06.07.2023); Кузьмич И. П. Становление и перспективы развития законодательства Республики Беларусь в области растениеводства и животноводства // Право в современном белорусском обществе : сб. науч. тр. / Нац. центр законодательства и правовых исслед. Респ. Беларусь, Ин-т правовых исслед. ; редкол.: Карпович Н.А. [и др.]. – Минск, 2018. – Вып. 13. – С. 557–565; Кузьмич И. П. О проблемах систематизации аграрно-правовых норм в области животноводства // Стратегия и тактика развития производственно-хозяйственных систем : материалы IX междунар. науч.-практ. конф., Гомель, 26–27 нояб. 2015 г. / Гомел. гос. техн. ун-т ; под общ. ред. В. В. Кириенко. – Гомель, 2015. – С. 251–253; Кузьмич И. П. Проблемы правового обеспечения развития животноводства в Республике Беларусь // Информационно-правовая поддержка охраны окружающей среды и устойчивого развития : по материалам круглых столов / редкол.: С. А. Балашенко (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2014. – С. 77–79.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

не закранаюцца акты ветэрынарнага заканадаўства. Гэту тэму закрануў доктар ветэрынарных навук А.А. Русіновіч у невялікім артыкуле «О совершенствовании национального ветеринарного законодательства и структуры ветеринарной службы» [1].

Больш актыўна гэта тэма распрацоўваецца расійскімі вучонымі. Даследуюць яны розныя аспекты. Да прыкладу, І.В. Бандарчук, А.І. Галіева, Д.Б. Гарохава і некаторыя іншыя даследчыкі займаюцца пытаннямі рэфармавання рэгіянальнага заканадаўства аб абыходжанні з жывёлай*, Я.В Гаршкова, В.Н. Мінчанка, Л.В. Ткачова – нармаваннем працы ветэрынарных работнікаў прамысловых жывёлагадоўчых комплексаў [2], Я.А. Карабкова, Л.А. Сабельнікава – аб расійскім і сусветным вопыце аховы правоў жывёл [3].

З невялікага агляду вынікае, што абазначаная тэма ў нашай дзяржаве пакуль значыма навукоўцамі не распрацавана. А патрэба ў гэтым маецца, так як грамадскія адносіны не стаяць на месцы, яны ўскладняюцца, удасканальваюцца, патрабуюць адпаведнага рэагавання як даследчыкаў, так і законатворцаў. Кожны прыняты заканадаўчы акт патрабуе пэўнага аналізу: наколькі ён адпавядае запатрабаванням часу, накіроўвае дзяржаўныя органы і грамадкасць на яго выкананне, як адбываецца законапрымяненне. Нарэшце, і самае галоўнае, наколькі ён аказаўся эфектыўным.

Актуальнасць тэмы выклікана некалькімі фактарамі. Вядома, што з ранняга Сярэднявечча і прыкладна па XVII ст. уключна на тэрыторыі сучаснай Беларусі актыўна развівалася земляробства і галоўнай культурай былі зернавыя. Заканадаўчы акт Вялікага Княства Літоўскага «Устава на валокі» 1557 г. прадугледжваў, у тым ліку, далейшае развіццё гэтага кірунку сельскай гаспадаркі. Заходняя Еўропа ў той час была зацікаўлена ў пастаўках

*Бондарчук И. В., Руденко А. В., Хоменко А. С. Реформирование регионального законодательства об обращении с животными в свете формирующейся судебной практики // Вестн. МГПУ. Сер.: Юрид. науки. – 2021. – № 1 (41). – С. 62–70; Галиева, А. И. Проблемы законодательного регулирования ответственного обращения с животными // ACADEMY. – 2020. – № 6 (57). – С. 75–78; Горохова Д. Б. Проблемы качества и эффективности применения Закона об ответственном обращении с животными // Журн. рос. права. – 2020. – № 4. – С. 153–171.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

зернавых, чым і займаліся многія дзяржавы Цэнтральна-Усходняй Еўропы, у тым ліку і ВКЛ. Аднак у наступныя стагоддзі становішча рэзка змянілася: у Заходнюю Еўропу хлынуў паток збожжавых з Канады, ЗША, Аргентыны і нават з Аўстраліі. Ён быў намнога таннейшым, чым з ВКЛ. Беларуска-Літоўская дзяржава не вытрымала канкурэнцыі і вымушана была пераарыентаваць экспартную складаючую сельскай гаспадаркі. Ёй з'явілася мяса-малочная галіна, якая стала вядучай не толькі ў XIX, але і ў XX – пачатку XXI ст. Менавіта з гэтага часу пачалі больш актыўна развівацца розныя галіны жывёлагадоўлі. Для атрымання жывёлагадоўчай прадукцыі разводзілі буйную рагатую жывёлу, свіней, коней, авечак, коз, буйвалаў, трусоў, а таксама розныя віды птушак — курэй, качак, гусей, індычак. Не апошняе месца займалі даўнія віды дзейнасці: пчалярства, рыбная гаспадарка і інш. Другімі словамі, жывёлагадоўля выкарыстоўвалася і выкарыстоўваецца як дзеля задавальнення растучых патрэб насельніцтва ў прадуктах мяса-малочнага харчавання, так і як важнейшая экспартная прадукцыя сельскай гаспадаркі.

Не меншае значэнне з ранняга Сярэднявечча і практычна на сярэдзіну XX ст. мела развіццё конегадоўлі. З аднаго боку, як цяглавай сілы ў сельскай гаспадарцы. З другога боку, як сродка дзейнасці аднаго з галоўных родаў войска таго часу – конніцы. Асабліва гэта праявілася ў Грунвальдскай бітве, Першай сусветнай і грамадзянскай войнах.

Усё гэта патрабавала асаблівага догляду жывёл, а калі патрэбна, то і лячэння, бо хатнія жывёлы, як і людзі, хварэюць. Ім неабходна кваліфікаваная дапамога. Зразумела, што першапачаткова гэта была прымітыўная народная ветэрынарыя. У якасці лекаў выкарыстоўвалі ў большасці выпадкаў тыя ж сродкі, што і для людзей – лекавыя травы, попел і інш. Павелічэнне колькасці жывёл, якія знаходзіліся ў статку, пры захворванні нават адной з іх, можа прывесці, і часам прыводзіла, да эпідэміі ўсіх іх. А гэта вялікія страты не толькі для гаспадара гэтых жывёл, а для і грамадства, дзяржавы.

Фарміраванне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян суправаджалася развіццём звычаёвага права. На сёння не існуе звестак, як рэгуляваліся грамадскія адносіны ў сферы лячэння

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

жывёл. З пісаным правам з'яўляюцца ўскосныя звесткі аб адносінах грамадства і дзяржавы да хатніх жывёл, асабліва да буйнай рагатай жывёлы, коней і інш. У Судзебніку Казіміра 1468 г. маюцца нормы, якія прадугледжвалі пакаранне смерцю не толькі за кваліфікаваныя віды злачынства або паўторныя злачынствы, але і за крадзёж каровы (арт. 13), каня (арт.15) [4, с. 29]. Яны сведчаць аб тым, наколькі нават у той час дзяржава беражліва адносілася да гэтых жывёл, якія ў многім былі асновай для жыццядзейнасці.

Развіццё медыцыны прывяло і да паступовага ўдасканалення ветэрынарыі, а разам з гэтым і да прававога рэгулявання гэтай дзейнасці. Найбольш яскравым актам у гэтай сферы грамадскіх адносін на землях Беларусі стаў «Устав врачебный» Расійскай імперыі, які быў выдадзены ў 1905 г. Да гэтага часу у дзяржаве склалася дакладная сістэма кіравання ветэрынарнай дзейнасцю. Яна ўключала ў сябе Ветэрынарнае ўпраўленне, ветэрынарны камітэт, ветэрынарныя пункты, а таксама ветэрынары акруговыя, павятовыя, участковыя, звышштатныя, земскія і гарадскія, пунктовыя і вольнапрактыкуючыя [5, с. 655].

У адпаведнасці з арт. 1 Статута медычнага Галоўнае ўпраўленне грамадзянскімі медыцынскай і ветэрынарнай часткамі належала Міністэрству унутраных спраў. У ім меліся Ветэрынарнае ўпраўленне і ветэрынарны камітэт. Згодна арт. 2 для загадвання ветэрынарнай часткай у губернях у складзе губернскіх праўленняў састаялі губернскія ветэрынарныя інспектары. Мясцовае медыцынскае ўпраўленне па паветах і гарадах складалі павятовыя і гарадскія лекары і павятовыя ветэрынары. У паветах, гарадах і паселішчах меліся сельскія (участковыя) лекары і іншыя медыцынскія, а таксама ветэрынарныя работнікі.

Другая кніга Статута медычнага складалася з Статута медыцынскай паліцыі, у якім пяты раздзел быў прысвечаны ветэрынарна-паліцэйскім мерам па папярэджанню і спыненню заразных і павальных хвароб на жывёл і па абясшкоджванню сырых прадуктаў жывёлагадоўлі [5, с. 335–362]. Колькасць ветэрынарных лекараў у паветах вызначалася мясцовымі ўмовамі, а таксама ўстановамі, якія мелі сродкі на ўтрыманне гэтых лекараў (арт.1110). Арт. 1111 прапісваў прававы статус

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

ветэрынарнага лекара, асабліва яго абавязкі. Аб усіх выпадках захворванняў жывёл ён абавязаны быў аператыўна інфармаваць мясцовага ветэрынарнага інспектара, а таксама павятовае і губернскае кіраўніцтва. У той жа час пры з'яўленні заразных і павальных хваробаў на жывёл меры па іх спыненні ўскладаліся на ветэрынарных лекараў (арт.1112).

Арт. 1123 прапісваў, што праекты абавязковых пастаноў па ветэрынарнай часткі для мясцовых жыхароў складаюцца губернскімі распарадчымі камітэтамі, а дзе яны адсутнічалі, губернскімі праўленнямі або замяняючымі іх ўстановамі. Яны прымаліся ў выпадках з'яўлення на жывёлах з мясцовай скаціны заразных і павальных хваробаў; іх смерці; забою жывёл з мясцовай скаціны або прымянення да іх прышчэпак; пакідання іх ва ўладальніка пад ветэрынарна-паліцэйскім наглядам; абясшкоджвання сырых прадуктаў жывёлагадоўлі пры апрацоўцы іх на фабрыках і заводах, а роўна пасля паступлення ў продаж на ежу і ў іншых прадугледжаных 13 выпадках. Арт. 1126-1148 главы чацвёртай прадугледжвалі меры па папярэджанні і спыненні заразных і павальных хвароб, надзяляючы ветэрынарныя ўстановы, мясцовыя органы ўлады і кіравання, а таксама міністра ўнутраных спраў адмысловымі на тое паўнамоцтвамі і правамі.

У той жа час у главе шостай (арт. 1166–1175) прадугледжвалася «ўзнагароджанне ўладальнікаў за забітых жывёл і знішчаныя прадметы». Яно вылічалася з сум адсоткавага збору з гуртавой жывёлы. Аднак скотапрамыслоўцы мелі такое права толькі тады, «калі яны аплацілі належачыя ім гурты ці партыі устаноўленым працэнтным зборам» (арт.1168). Такое становішча павінна было быць прызнаным ветэрынарным лекарам (арт. 1169). Заканадавец прадугледзеў і сродкі для пакрыцця расходаў па выкананні мер барацьбы з заразнымі і павальнымі хваробамі на жывёл і наогул па ўтрыманню ветэрынарнай часткі [5, с. 358–362].

Важнае значэнне для развіцця ветэрынарнага заканадаўства меў Закон Расійскай імперыі «Аб некаторых мерапрыемствах па паляпшэнні пастаноўкі сельска-ветэрынарнай часткі ў Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Курляндскай губернях» ад 3 ліпеня 1914 г. Ён прадугледжваў паляпшэнне матэрыяльнага і

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

прафесійнага становішча работнікаў ветэрынарнай службы, павышэнне прафесіяналізму работнікаў ветэрынарнай службы гэтых губерняў. У прыватнасці, Віленскаму, Ковенскаму, Гродзенскаму і Курляндскаму губернатарам было прадастаўлена права камандзіраваць участковых (павятовых) ветэрынарных фельчараў у ветэрынарна-фельчарскія школы пры ветэрынарных інстытутах для ўдасканалення на тэрмін да двух гадоў кожнага з захаваннем утрымання і з выдачай з земскіх сродкаў дапамогі па сто дваццаць пяць рублёў у год кожнаму. Выдатак на гэтую патрэбу вызначаўся ў каштарысным парадку, аднак з той умовай, каб камандзіраваныя ветэрынарныя фельчары абавязваліся праслужыць у той губерні, з якой яны былі камандзіраваны, на пасадзе ўчастковага (павятовага) ветэрынарнага фельчара па паўтара года за кожны год камандзіроўкі [5, с. 607–608].

Значыць, яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Расіі былі прыняты нарматыўныя прававыя акты, дзеючыя і на тэрыторыі сучаснай Беларусі, якія дакладна вызначылі арганізацыйна-прававыя асновы ветэрынарнай службы ў дзяржаве і прававы статус гэтых інстытутаў, а таксама супрацоўнікаў ветэрынарнай службы.

Савецкая ўлада, улічваючы вялікую ролю і значнасць у барацьбе з контррэвалюцыяй такога роду войск Чырвонай Арміі, як кавалерыйскія часткі, у красавіку 1918 г. утварыла Галоўны ваенна-ветэрынарны камітэт. У гэтым жа месяцы Наркамат унутраных спраў РСФСР прыняў рашэнне аб арганізацыі Галоўнага ветэрынарнага савета пры НКУС і ветэрынарных пададдзелаў пры губернскіх і абласных саветах. У маі 1918 г. было створана Ваенна-ветэрынарнае ўпраўленне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі [6, с. 98–99]. Гэтыя акты сведчаць аб тым, што савецкая ўлада надавала асабліва важнае значэнне ветэрынарнаму заканадаўству, а праз яго і ветэрынарыі. Яе арганізацыйныя органы, як бачна, былі ўтвораны менавіта пры найбольш уплывовых для дзяржавы наркаматах, што падкрэсліва іх асаблівую значымасць. Важна і тое, што ў гэтай галіне грамадскіх адносін, у адрозненне ад многіх іншых, савецкая ўлада не адмаўлялася ад накопленага імперскага ветэрынарнага заканадаўства, а прыстасавала яго да сваіх патрэбаў. Пра гэта сведчаць і наступныя нарматыўныя прававыя акты.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

У траўні 1918 г. НКУС РСФСР прыняў пастанову «Аб арганізацыі Цэнтральнага ветэрынарнага аддзела». Апошні стаў складацца з шасці пададдзелаў: эпізаатычнага і лабараторнага; ветэрынарна-санітарнага, лячэбнага; заатэхнічнага і статыстычнага; экспарту і імпарту; культурна-асветнага; агульнага (бухгалтэрыя, казначэйства, гаспадарчая частка і інфармацыйнае бюро). Важнае значэнне для развіцця ветэрынарыі меў дэкрэт СНК РСФСР № 586 «Аб племянной жывёлагадоўлі» ад 13 ліпеня 1918 г. Ён усталёўваў, што ўсе «племянныя жывёлы непрацоўных гаспадарак» аб'яўляліся без усялякага выкупу агульнанародным здабыткам РСФСР і паступаюць у распараджэнне Наркамата земляробства [7, с. 685].

У сувязі з тым, што ветэрынарная справа знаходзілася ў кіраванні розных ведамастваў СНК РСФСР 8 кастрычніка 1919 г. прыняў Дэкрэт «Аб аб'яднанні кіравання ветэрынарнай часткай у Рэспубліцы». У адпаведнасці з ім «уся ветэрынарная справа ў РСФСР, акрамя ветэрынарнай часткі Чырвонай Арміі, засяроджваецца ў падпарадкаванні Народнага камісарыята земляробства» (арт.1). Арт. 2-4 рэгламентавалі адносіны ў сферы перадачы ветэрынарнай часткі і органаў кіравання. Інстытут эксперыментальнай ветэрынарыі, іншыя ветэрынарныя навукова-практычныя ўстановы з усёй маёмасцю, персаналам і крэдытамі як у цэнтры, так і на месцах, перадаваліся з НКУС у Наркамат земляробства.

Асаблівую ўвагу маладая савецкая рэспубліка надавала ўліку, падрыхтоўцы і прыцягненню да працы па спецыяльнасці ветэрынарных работнікаў. Гэтаму спрыялі дэкрэты Савецкай улады: 9 чэрвеня 1920 г. «Аб парадку прыцягнення розных спецыялістаў, якія маюць, акрамя таго, званне лекара і фельчара, да работ па спецыяльнасці», 23 чэрвеня 1920 г. – «Аб паскораным выпуску ветэрынарных лекараў» і іншыя.

Адначасова дырэктыўныя органы РСФСР выдалі шэраг дэкрэтаў і пастаноў, накіраваных на барацьбу з эпізаатыямі. Да прыкладу, 18 студзеня 1919 г. – «Аб мабілізацыі ветэрынарнага персаналу на барацьбу з эпізаатыямі»; 24 сакавіка 1919 г. – «Аб прадастаўленні ветэрынарным урачам і фельчарам адтэрміноўкі ад прызыву на ваенную службу»; 11 верасня 1919 г. – «Аб мерах спынення і папярэджання чумы рагатай жывёлы ў межах

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

РСФСР»; 28 студзеня 1920 г. – «Аб мерах барацьбы з чумой рагатай жывёлы»; 12 мая 1920 г. – «Аб заснаванні пасады ўпаўнаважаных па барацьбе з чумой рагатай жывёлы»; 9 чэрвеня 1920 г. – «Аб вызваленні ветэрынарных урачоў і фельчараў ад працоўных мабілізацый» і іншыя.

Аднак рэальнае становішча спраў на месцах, у тым ліку і ў ССРБ, прымушала савецкае кіраўніцтва дзейнічаць больш энергічна. Справа ў тым, што многія рэгіёны Расіі, Украіны, Беларусі падвергліся распаўсюджванню павальных заразных хвароб, чумы буйнай рагатай жывёлы, каросты коней, а таксама захваральнасцю жывёл яшчурам, сібірскай язвай, сухотамі і іншымі хваробамі. У сувязі з гэтым Старшыня СНК РСФСР У.І. Ленін 28 красавіка 1921 г. накіраваў ліст «Усім губвыканкамам». Ён пісаў, у прыватнасці, што чума рагатай жывёлы, сап, запаленне лёгкіх і іншыя эпізаатыі, з'яўляючыся вялікім дзяржаўным бедствам, руйнуюць сялянскія і фермерскія гаспадаркі, вядуць да паглыблення эканамічнага крызісу, а таксама разбураюць усякі вытворчы сельскагаспадарчы план.

Таму ўсім губвыканкамам ставілася задача звярнуць асаблівую ўвагу на супрацьчумныя мерапрыемствы, а таксама прапісвалася аказваць належную ўвагу ветэрынарнаму персаналу і ўстановам, якія вядуць барацьбу з чумой рагатай жывёлы і іншымі хваробамі. Меркавалася, што ў выніку выканання шэрагу мерапрыемстваў у хуткім часе эпізаатычная сітуацыя наладзіцца, як і сама сялянская гаспадарка, разрадзіцца сельскагаспадарчы крызіс, павялічыцца пасяўная плошча, што ў канчатковым выніку прывядзе да паляпшэння эканамічнага становішча ў краіне [8, с. 101].

Вялікае значэнне для станаўлення савецкай ветэрынарнай службы і фарміравання ветэрынарнага заканадаўства мела прыняцце спецыяльнай пастановы Савета працы і абароны РСФСР «Аб кіраванні ваеннай ветэрынарыяй» ад 2 жніўня 1921 г. У ёй былі сфармуляваны задачы, абавязкі і ўзаемаадносіны грамадзянскай і ваеннай ветэрынарных службаў. У выніку гэтыя службы былі аб'яднаны, і знаходзіліся ў падпарадкаванні Наркамзема РСФРС па лістапад 1923 г. [9].

Аднак найбольш важнай падзеяй для развіцця сферы ветэрынарыі стаў Ветэрынарны статут РСФСР, прыняты ў УЦВК

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

3 лістапада 1923 г. пад назвай «Аб увядзенні ў дзеянне ветэрынарнага Статута РСФСР». Меў ён чатыры часткі: асноўныя задачы дзяржаўнай ветэрынарыі і абавязкі Наркамата земляробства па іх ажыццяўленню (арт. 2); аб барацьбе з заразнымі і павальнымі хваробамі жывёлаў (арт. 3–54); аб ветэрынарна-санітарным наглядзе (арт. 55–74); аб органах кіравання, правах і абавязках уладальнікаў жывёл і службовых асобаў (арт. 75–112) [10].

На падставе гэтага нарматыўнага прававога акта быў прыняты Ветэрынарны статут БССР 1924 г. [11]. Ён практычна цалкам паўтараў расійскі закон і па сваёй сутнасці стаў асноўным ветэрынарным законам. У ім былі выкладзены асноўныя задачы дзяржаўнай ветэрынарнай службы, яе арганізацыйна-прававая структура ў цэнтры і на месцах, прававы статус работнікаў, а таксама ўладальнікаў жывёл. У прыватнасці, у арт. 1 ставіліся задачы: а) арганізацыя і правядзенне мерапрыемстваў па папярэджанні і спыненні заразных і павальных хвароб хатніх жывёл; б) арганізацыя ветэрынарна-санітарнага нагляду; б) арганізацыя ветэрынарна-лячэбнай дапамогі насельніцтву; г) ахова народнага здароўя ў дачыненні да заразных і паразітарных хваробаў, агульных чалавеку і жывёлам. Для іх вырашэння Наркамат земляробства павінен быў распрацаваць агульны план усіх ветэрынарных мерапрыемстваў і ажыццяўляць кіраўніцтва па іх выкананню.

Асаблівую ўвагу Статут надаваў пытанням барацьбы з заразнымі і павальнымі хваробамі хатніх жывёл і птушак, прадугледжваючы агульныя меры па іх папярэджанні і спыненні, пачынаючы з ўстанаўлення пастаяннага ветэрынарна-санітарнага нагляду і аканчваючы канкрэтнымі мерамі (арт. 12–14). Пры гэтым усталёўваліся асаблівыя меры пры асобных заразных хваробах, падкрэсліваючы іх небяспеку для грамадства і дзяржавы. Гэта чума рагатай жывёлы, павальнае запаленне лёгкіх (перыпнеўманія) буйной рагатай жывёлы, яшчур, сухоты, шаленства, гемарагічныя сэптыцэміі (павальная гарачка і грудная зараза хатніх і дзікіх жывёл), павальны выкідак буйной рагатай жывёлы і коней, кароста, воспа авечак, сап, эпізаатычнай лімфангіт (афрыканскі сап) коней, мыт, случная хвароба коней,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

рожа і чума свіней, халера птушак, чума курэй, дыфтэрыт птушак (арт. 15–54).

Не меншае значэнне надавалася ветэрынарна-санітарнаму нагляду за перамяшчэннем жывёл і сырых жывёльных прадуктаў (арт. 55–63), за бойнямі, мяснымі і іншымі жывёльнымі прадуктамі (арт. 64–74). Статут утрымліваў таксама мерапрыемствы па папярэджанні заносу дадзеных хваробаў з-за мяжы. Для БССР адной з самых актуальных праблем з'яўлялася малалікасць кадраў для ветэрынарыі, пасколькі не мелася спецыяльных ветэрынарных навучальных устаноў. Толькі ў 1922 г. у Мінску быў адкрыты ветэрынарны тэхнікум з 3-гадовым тэрмінам навучання. 4 лістапада 1924 г. пры падтрымцы Наркамзема РСФСР Прэзідыум ЦВК БССР прыняў пастанову аб адкрыцці Віцебскага ветэрынарнага інстытута, адкрыццё якога адбылося 8 лістапада 1924 г., а ў 1928 г. адбыўся першы выпуск 80 маладых ветэрынарных лекараў. За 10 гадоў было падрыхтавана 543 ветурачы і 64 заатэхнікі [12].

На тэрыторыі рэспублікі ў гэтыя гады ў значных памерах працягвалі развівацца многія заразныя хваробы жывёл (сібірская язва, сап, шаленства, чума і інш.). Аналагічныя праблемы меліся і ў іншых саюзных рэспубліках. Улічваючы гэта, 14 мая 1927 г. пастановай СНК СССР быў утвораны пры Савеце працы і абароны СССР Камітэт па ветэрынарных справах. На яго было ўскладзена кіраўніцтва ўсёй ветэрынарнай справай і каардынаванне ветэрынарнай дзейнасці. Так быў створаны першы саюзны ўрадавы орган па кіраўніцтву ветэрынарнай справай, які праводзіў свае мерапрыемствы праз наркаматы земляробства саюзных рэспублік.

3 снежня 1928 г. СПА СССР выдаў пастанову «Аб стане ветэрынарнай справы СССР і мерапрыемствах па яго паляпшэнні». Важнасць яго заключалася ў тым, што яно меркавала павялічыць асігнаванні ветэрынарным установам з утварэннем спецыяльных фондаў, арганізаваць у ветэрынарных установах навукова-даследчую працу, узмацніць будаўніцтва ветэрынарных аб'ектаў [13].

Кардынальнае значэнне для развіцця ветэрынарыі мела прыняцце Ветэрынарнага Статута Саюза ССР ад 27.10.1936 г. ЦВК СССР за № 78 і СНК СССР за № 1922. ЦВК саюзных

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

рэспублік абавязаны былі ў сувязі з гэтым адмяніць свае ветэрынарныя кодэксы і статуты і прывесці сваё заканадаўства ў адпаведнасць з Ветэрынарным статутам СССР (арт.3).

Непасрэдна ў Ветэрынарным статуце СССР змяшчалася 37 арт. Арт. 2–15 прадугледжвалі меры папярэджання і ліквідацыі заразных хвароб жывёл і птушак. У прыватнасці, упершыню кіраўнікі гаспадарак, якія маюць жывёл і птушак, абавязаны былі ў мэтах папярэджання заразных захворванняў жывёл (у тым ліку пушных звяроў, якіх разводзяць у няволі), праводзіць два разы на год дэзінфекцыю памяшканняў для жывёл і птушак; уводзіць каранцін на зноў паступаючых у гаспадарку жывёл у адпаведнасці з патрабаваннямі Наркамата земляробства СССР; ізаляваць хворых жывёл ад здаровых; праводзіць ахоўныя пасіўныя і актыўныя прышчэпкі і дыягнастычныя даследаванні, прымаць меры барацьбы са шкоднікамі жывёл і знішчаць грызуноў, тэрмінова паведамляць ветэрынарнага лекара або фельчара пры наяўнасці прыкмет заразных захворванняў жывёл.

Важна і тое, што права ўводзіць каранцін у гаспадарцы, населеным пункце або мясцовасці атрымалі мясцовыя органы ўлады, пачынаючы з раённага выканаўчага камітэта (арт. 7). Ветэрынарны статут у артыкулах 10–12 усталёўваў пры якіх хваробах жывёл і птушак яны падлягалі забою, а трупы – знішчэнню.

Асаблівае значэнне Статут надаваў ветэрынарна-санітарным мерапрыемствам у месцах нарыхтовак і забою жывёл і птушак, гандлю імі і ў месцах выхаду сыравіны жывёльнага паходжання (арт. 16–22), так як яны былі цесна звязаны з аховай здароўя і жыцця людзей. Статут рэгуляваў і ветэрынарна-санітарныя мерапрыемствы пры перавозцы, увозе і вывазе жывёл, птушак, а таксама туш і сыравіны жывёльнага паходжання па чыгуначных і водных шляхах зносін (арт.23-28).

Арт. 29–37 прапісвалі арганізацыю ветэрынарнай справы ў Савецкім Саюзе, якая ўскладалася на Наркамат земляробства СССР і яго мясцовыя органы, а таксама адзначалі іх прававы статус. Значыць, Ветэрынарны статут Саюза ССР 1936 г. падвёў своеасаблівыя вынікі нарматворчасці ў сферы ветэрынарыі за мінулыя гады савецкай улады, а таксама адлюстраваў істотныя

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

змены, якія адбыліся ў сельскай гаспадарцы на аснове калектывізацыі і развіцця індустрыялізацыі.

Выкладзены матэрыял дазваляе заключыць, што асноўнымі актамі ў разгляданмы перыяд, якія аказалі істотны ўплыў на развіццй жывёлагадоўлі ў Беларусі стаў Ветэрынарны статут БССР 1924 г., увабраўшы ў сябе важнейшыя нормы і палажэнні аналагічнага статута РСФСР 1923 г. У ім, у сваю чаргу, хоць ён зыходзіў з класавых пазіцый, назіралася пераемнасць прававых нормаў дакастрычніцкага часу. Больш важнае значэнне меў Ветэрынарны статут СССР 1936 г. Ён падвёў вынік папярэдняга савецкага заканадаўства ў гэтай сферы грамадскіх адносін. Значымасць яго ў многім заключалася ў тым, што ён арганізацыйна цэнтралізаваў дзейнасць ветэрынарнай службы дзяржавы, садзейнічаў укладанню пэўных фінансава-матэрыяльных сродкаў для патрэб ветэрынарнай дзейнасці, падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў, у тым ліку навуковых, для яе, чаго саюзныя рэспублікі, у тым ліку і БССР, гэтым у поўнай меры не распалагалі. Дзейнічаў ён да пачатку 1950-х гг.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Русинович, А. А. О совершенствовании национального ветеринарного законодательства и структуры ветеринарной службы / А. А. Русинович // Белорус. сел. хоз-во. – 2008. – № 8. – С. 47–48.
2. Горшкова, Е. В. Нормирование труда ветеринарных работников промышленных животноводческих комплексов / Е. В. Горшкова, В. Н. Минченко, Л. В. Ткачева // Вестн. Брян. гос. с.-х. акад. – 2015. – № 2-2. – С. 36–38.
Аннотация. В истории высшего сельскохозяйственного образования на белорусских землях в период вхождения их в состав Российской империи наблюдались как позитивные тенденции, характеризующие динамичное развитие образовательных учреждений, так и события, которые имели катастрофические последствия. Созданная в первой половине XIX века инфраструктура по подготовке высококвалифицированных кадров для сельскохозяйственной отрасли экономики была ликвидирована в середине столетия, а проекты по воссозданию в крае в начале XX века высшего учебного заведения сельскохозяйственного профиля столкнулись с проблемами организационного, финансового, логистического и геополитического характера.

Ключевые слова: Виленский университет, Горыгорецкий сельскохозяйственный институт, проект Высших сельскохозяйственных курсов в Вильно, проект сельскохозяйственного института в Минске.

Для цитирования. Шимукович, С. Ф. К вопросу о высшем сельскохозяйственном образовании на белорусских землях в XIX – начале XX в. / С. Ф. Шимукович // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси, Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории, Науч. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 75–84.

С. Ф. Шымуковіч

Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт, Мінск, Беларусь

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

ДА ПЫТАННЯ АБ ВЫШЭЙШАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XIX – НАЧАТКУ XX ст.

Анатацыя. У гісторыі вышэйшай сельскагаспадарчай адукацыі на беларускіх землях у перыяд уваходжання іх у склад Расійскай імперыі назіраліся як пазітыўныя тэндэнцыі, якія характарызуюць дынамічнае развіццё адукацыйных устаноў, так і падзеі, якія мелі катастрафічныя наступствы. Створаная ў першай палове XIX стагоддзя інфраструктура па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў для сельскагаспадарчай галіны эканомікі была ліквідаваная ў сярэдзіне стагоддзя, а праекты па ўзнаўленні ў краі ў пачатку XX стагоддзя вышэйшай навучальнай установы сельскагаспадарчага профіля сутыкнуліся з праблемамі арганізацыйнага, фінансавага, лагістычнага і геапалітычнага характару.

Ключавыя словы: Віленскі ўніверсітэт, Горыгорацкі сельскагаспадарчы інстытут, праект Вышэйшых сельскагаспадарчых курсаў у Вільні, праект сельскагаспадарчага інстытута ў Мінску.

Sergey F. Shymukovich

Belarusian State Economic University, Minsk, Belarus

ON THE ISSUE OF HIGHER AGRICULTURAL EDUCATION IN THE BELARUSIAN LANDS IN THE 19TH – EARLY 20TH CENTURIES

Abstract. In the history of higher agricultural education in the Belarusian lands during the period of their entry into the Russian Empire, both positive trends were observed that characterize the dynamic development of educational institutions, as well as events that had catastrophic consequences. The infrastructure for the training of highly qualified personnel for the agricultural sector of the economy, created in the first half of the 19th century, was liquidated in the middle of the century, and projects to recreate an agricultural higher educational institution in the region at the beginning of the 20th century faced organizational, financial, logistical and geopolitical problems.

Keywords: Vilna University, Gorygoretski Agricultural Institute, project of the Higher Agricultural Courses in Vilna, project of the Agricultural Institute in Minsk

For citation. Shymukovich S. F. On the issue of higher agricultural education in the belarusian lands in the 19th – early 20th centuries. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the II International scientific conference dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023. Minsk, 2023, pp. 75–84 (in Russian).

С самого начала XIX в. значимым центром подготовки квалифицированных кадров для сельского хозяйства стал Виленский университет, основанный в 1803 г. на базе Главной

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Литовской школы. На кафедрах медицинского и физико-математического отделений студентам преподавались науки, которые имели практическое значение для понимания специфики сельскохозяйственного производства, при этом особо стоит отметить масштабную подготовку ветеринаров на медицинском факультете. Со временем у руководства университета сложилось понимание в необходимости учреждения специальной кафедры сельского хозяйства и более практикоориентированного подхода к подготовке кадров для сельского хозяйства. Так, в 1822 г., после двухлетней стажировки в европейских научных центрах кафедру сельского хозяйства в Вильно занял уроженец Слуцкого уезда, выпускник университета М.Н. Очаповский, а в 1827 г. при университете был образован агрономический институт, директором которого стал профессор Фричинский [1, с. 121]. Университет в Вильно постепенно превращался в значимый центр подготовки кадров для всех отраслей сельского хозяйства.

Закрытие Виленского университета в 1832 г. нанесло серьезный удар по перспективам развития сельскохозяйственного образования в регионе. Хотя до 1842 г. в Виленской медико-хирургической академии продолжали готовить ветеринаров, выпускники академии заложили основы высшего ветеринарного образования в Харькове и Санкт-Петербурге, однако в Вильно подготовка кадров прекратилась [2, с. 206–208]. В свою очередь, профессор М.Н. Очаповский вынужден был уехать в 1834 г. Польшу, в Маримонтский институт сельского хозяйства и лесоводства, который он возглавил в 1835 г. [3].

В 1848 г. в Горках Могилевской губернии на базе земледельческой школы (создана в 1836 г.) был образован Горыгорецкий земледельческий институт – специализированное высшее учебное заведение. Необходимость его организации была вызвана объективными факторами – в регионе имелось значительное число государственных имений, для управление которыми требовались грамотные кадры, поскольку аренда имений частными лицами показала свою неэффективность и вызвала рост недовольства крестьян.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Четырехлетняя программа обучения в институте была насыщена специальными дисциплинами, при этом на гуманитарные науки отводилось до ¼ учебного плана [4, с. 363]. Институт динамично развивался, прирастая лабораторной базой и опытными хозяйствами, при нем учреждались дополнительные курсы [5, с. 41]. Слабой стороной учебного заведения была его удаленность от крупных университетских городов, неразвитая транспортная инфраструктура и слабое финансовое положение. Участие части студентов и некоторых преподавателей в восстании 1863 г. стало формальным поводом для перевода института в Петербург и объединения его с Лесным институтом [6, л. 17–20].

Во второй половине XIX в. правительством рассматривались ряд проектов по созданию высшего учебного заведения в Северо-Западном крае. Так, виленский генерал-губернатор М.Н. Муравьев был сторонником организации высшего учебного заведения в крае в формате «русского» университета либо православной духовной академии, чуть позднее министр просвещения Д.А. Толстой предлагал открыть университет в Полоцке. Однако данные проекты не были реализованы в первую очередь из-за недостатка средств, хотя и политические причины также сыграли определенную негативную роль [7, с. 116–120].

В 1887 г. могилевский губернатор А.С. Дембовецкий в рамках реализации обширной программы развития губернии поднял вопрос о восстановлении статуса высшего учебного заведения для земледельческих училищ в Горках. В качестве эксперта в этом вопросе выступил директор училищ Н.М. Арнольд, который отметил, что: «…при восстановлении высших учебных заведений в Горках некоторую выгоду представляют оставшиеся от закрытого заведения здания и сельскохозяйственные учреждения, но многие из зданий необходимо ремонтировать почти заново, на организацию сельскохозяйственных учреждений тоже необходимо потратить значительные суммы <…>. Главное неудобство, еще терпимое для среднего учебного заведения и невыносимые для высшего – это захолустное положение Горок и отдаленность их от железнодорожных путей никоем образом устроено быть не

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

может…» [8, л. 1–1об]. Более того, Н.М. Арнольд высказал сомнение в востребованности выпускников института: «…появляются известия что молодые люди окончив заведения, не находя места в частных имениях и сельскохозяйственных технических заведениях вынуждены пристраиваться к специальностям не имеющим общего с сельским хозяйством» [8, л. 2].

Последний аргумент эксперта представляется более чем спорным в условиях ускоренной модернизации экономики империи и особенно ее сельскохозяйственного сектора, что позволяет судить, как минимум, об отсутствии у Н.М. Арнольда актуальной информации при подготовке своего отзыва. Но можно согласиться с экспертом в том, что востребованность образованных кадров на белорусских землях в те годы была невелика. Серьезным препятствием на пути развития агрономических и ветеринарных знаний и практик стало отсутствие в западных губерниях земств. Именно земства в центральных и южных российских губерниях были заинтересованной стороной в деле подготовки высококвалифицированных кадров (агрономов и ветеринаров) для местного сельского хозяйства и выступали заказчиками на выполнение научных изысканий в деле усовершенствования агрономических технологий.

В конце XIX – начале XX в. динамичное развитие экономики края остро обозначило потребность в высшем учебном заведении (университете с обязательным сельскохозяйственным отделением), а наибольшую заинтересованность в высшем профессиональном образовании демонстрировали представители местной буржуазии – новой социальной группы, занявшей свое место среди локальных элит. В начале XX в. их прагматичный взгляд на цели и задачи высшей школы, связанный с развитием экономики, возобладал над идеологическими мечтами старой «польской» шляхты о продвижении польского политического и культурного влияния в крае. Вопрос об открытии вуза в крае поднимался в прессе, дебатировался на сельскохозяйственных съездах и в органах местного самоуправления. Значительную часть расходов предполагалось покрыть из местных фондов, в

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

том числе из пожертвований от городов, земств, предлагались разные варианты самообложения, благотворительные взносы и другие варианты финансирования. Подробно о таких проектах, инициированных городскими думами Вильно, Минска, Витебска и Могилева, в своих статьях писали Н.М. Моторова и Е.И. Головач [9; 10].

Однако теперь уже правительство не спешило с одобрением проекта учреждения университета в белорусских губерниях, поскольку российские университеты в целом, вне зависимости от места своего расположения, стали мощными центрами антиправительственных выступлений и рассчитывать на продвижение российского влияния в регионе через университет было сложно. Правительство опасалось, как восстановления «польского» влияния в местных вузах, так и революционной активности студентов и оппозиционного настроения профессоров. В этой связи в начале XX в. в целом в империи практика открытия государственных вузов была сведена к минимуму. Зато активно открывались частные вузы и к 1914 г. по числу таких учреждений и количеству обучающихся в них студентов они обошли государственные [11, с. 44–51, 63–65].

В Западном крае один из нереализованных проектов частного вуза как раз предполагал открытие высшего сельскохозяйственного учебного заведения. Так, 9 июня 1911 г. в статье-передовице белорусской газеты «Наша Нива» ее издатель А. Власов написал о необходимости открыть в Вильно *частные* Высшие курсы сельского хозяйства. Он предполагал, что на это нужное учреждение деньги дадут все землевладельцы края, а также земства шести северо-западных губерний, а городская дума Вильно может выделить землю под фольварк, поскольку: «…без хорошей сельскохозяйственной науки теперь ничего не сделаешь. Земледелие такая хитрая вещь, что с каждым годом делается все хитрей, люди все придумывают лучшие и лучшие способы и нет, чтобы этому научиться» [12, с. 289]. Расчет автора статьи оказался ошибочным, богатые землевладельцы, а они были носителями польской гражданско-политической идентичности, не поддержали «белорусскую» инициативу.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Интересы активистов белорусского движения имели не только прагматический характер, связанный с экономическим развитием региона и ростом его культурного потенциала в целом. Высшее учебное заведение в формате именно сельскохозяйственного института должно было форсировать формирование белорусской народной интеллигенции, источник которой белорусские активисты видели именно в лице белорусского крестьянина, получившего высшее образование. Недорогое, часто за казенный или земский счет, обучение в сельскохозяйственном институте давало не только практические знания крестьянину, необходимые для развития его хозяйства, но способствовало формированию критически важной для продвижения белорусского национального проекта социальной группы. Тогда как более дорогое обучение в университете закрывало возможности для получения образования значительной части местного крестьянства.

В статье-передовице «Нашей Нивы» от 7(20) июля 1911 г. издатель писал, что «…вывести наш народ на простую дорогу может та интеллигенция, которая вышла из народа, которую взрастила деревня своими соками, своей кровью и потом. Это – обязанность народной интеллигенции, это – долг, который лежит на ее совести и должен быть возвращен. Только крепко сомкнувшись со своим народом, только работая для развития его культуры, наша сельская интеллигенция вернет этот долг и скинет с себя ответственность за ту темноту, беду, недолю, которая сковала мощными путами белорусскую землицу» [12, с. 338].

В свою очередь, проекты по учреждению университетов и институтов, которые активно продвигались местными городскими самоуправлениями Вильно, Минска и Витебска при поддержке либеральных и даже монархических групп, однозначно предполагались как «русские» по своей сути [9, с. 117, 121]. Все они предполагали создание «комбинированного» университета – где классические факультеты должны соседствовать с техническим и сельскохозяйственным отделениями. Более того, в случае, если открытие полноценного университета для правительства будет затруднительно, то

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

городские думы просили открыть сельскохозяйственный институт (Витебск, 1907) [9, с. 120]. Для стимулирования правительства городские общества прибегали к разным ухищрениям, граничившим с легким шантажом. Минский городской голова С.Б. Хржонстовский предлагал использовать празднование 300-летнего юбилея правления Романовых как повод для открытия в честь этой знаменательной даты сельскохозяйственного института в Минске [10, с. 78]. Здесь очевидно просматриваются приоритеты более утилитарного характера (потребность экономики в квалифицированных кадрах), а учреждение сельскохозяйственного вуза определяется региональными элитами как программа-минимум.

В это время правительство действительно запланировало открыть в ближайшие годы подобные институты на Кавказе, в Бессарабии, Ташкенте и в одном из городов Беларуси, организационно-правовая сторона вопроса также была решена – согласие Министерства просвещения на сельскохозяйственный институт в Минске было получено весной 1914 г., однако начавшаяся мировая война сдвинула реализацию и этого проекта [13, с. 691].

Таким образом, в отсутствии согласия между «польской», «русской» и молодыми национальными «белорусской» и «литовской» региональными элитами по вопросу открытия вуза в крае, правительство успешно затягивало рассмотрение данного вопроса. Только накануне Первой мировой войны, в 1913–1914 гг. было принято решение об открытии сельскохозяйственного института в Минске, что было обусловлено в первую очередь целями экономического развития региона.

Список использованных источников:

1. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и белорусское Полесье / [под общ. ред. П. П. Семенова]. – Репр. воспр. изд. 1882 г. – Минск : БелЭн, 1993. – 490 с.

2. *Шимукович, С. Ф.* Уроженцы белорусских земель в развитии сельскохозяйственной науки Российской империи в XIX – начале XX века / С. Ф. Шимукович // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований (XIX – начало XXI в.) : докл. Междунар. науч. конф., Минск, 23 сент. 2021 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Ин-т истории ; ред.: Ю. Каракулько [и др.]. – Минск, 2021. – С. 201–223. https://doi.org/10.47612/978-985-880-155-7-2021-201-223

3. *Петров, А.* Очаповский, Михаил Николаевич / А. Петров // Русский биографический словарь : в 25 т. / изд. под наблюдением А. А. Половцева. – СПб., 1896–1918. – Т. 12. – 1902. – С. 478.

4. *Яноўскі, А. А.* Універсітэт Беларусі: асэнсаванне і рэалізацыя яго ідэі ў гісторыка-палітычных рэаліях часу / А. А. Яноўскі, А. Ф. Самусік // Российские и славянские исследования : науч. сб. / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2012. – Вып. 7. – С. 357–370.

5. История аграрной науки Беларуси (XIX – начало XXI в.) : в 2 ч. / В. Г. Гусаков [и др.] ; редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2017. – Ч. 1. – 310 с.

6. Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). – Ф. 2001. Оп. 2. Д. 62. Л. 17–20.

7. *Кузьма, Д. І.* Праекты першых беларускіх універсітэтаў: М.В. Каяловіч і праблема арганізацыі праваслаўнай вышэйшай навучальнай установы ў Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя / Д. І. Кузьма // Беларус. думка. – 2010. – № 6. – С. 116–120.

8. НИАБ. – Ф. 2260. Оп. 1. Д. 296. Л. 1–1об.

9. *Головач, Е. И.* Отношение либеральных и правомонархических партий к открытию высшего учебного заведения в белорусско-литовских губерниях в начале XX века / Е. И. Головач // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки : [сб. науч. ст.]. – Минск, 2022. – Вып. 22, ч. 1. – С. 115–123.

10. *Моторова, Н. С.* Проекты открытия высшего учебного заведения на территории белорусско-литовских губерний в ходатайствах органов местного самоуправления начала XX в. / Н. С. Моторова // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2015. – № 1. – С. 76–82.

11. Мобилизация и реорганизация российской науки и образования в годы Первой мировой войны / под общ. ред. Э. И. Колчинского. – СПб. : Нестор-История, 2018. – 672 с.

12. Наша Ніва. Вып. 4: 1911 г.: факс. выд.. – Мінск : Тэхналогія, 2003. – 684 с.

13. *Шукович, С. Ф.* Белорусская газета «Наша Нива» об основании университета в западных губерниях в начале XX века / С. Ф. Шимукович // Via in tempore. История Политология. – 2021. – Т. 48, № 3. – С. 681–693. https://doi.org/10.52575/2687-0967-2021-48-3-681-693

References:

1. Semenov P. P. (ed.). *Picturesque Russia: Our Fatherland in its geographic, historical, tribal, economic and consumer value: Lithuanian and Belarusian Polessie*. Reprint editon 1882. Minsk, BelEn Publ., 1993. 490 p. (in Russian).

2. Shymukovich S. F. Natives of the Belarusian lands in the development of agricultural science of the Russian Empire in the 19th – early 20th century. *Sel'skoe khozyaistvo Belarusi skvoz' prizmu nauchnykh issledovanii (XIX - nachalo XXI v.): doklady Mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii, Minsk, 23 sentyabrya 2021 g. =*

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Agriculture of Belarus through the prism of scientific research (XIX – early XXI century): proceedings of the International scientific conference, Minsk, September 23, 2021. Minsk, 2021, pp. 201–223 (in Russian). https://doi.org/10.47612/978-985-880-155-7-2021-201-223

3. Petrov A. Ochapovsky Mikhail Nikolaevich. *Russian biographical dictionary. Vol. 12*. St. Petersburg, 1902, p. 478 (in Russian).

4. Yanouski A. A., Samusik A. F. The University of Belarus: understanding and realization of its idea in historical and political realities of time. *Rossiiskie i slavyanskie issledovaniya: nauchnyi sbornik* [Russian and Slavic studies: scientific collection]. Minsk, 2012, iss. 7, pp. 357–370 (in Belarusian).

5. Gusakov V. G. (ed.). *History of agrarian science in Belarus (XIX early XXI –century). Part 1.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 310 p. (in Russian).

6. *National Historical Archives of Belarus.* F. 2001. Op. 2. D. 62. L. 17–20. (in Russian).

7. Kuz'ma D. I. Projects of the first Belarusian universities: M.V. Kayalovich and the problem of organizing an Orthodox higher educational institution in Belarus in the second half of the 19th century. *Belaruskaya dumka* [Belarusian Thought], 2010, no. 6, pp. 116–120 (in Belarusian).

8. National Historical Archives of Belarus. F. 2260. Op. 1. D. 296. L. 1–1 vol. (in Russian).

9. Golovach A. The attitude of liberal and right-monarchist parties to the opening of a higher educational institution in the Belarusian-Lithuanian provinces at the beginning of the XX century. *Nauchnye trudy Respublikanskogo instituta vysshei shkoly. Istoricheskie i psikhologo-pedagogicheskie nauki* [Scientific works of the Republican Institute of Higher Education. Historical and psychological-pedagogical sciences]. Minsk, 2022, iss. 22, pt, 1, pp. 115–123 (in Russian).

10. Motorova N.S . Projects of Opening the Higher Education Institution on the Territory of Belarus and Lithuania Provinces in Petitions of Local Governments of the early XXth Century. *Vesnik Brestskaga universiteta. Seryya 2, Gistoryya. Ekanomika. Prava = Vesnik of Brest University. Series 2. History. Economics. Law*, 2015, no. 1, pp. 76–82 (in Russian).

11. Kolchinskii E. I. *Mobilization and reorganization of Russian science and education during the First world war*. St. Petersburg, Nestor-Istoriya Publ., 2018. 672 p. (in Russian).

12. *Our Niva. Issue 4: 1911.* Facsimile ed. Minsk, Tekhnalogiya Publ., 2003. 684 p. (in Belarusian).

13. Shymukovich S. F. Belarusian newspaper "Nasha Niva" about the foundation of the university in the western provinces at the beginning of the 20th century. *Via in tempore. Istoriya Politologiya = Via in tempore. History and Political Science*, 2021, vol. 48, no. 3, pp. 681–693 (in Russian). https://doi.org/10.52575/2687-0967-2021-48-3-681-693

Дата поступления статьи 21.08.2023
Received 21.08.2023

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 378.663(091)(476)«1836/1863»
https://doi.org/10.5281/zenodo.8333791

А. У. Ерашэвіч

Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

ГОРЫ-ГАРАЦКІЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ Ў 1836–1863 гг.: АРГАНІЗАЦЫЙНА-ФІНАНСАВЫЯ АСПЕКТЫ СТВАРЭННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ

Анатацыя. У артыкуле раскрываюцца арганізацыйна-фінансавыя аспекты перадумоў адкрыцця і дзейнасці спецыяльных сельскагаспадарчых навучальных устаноў па падрыхтоўцы аграномаў, якія працавалі ў 1840–1863 гг. у Горы-Горках. На падставе штатных роспісаў і каштарысных ведамасцей руху прыхода-расходных сум высветлены крыніцы даходаў, прааналізаваны асноўныя прадметы выдаткаў, паказаны ў дынаміке змены ў фінансавым забеспячэнні функцыянавання земляробчага інстытута з падпарадкаванымі яму іншымі навучальнымі ўстановамі аграрнага профілю – першага і адзінага вядучага дзяржаўнага спецыяльнага вышэйшага сельскагаспадарчага адукацыйнага і навуковова-практычнага цэнтра ў Расійскай імперыі ў цэлым, а не толькі ў беларуска-літоўскіх губернях краіны.

Ключавыя словы: Горы-Горкі, сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы, фінансаванне, даходы, выдаткі.

Для цытавання. Ерашэвіч, А. У. Горы-Горацкія сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы ў 1836–1863 гг.: арганізацыйна-фінансавыя аспекты стварэння і дзейнасці / А. У. Ерашэвіч // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси, Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории, Науч. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 85–114.

А. В. Ерошевич

Белорусский государственный экономический университет, Минск, Беларусь

ГОРЫ-ГОРЕЦКИЕ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫЕ УЧЕБНЫЕ ЗАВЕДЕНИЯ В 1836–1863 гг.: ОРГАНИЗАЦИОННО-ФИНАНСОВЫЕ АСПЕКТЫ СОЗДАНИЯ И ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

Аннотация. В статье раскрываются организационно-финансовые аспекты предпосылок открытия и деятельности специальных сельскохозяйственных учебных заведений по подготовке агрономов, которые работали в 1840–1863 гг.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

в Горы-Горках. На основании штатных росписей и сметных ведомостей движения приходо-расходных сумм определены источники доходов, проанализированы основные предметы расходов, показаны в динамике изменения в финансовом обеспечении функционирования земледельческого института с подчиненными ему другими учебными учреждениями аграрного профиля – первого и единственного ведущего государственного специального высшего сельскохозяйственного учебного и научно-практического центра в Российской империи в целом, а не только в белорусско-литовских губерниях страны.

Ключевые слова: Горы-Горки, сельскохозяйственные учебные заведения, финансирование, доходы, расходы.

Aliaksandr V. Yerashevich

Belarusian State Economic University, Minsk, Belarus

GORY-GORETSKY AGRICULTURAL EDUCATIONAL INSTITUTIONS IN 1836–1863: ORGANIZATIONAL AND FINANCIAL ASPECTS OF THEIR CREATION AND ACTIVITY

Abstract. The article reveals organizational and financial aspects of the prerequisites for the opening and activity of special agricultural educational institutions for training agronomists who worked in 1840–1863 in Gory-Gorki. The sources of income are determined on the basis of staff records and estimated statements of the flow of incoming and outgoing amounts; the main items of expenditure are analysed; and changes in the dynamics of financial provision of functioning of the agricultural institute with other subordinate educational institutions of agrarian profile are shown in dynamics. Gory-Goretsky Agricultural Institute was the first and the only leading state special higher agricultural educational and scientific-practical centre in the Russian Empire as a whole, and not only in the Belarusian-Lithuanian provinces of the country.

Keywords: Gory-Gorki, agricultural educational institutions, financing, income, expenses.

For citation. Yerashevich A. V. Gory-Goretsky agricultural educational institutions in 1836–1863: organizational and financial aspects of their creation and activity. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the II International scientific conference dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023. Minsk, 2023, pp. 85–114 (in Belarusian).

Да адкрыцця Горы-Горацкай земляробчай школы ў імператарскай Расіі ўжо існавала некалькі вучэбных цэнтраў для падрыхтоўкі спецыялістаў па ўдасканаленні асноў розных напрамкаў сельскагаспадачай вытворчасці. Таксама

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

распрацоўваліся праекты арганізацыі спецыяльных сельскагаспадарчых школ у беларуска-літоўскім краі. У 1827 г. было прапанавана заснаваць інстытут сельскага дамаводства пры Віленскім універсітэце. Аднак праект, прадстаўлены ў Міністэрства народнай асветы ў 1828 г., так і не быў зацверджаны вярхоўнай уладай [1, с. 242–244], як і план стварэння сельскагаспадарчай школы пры Беларускім вольным эканамічным таварыстве.

У сувязі з неўраджаямі 1833 г. у шэрагу губерняў імператарскай Расіі пачаўся пошук сродкаў для павышэння спосабаў удасканалення культуры земляробства. Для абмеркавання рацыянальных прыёмаў павелічэння прыбытковасці сельскагаспадачай вытворчасці ў 1833 г. быў заснаваны Камітэт аб уладкаванні земляробства ў Расіі. Прэзідэнт Вольнага эканамічнага таварыства адмірал М. С. Мардвінаў у запіске імператару аб мерах па паляпшэнні сельскай гаспадаркі рэкамендаваў за кошт грашовай падтрымкі з дзяржаўнага казначэйства ўвесці шэраг мер, накіраваных для павелічэння прыбытковасці земляробства, у тым ліку адзначыў пільную неабходнасць набыцця спецыяльных аграномічных ведаў [2, с. 660–661]. Камітэт аб уладкаванні земляробства параіў наладзіць выпуск асобнай «Земледельческой газеты», стварыць некалькі вопытных хутароў для сельскагаспадарчых эксперыментаў, заснаваць для казённых і памешчыцкіх маёнткаў механічаскія ўстановы для падрыхтоўкі ўдасканаленых земляробчых прылад і ў губернях дэпо для іх продажу, арганізаваць падрыхтоўку кадраў для практычных заняткаў сельскай гаспадаркай, а таксама прапанаваў заснаваць для навучання аграномаў земляробчыя школы з 2 разрадаў – вышэйшага і ніжэйшага. На кожную земляробчую школу меркавалася адпускаць па 125 тыс. руб. асігнацыямі штогод (81 тыс. з дзяржаўнай казны, 38 тыс. за кошт платы з пансіянераў, 6 тыс. з даходу практычнага хутара). Для ўладкавання земляробчай школы патрабавалася аднаразова прыблізна 575 тыс. руб. асігнацыямі (460 тыс. на пабудову і 115 тыс. на «обзаведение») [3, с. 289, 292–293, 302].

Камітэт аб удасканаленні земляробства лічыў, што для рацыяналізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці былі патрэбны

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

кіраўнікі маёнткаў з грунтоўнымі агранамічнымі тэарэтычнымі і практычнымі ведамі. Міністр фінансаў Расійскай імперыі Я.Ф. Канкрын санкцыянаваў падбор прыдатнага маёнтка для стварэння ў ім земляробчай навучальнай установы з мэтай набыцця агранамічных ведаў сельскімі гаспадарамі. Як варыянт абмяркоўваўся прыклад падмаскоўнага Пятроўска-Разумоўскага маёнтка. Пры арганізацыі агранамічнай школы абапіраліся на вопыт функцыянавання акадэміі А.-Д. Тэера (1752–1828), размешчанай у Мегліне, маёнтку недалёк ад Берліна, якая дзейнічала ў 1804–1861 гг. Як вядома з дакладной запіскі Я.Ф. Канкрына ў Камітэт аб удасканаленні земляробства ад 11.04.1836 г., шэраг існуючых універсітэцкіх цэнтраў адукацыі ў Дэрпце, Казані, Кіеве і Харкаве былі абвешчаны няздатнымі месцамі арганізацыі земляробчай школы з-за таго, што ў іх аддавалася перавага тэарэтычным ведам, была недастатковая вучэбна-матэрыяльная база, а перадусім адсутнічалі фінансавыя сродкі для ўладкавання пры агранамічнай навучальнай установе ўзорнай запашкі. Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. беларуска-літоўскі край пазбавіўся ўніверсітэцкай вышэйшай навучальнай установы. У той жа час на тэрыторыі беларускіх губерняў у сувязі з секвестрам шэрагу зямельных уладанняў удзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. мелася шмат неўладкаваных казённых і старосцінскіх маёнткаў, для арганізацыі пры якіх земляробчай школы патрабаваліся значныя грашовыя сродкі.

Рашэнне аб адкрыцці земляробчай школы ў заходніх губернях Расійскай імперыі было прынята ў лістападзе 1833 г. Пачаўся пошук прыдатнага для гэтага месца ў адным з канфіскаваных казённых маёнткаў ці раёне дзеяння аброчных галін. Летам 1835 г. 2 чыноўнікі Міністэрства фінансаў: калежскі асэсар аграном барон фон Р. Шцейгер і А. Завадоўскі адправіліся для пошуку месца для заснавання земляробчай школы ў Кіеўскую і Магілёўскую губерні [4, арк. 2].

Спецыяльная камісія аглядзела ў Магілёўскай губерні Горы-Горацкі і Быхаўскі казённыя маёнткі, архіерэйскі маёнтак Барсукі, памешчыцкі маёнтак Бышлякі, якім кіраваў упраўляючы Горы-Горацкім маёнткам Станкевіч, паезуіцкі маёнтак Фашчаўку. Пасля абследавання больш зручным месцам для стварэння земляробчага вучылішча быў прызнаны Горы-Горацкі

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

маёнтак у 40 вярстах ад Оршы, які вылучаўся вялікімі памерамі і дазваляў уладкаваць пры земляробчай школе ўзорную запашку без прыцягнення вольнанаёмных рабочых. З Горы-Горацкага казённага маёнтка пад школьны маёнтак летам 1836 г. былі вылучаны 15 тыс. дзесяцін зямлі, на якіх размяшчаліся 5 фальваркаў (Горкі, Іванава, Наталін, Пуплы, Нікадзімава), 22 вёскі з гадавым даходам да 30 тыс. руб. і 6229 сялянамі [5, с. 45, 46, 51].

Палажэнне аб Горы-Горацкай земляробчай школе было зацверджана імператарам 24.04.1836 г. і апублікавана 22.05.1836 г. [6, арк. 278–287 адв.; 7, арк. 1–20; 8]. Земляробчая школа для падрыхтоўкі выканаўча-распарадчых кадраў для старосцінскіх і казённых маёнткаў з мэтай увядзення і распаўсюджвання вопыту палепшаных, удасканаленых методык узорнай сельскай гаспадаркі з узорнай запашкай і аўчарняй арганізоўвалася ў фальварках Горы-Горацкага казённага маёнтка. Усе выхаванцы земляробчай школы падзяляліся на 2 разрады. У малодшы першы разрад з 3-гадавым тэрмінам навучання залічаліся земляробчыя вучні (будучыя агратэхнічныя спецыялісты ніжэйшага звяна). Другі разрад рыхтаваў за 2-3 гады практычных аграномаў для кіравання значнымі маёнткамі. У гэты разрад прымаліся найлепшыя выхаванцы 1-га разраду свабоднага стану. Першы разрад прызначаўся для падрыхтоўкі аграномаў-практыкаў у памешчыцкіх маёнтках. Другі разрад даваў вышэйшую агранамічную адукацыю. Штатная колькасць навучэнцаў складала 150 асоб, з якіх 30 былі на казённым кошце з выдаткам на кожнага з ніх па 250 руб. асігнацыямі штогод. За 120 пансіянераў былі абавязаны плаціць для іх поўнага ўтрымання і адзення: 1-га разраду па 300, а 2-га па 400 руб. асігнацыямі ў год. Вольныя слухачы прымаліся з абавязкам выплаты з уласнай кішэні па 60 руб. асігнацыямі штогод. Грошы на пенсіянераў залічаліся на год наперад [4, арк. 2–2 адв.; 6, арк. 279; 8, с. 437]. У 1839 г. пасля пералічэння на сярэбраную манету плата за прыём прыватных выхавальнікаў 1-га разраду склала 85,71 руб., 2-га разраду – 114,29 руб., вольнапрыходзячых вучняў – 17,14 руб. з асобы [9, арк. 57]. Кантынгент казённых выхаванцаў камплектаваўся з дзяцей асабістых дваран, свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей, купцоў, мяшчан, аднадворцаў,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

разначынцаў, казённых сялян. Яны былі абавязаны пасля выпуску з земляробчай школы праслужыць на пасадах у казённых маёнтках, па меры неабходнасці, 6 гадоў. Земляробчыя вучні 1-га разраду вызваляліся ад плацяжу дзяржаўных падаткаў і рэкруцкай павіннасці. Практычныя аграномы атрымлівалі ўсе правы выпускнікоў Тэхналагічнага інстытута, а найлепшыя – правы спадчыннага ганаровага грамадзянства. Земляробчай школай кіравала кантора ў складзе дырэктара, прафесара і галоўнага наглядчыка [8, с. 436, 439–440].

Па нашых падліках, усяго на 7 чал. адміністрацыйнага персаналу (дырэктар, галоўны наглядчык, эканом (ён жа і казначэй), пісьмаводца, бухгалтар, пісар сярэдняга і пісар ніжэйшага разраду) адпускалася 8620 руб. Дырэктару 6-га класа належыла выплачваць 4 тыс. руб. штогадавога жалавання (з 1844 г. яго аклад быў павялічаны і параўнаваны з упраўляючым палатай дзяржаўных маёмасцей 3-га разраду (2287,36 руб. серабром), з дадаткам да акладу 1143,68 руб. і столькі ж у выглядзе сталовых грошай з рэшткаў ад штатнай сумы). Навучанне ў земляробчай школе забяспечвалі 18 выкладчыкаў тэарэтычнай і практычнай частак (прафесар аграноміі, 2 ад'юнкты, геадэзіст, законанастаўнік, 3 каморнікі, 2 настаўнікі граматыкі і арыфметыкі, 2 настаўнікі чыстапісання, практычны аграном, 2 памочнікі агранома, лікавы чыноўнік па ўзорнай гаспадарцы, пісар сярэдняга разраду, садоўнік), на жалаванне якім адпраўлялі 23960 руб. На выдачу жалавання прафесару аграноміі і практычнаму аграному вылучалася па 4000 руб. кожнаму. Для ўтрымання 30 казённых выхаванцаў і 120 пансіянераў выдаткоўвалася 37500 руб. У закрытай агранамічнай навучальнай установе ўсе навучэнцы павінны былі знаходзіцца ў пансіёне пад пастаянным наглядам адміністрацыі. Абавязак нагляду за паводзінамі навучэнцаў меў галоўны наглядчык 7-га класа з гадавым утрыманнем у 1500 руб. Яму дапамагалі 15 наглядчыкаў з унтэр-афіцэраў, якім выдавалі 3 тыс. руб. 66 штатных дапаможных служачых абслугоўвалі патрэбы навучэнцаў і земляробчай школы (40 прыслужнікаў пры розных дамашніх і сельскіх работах, 8 служыцелей з адстаўных салдат, 6 наглядчыкаў пры палявых работах і дагляду за жывёлай, доктар (ён жа і ветэрынар), фельчар, кухар, пекар, «тафельдеккер»

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

(накрываючы стол – А.Е.), кашцялянша, каваль, каляснік, сталяр, сёдзельнік, муляр, маляр) і атрымлівалі 15880 руб. На выдачу порцый асігнавалася 10760 руб. Гаспадарчыя выдаткі (фінансавыя сродкі для набыцця адзення для выпускаемых штогод 6 казённых выхаванцаў, бялізны і посуду, медыкаментаў і дадатковыя на шпіталь, на бібліятэку, мадэлі і інструменты, канцылярскія выдаткі, рамонт будынкаў, іх ацяпленне і асвятленне, на рамонт земляробчых прылад, пажарных інструментаў і інш., на розныя расходы па вопытнай запашцы, пачастунак для прыезджых наведвальнікаў) складалі 35280 руб. У структуры штатных выдаткаў земляробчай школы на гаспадарчыя расходы з выдачай харчавання выдзялялася 34,1%, на ўтрыманне 150 выхаванцаў – 27,8%, на выкладчыцкі корпус і выхавальнікаў – 19,9%, дапаможным служачым – 11,8%, на адміністрацыйны персанал – 6,4% супольнай сумы. Усяго на 256 асоб земляробчай школы выдаткоўвалася 135000 руб. асігнацыямі ці 38580 руб. серабром. За вылікам паступленняў за 120 пансіянераў (на 100 чал. 1-га разраду ад 100 да 300 руб. (30 тыс. руб.) і 20 чал. 2-га разраду ад 20 да 400 руб. (8000 руб.), астатнія 97 тыс. руб. асігнацыямі ці прыкладна 27714,28 руб. серабром адлічаліся з дзяржаўнай казны [6, арк. 285–286; 7, арк. 15–17 адв.; 10].

Згодна з данымі С. Цытовіча, паводле гадавога каштарысу земляробачй школы з 28 тыс. руб. серабром на ўтрыманне 66 служачых асігнавалася 14 тыс., на гаспадарчыя патрэбы – 12 тыс., на вопытнае поле, бібліятэку і навучальнае абсталяванне – 2 тыс. руб. Акрамя жалавання, выкладчыкі, адміністрацыя і служачыя атрымоўвалі як надбаўку да жалавання парцыённыя прыпасы і сталовыя порцыі. Парцыйны прыпас складаўся з 18 пудоў жытняй мукі, 6 пудоў пшанічнай, 10 пудоў мяса, пуда соладу, 2 чвэрцяў бульбы і крупы па ацэнцы ў 23 руб. Штогод было 72 парцыённых прыпаса для 20 служачых, у тым ліку дырэктару – 8, прафесару, галоўнаму наглядчыку і практычнаму аграному – па 6, урачу – 5, іншым – па 2-3. Астатнія служачыя атрымлівалі з навучэнскай сталовай па порцыі коштам 30 руб. штогод. Прыпасы і порцыі выдаваліся натурай ці грашыма. У 1848 г. прыпасы і порцыі былі заменены так званымі сталовымі грашыма. Гадавое ўтрыманне (жалаванне і кошт прыпаса)

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

прафесара, дырэктара і агранома складала 1280 руб., ад'юнктаў, галоўнага наглядчыка і памочніка агранома – 600 руб., настаўнікаў – 300-400 руб. 1,7 тыс. руб. ішло на аплату накіраваных з цэнтральных губерняў 40 сялян для навучання і работ з разліку па 42 руб. на адзенне і стол кожнаму [5, с. 54].

Даходы з 5 фальваркаў Горы-Горацкага маёнтка (2735 сялян) ішлі на карысць земляробчай школы, а ў дзяржаўнае казначэйства здаваліся толькі рэшткі наяўных сум [11, с. 12–13]. На набыццё ў Маларосіі і мясцовых памешчыкаў да 300 штук рабочай і прадукцыйнай жывёлы было выдаткавана 12000 руб. асігнацыямі. У жніўні 1840 г. у Горкі даставілі стада мерыносных авечак (508 матак і 24 бараны), купленае ў Ліфляндыі за 24500 руб. асігнацыямі [12, с. 7].

Для пабудовы ў мястэчку Горках Аршанскага павета будынкаў Горы-Горацкай земляробчай школы 3.11.1836 г. была адкрыта будаўнічая Камісія [4, арк. 21–22]. Яе старшынёй быў прызначаны калежскі саветнік Кадзян з Пецярбурга, а архітэктарам стаў губернскі сакратар А. Кампіоні, які будаваў будынкі на Біржавай плошчы ў сталіцы Расіі [12, с. 5–6]. За студзень 1840 г. у прыходзе Камісіі лічылася 19595,5 руб., а ў расходзе 19502,04 руб. серабром. Штатная сума часовай Камісіі для пабудовы Горы-Горацкай земляробчай школы ў складзе старшыні, члена, архітэктара, агранома, бухгалтара, пісьмаводцы, 4 канцылярскіх чыноўнікаў з улікам канцылярскіх і гаспадарчых выдаткаў складала 28 тыс. руб. асігнацыямі ці 8000 руб. серабром (за вылікам 2%, сума да выдачы акладнога гадавога жалавання чынам і задавальнення іншых расходаў памяншчалася да 7914,94 руб.). [13, арк. 73–74, 75–77]. З прызначаных за вылікам на ўтрыманне Горы-Горацкай земляробчай школы 38375,25 руб. серабром у 1840 г. у распараджэнне Камісіі былі асігнаваны з Магілёўскай казённай палаты 10459 руб. серабром, у тым ліку 8000 руб. на ўтрыманне Камісіі, 1144 руб. на выдачу жалавання штатнаму аграному і яму ж узамен правізіі 286 руб., 429 руб. на забеспячэнне жалаваннем галоўнага наглядчыка і 600 руб. для 40 чал. казённых сялян, накіраваных з розных губерняў. Такая ж сума (10459 руб. серабром) паступіла з Аршанскага павятовага казначэйства. З Магілёўскага павятовага казначэйства ў Камісію прыбыла 5600 руб. серабром (575 руб.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

серабром дэпазітнымі білетамі і 17587,5 руб. асігнацыямі) [13, арк. 92–92 адв., 101–102, 106, 135].

У сувязі з 165-годзем нараджэння Пятра I 30.05.1837 г. адбылася ўрачыстая закладка галоўнага вучэбнага корпуса земляробчай школы. З 30.05.1837 да 23.04.1840 гг. для патрэб земляробчай школы ў 5 фальварках Горы-Горацкага маёнтка былі пабудаваны 35 жылых і гаспадарчых збудаванняў, у тым ліку 3 мураваныя 3-х павярховыя корпусы (вучэбны, канцылярскі і кватэрны), майстэрня, аранжарэя, сялянскі лазарэт, лазня, вучэбна-дапаможныя і жылыя пабудовы. Будаўніцтва школы і ўладкаванне прышкольнага ўчастка каштавалі 296 тыс. руб. [5, с. 57]. Большасць збудаванняў узнікла ў фальварку Горкі, у якім з'явіўся 21 будынак: галоўны корпус Горы-Горацкай школы (160968 руб.), правы (77730 руб.) і левы корпусы (89071 руб.), флігелі, склепавы флігель (54092 руб.), дом для чыноўнікаў (21286 руб.), службы з склепам (7526 руб.), правы (3826 руб.) і левы (3778 руб.) флігелі, кладоўні і ляднік пры школе (2761 руб.), кузня (3751 руб.), лазня (4181 руб.), сялянскі лазарэт з службамі (16390 руб.), гумно (7259 руб.), хлебны свіран (2991 руб.), 2 свіраны (1948 руб.), жывёльны двор (15729 руб.), хлебны двор (9794 руб.), птушыны двор (1731 руб.), агароджы і каравульны домік (7315 руб.). У фальварку Наталін адбудавалі жывёльны двор (2599 руб.), гумно (7862 руб.), хлебны свіран (5289 руб.), у фальварку Іванава – жывёльны двор (13501 руб.), 2 хлебных свіраны (6607 руб.), аўчарню (2882 руб.), гумно (6807 руб.), у фальварку Нікадзімава – хлебны свіран (4526 руб.), аўчарню (5252 руб.), у фальварку Пуплы – гумно з восецю (9282 руб.), жывёльны двор (6502 руб.), аўчарню (2684 руб.), пуню (1721 руб.) [14, с. 12–13].

Будаўніцтва новых аб'ектаў працягвалася і пазней. На пабудову храма Мікалая Цудатворца, закладзенага ў жніўні 1849 г. і асвячонага 31.08.1852 г., пайшло 19188 руб. серабром [11, с. 43]. У 1849 г. пры земляробчым інстытуце, па ўзору замежных агранамічных інстытутаў, быў пабудаваны тэхнічны будынак, скончаны канчаткова ў 1854 г. за 17000 руб. [12, с. 16]. На пабудову механічнага завода механіку ў 1859 г. была выдадзена пазыка ў 48 тыс. руб. [15, с. 93]. Усяго ж было выдаткавана на пабудову і рамонт будынкаў да 580 тыс. руб. асігнацыямі, а разам

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

на пабудову і ўладкаванне будынкаў Я.Ф. Канкрыным было асігнавана да 1 млн. руб. асігнацыямі [12, с. 7–8].

Нягледзячы на шырокія абвесткі ў прэсе і загадзя вызначанае палажэнне аб умовах навучання і выкладання, набор адміністрацыйнага персаналу і выхаванцаў у земляробчую школу праходзіў марудна. Да 15.08.1840 г. з 25 штатных пасад чыноўнікаў і выкладчыкаў былі заняты толькі 13. З штатных казённых 120 выхаванцаў было толькі 6, а з 30 пансіянераў толькі 2. Больш усяго было накіраваных з розных губерняў казённых сялян (36 з 40 чал.) [16, арк. 36].

На ўрачыстае адкрыццё 15.08.1840 г. земляробчай школы было выкарыстана 2000 руб. асігнацыямі ці 571,42 руб. серабром з штатных сум і асобна з 1.06.1840 па 1.01.1841 г. на частаванне прыязджаючых наведвальнікаў 740 руб. асігнацыямі. За 1840 г. пры прыходзе 25646,8 руб. серабром і расходзе ў 24994,42 руб. засталося 652,38 руб. рэштку сум утрымання земляробчай школы [17, арк. 21–21 адв., 23; 9, арк. 42–44].

Вынікі інспекцыйнай паездкі П.Дз. Кісялёва, які наведаў ў ліпені 1841 г. Горы-Горацкую земляробчую школу, далі магчымасць яму прыйсці да заключэння, што для патрэб сельскагаспадарчай адукацыі і падрыхтоўкі кіраўнікоў-аграномаў неабходна было ў вышэйшы разрад земляробчай школы прымаць толькі дваран і людзей сярэдняга стану з ліку выпускнікоў гімназій [1, с. 28–29]. Было вырашана заснаваць з 2-га разраду земляробчай школы самастойную вучэбную ўстанову. Зімой 1842 г. 2-гі разрад земляробчай школы быў пераўтвораны ў вышэйшы з правамі самастойнай вышэйшай сельскагаспадарчай навучальнай установы. Згодна з абвешчаным указам Сенату ад 17.02.1842 г. пры земляробчай школе было заснавана вышэйшая агранамічная ўстанова. Гадавое ўтрыманне выхавальніка за яго ўласны кошт каштавала 114,28 руб. серабром [7, арк. 21–22]. У вышэйшы разрад залічаліся выключна дзеці дваран, ганаровых грамадзян, свяшчэннаслужыцелей, купцоў 1-й і 2-й гільдый з атэстатам гімназіі ці прынятых пасля экзаменаў у адзін з расійскіх універсітэтаў, альбо пасля іспыту ў самой вучэбнай установе. У навучальны курс вышэйшага разраду было дадано, акрамя распаўсюджвання прадметаў адносна сельскай гаспадаркі, выкладанне рускай славеснасці, нямецкай мовы,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

асноў механікі, мінералогіі, пачаткаў геадэзіі, рускага заканадаўства і рахункаводства. Жалаванне дадатковым выкладчыкам адпускалася на кошт гаспадарчых сродкаў навучальнай установы [18].

Пасля адкрыцця 15.08.1842 г. вышэйшага разраду земляробчай школы жадаючых у ім вучыцца не аказалася. Таму першы набор студэнтаў у 1843 г. ажыццяўляўся за кошт прыёму выхаванцаў з іншых навучальных устаноў (Мікалай Бараноўскі, Яўген Баркоўскі і Піус Ю[illegible]віч былі накіраваны з Пецярбургскага ўніверсітэта, Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі і Віцебскай гімназіі). Да таго ж, у 1843–1844 гг. былі залічаны 59 семінарыстаў з 43 гарадоў Расіі. Сярод 57 першых выпускнікоў вышэйшага разраду земляробчай школы ў 1846 г. было 50 былых семінарыстаў [19, с. 9; 20, с. 39].

Пры Горы-Горацкай земляробчай школе былі заснаваны шэраг дапаможных практычных вучэбных цэнтраў перадавых агратэхналогій і сельскагаспадарчай адукацыі. У 1842 г. узнікла першае ў Расійскай імперыі сельскагаспадарчае навукова-даследчае вопытнае поле, дзе ўпершыню праводзіліся агранамічныя палявыя эксперэментальныя вопыты па ўдасканаленні вырошчвання сельскагаспадарчых раслін. У 1844 г. пры земляробчым вучылішчы з мэтай распаўсюджвання ўдасканаленняў ва ўсіх галінах сельскай гаспадаркі і практычнага навучання гаспадароў узнікла вучэбная ферма (1098 дзесяцін зямлі), у якой праходзілі 4-гадавое навучанне сялянскія дзеці для падрыхтоўкі паступлення ў ніжэйшы разрад земляробчай школы. У 1845 г. у яе былі залічаны першыя 44 вучні. У 1840-я гг. падобныя 8 вучэбных ферм (уключаючы Горы-Горацкую) перадавых агратэхналогій былі створаны ў розных рэгіёнах Расійскай імперыі. Але паколькі дзяржаўныя сяляне не накіроўвалі туды вучыцца сваіх дзяцей, яны да 1858 г., за выключэннем Горы-Горацкай, былі скасаваны [21, с. 200]. З 1842 г. працавала школа аўчароў (204 навучэнцы), з 1844 г. – конны завод пад кіраўніцтвам прафесара Э.Ф. Рего, з 1847 г. – «дендрарий» (дравесны пітомнік) (займаў 14,5 га). Пазней у 1849 г. пры земляробчым инстытуце і ферме былі створаны майстэрні земляробчых прылад.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Тым не менш, укамплектаваць па штатных нормах земляробчае вучылішча выкладчыцкімі кадрамі і навучэнцамі не атрымоўвалася з-за малапрэстыжнасці ў грамадскім асяроддзі агранамічнай дзейнасці. Каштарыс ўтрымання Горы-Горацкай земляробчай школы ў 1844 г. сведчыць, што ў рэштку заставалася 16932,62 руб. Пры прыходзе ў 46960,42 руб., з якіх 38088,07 руб. прыбылі з Магілёўскага казначэйства і пры 1133,47 руб. прыватных узносаў, у расход было асігнавана толькі 33500,48 руб. [22, арк. 4–11]. Тым не менш, расход з адлічанымі ў іншыя сумы грашыма склаў 63833,1 руб. Гэтая абставіна тлумачыцца розніцай уліку крыніц даходаў і прадметаў выдаткаў. Так, у ведамасцях вылучаліся асобныя сумы ўтрымання земляробчай школы і фермы, эканамічная, экстраардынарны капітал з рэшткаў штатных сум, сум дзяржаўнага казначэйства, розным установам і асобам, сумы, выручаныя за прадукты, ведамства 3-га дэпартамента Міністэрства дзяржмаёмасцей, паступаўшыя з розных устаноў, аброчных галін казённага маёнтка.

Да 1848 г. у Горы-Горках функцыянавалі 3 навучальныя ўстановы: вышэйшы і ніжэйшы разрады земляробчай школы і падрыхтоўчая вучэбная ферма. Згодна з зацверджаным імператарам 30.06.1848 г. палажэннем вышэйшы разрад Горы-Горацкай школы быў ператвораны ў земляробчы інстытут з земляробчым вучылішчам і вучэбнай фермай пры ім – першую і адзіную ў імператарскай Расіі вышэйшую сельскагаспадарчую навучальную ўстанову з правамі і структурай універсітэта з 4-гадавым тэрмінам навучання. Ніжэйшы разрад школы быў трансфарміраваны ў земляробчае вучылішча.

Паводле штату на ўтрыманне земляробчага інстытута і вучылішча, згодна з ранейшым палажэннем, з дзяржаўнага казначэйства вызначалася сума ў 38580 руб. серабром, з дадаткам 5620 руб. на вучэбную ферму ўзорнай гаспадаркі паводле палажэння ад 28.05.1841 [23], якія асігнаваліся з гаспадарчага капіталу Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. За навучанне студэнты-пансіянеры павінны былі ўносіць па 125 руб. штогод за паўгода ўперад. Вольныя слухачы маглі наведваць заняткі без платы, а казённыя выхаванцы мелі магчымасць атрымаць веды за кошт штатнай сумы. Выпускнікам з ліку казённых студэнтаў з дзяржаўнай казны выдаткоўваліся сумы на прагоны да месцаў

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

прызначэння, і з дня выпуску да прызначэння на штатныя вакансіі выдавалася жалаванне па 200 руб. серабром штогод з сум у распараджэнні Міністэрства дзяржмаёмасцей. Выпускнікі былі абавязаны праслужыць па ведамству не менш 8 гадоў. За кожнага пансіянера земляробчага вучылішча плацілі па 80 руб. серабром. Дазваляліся звышштатныя расходы пасля асобнага адпаведнага дазволу Дэпартамента сельскай гаспадаркі памерам да 500 руб. серабром, а звыш гэтай сумы – пасля станочай санкцыі міністра дзяржаўных маёмасцей [24, с. 455, 457, 458, 459, 462].

Ранейшая штатная сума ўтрымання Горы-Горацкага земляробчага інстытута і земляробчага вучылішча памерам у 38580 руб. серабром была размеркавана інакш: на адміністрацыйны апарат (дырэктару, прафесару ці ад'юнкту ў званні саветніка праўлення і казначэя, сакратару праўлення, бухгалтару, эканому і адначасова экзекутару, журналісту, пісарам, на канцылярскія выдаткі) адпускалася 5200 руб. (13,5%), у тым ліку дырэктар атрымліваў 2600 руб. На выдачу ўтрымання выкладчыцкаму корпусу і дапаможнаму адміністрацыйна-адукацыйнаму персаналу (3 прафесарам, 4 ад'юнктам, законанастаўніку, 4 настаўнікам, тапографу, нештатным выкладчыкам рымска-каталіцкага закона, за выкладанне нямецкай мовы ў інстытуце і розных прадметаў у земляробчым вучылішчы, дабавачных упраўляючаму фермай, дабавачных загадчыку бібліятэкі, садоўніку і агародніку) асігнавалася 11250 руб. (29,2%) жалавання і сталовых грошай. Выхавальнікам (2 наглядчыкам пры студэнтах і прыстаўніку пры вучнях земляробчага вучылішча) адлічалася 700 руб. (1,8%). На адміністрацыйна-гаспадарчы штат служачых (урачу пры інстытуце і ферме, фельчару, псаломшчыку пры царкве, прыстаўніку пры фізічным і хімічным кабінетах (ён жа і шклавальшчык) выкарыстоўвалася 1210 руб. (3,1%). На ўтрыманне 25 казённых студэнтаў выдавалася 2750 руб. (па 110 руб. на кожнага), 25 казённых вучняў у земляробчым вучылішчы – 1750 руб. (па 70 руб. на кожнага), з дадаткам 400 руб. на экскурсіі студэнтаў інстытута ў розных губернях і 150 руб. на выдачу медалёў і іншых ўзнагарод студэнтам і вучням, разам 5050 руб. (13,1%). Разнастайнымі па прадметах вызначэння заставаліся розныя віды гаспадарчых расходаў (на бальніцу і

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

медыкаменты, царкоўныя патрэбы, рымска-каталіцкаму касцёлу ў Горках у дапамогу за выкананне духоўных трэб, на выдачу кватэрных грошай чыноўнікам, не маючых памяшкання ў будынках інстытута, на наём прыслугі, на ўтрыманне будынкаў, іх рамонт, набыццё мэблі і інш., сталовай бялізны і посуду, вучэбных прыналежнасцей (кніг, мадэлей, інструментаў, на выпіску перыядычных выданняў), на ўтрыманне ўзорнай жывёлы, вопытнай запашкі, гадавальніка, сада, тэхнічных устаноў, прыём наведвальнікаў, на адзенне 16 выпускнікам (8 студэнтам і 8 вучням), утрыманне 11 коней), якія дасягалі 15170 руб. (39,3%). З 5620 руб., адпускаемых для вучэбнай фермы пры земляробчым інстытуце, на розных службовых асоб адміністрацыі адлічалася 4040 руб. (71,9%) (упраўляючаму і выкладчыку сельскай гаспадаркі, старшаму і малодшаму памочнікам, настаўніку рускай мовы, пісьмаводцы, 2 вольнанаёмным пісарам, ветэрынару, фельчару, 2 наглядчыкам за вучнямі, для найму майстравых і розных службовых асоб пры ўстановах фермы, свяшчэнніку). На задзельную плату 50 вучням апошняга курса выдаткоўвалася 1250 руб. (22,2%). На набыццё медыкаментаў выплачвалася 100 руб., задавальненне канцылярскіх выдаткаў – 80 руб., частаванне наведвальнікаў – 150 руб., разам 330 руб. (5,9%) [24, с. 137–139].

На ўтрыманне земляробчага інстытута і вучылішча паступіла з Магілёўскага павятовага казначэйства па роспісу на 1850 г. 38373,78 руб., а таксама 4046 руб. збору на ўтрыманне сваекоштных студэнтаў за 1849–1850 гг., разам, з рэшткам у памеры 9300,07 руб. да 1850 г., 58701,79 руб. З гэтай сумы памерам 56430,51 руб. (пры рэшткі ў 2271,28 руб.) на выдачу жалавання службоўцам было асігнавана 9867,35 руб., сталовых грошай узамен парцыённых – 3658,39 руб., кватэрных чыноўнікам – 455,72 руб., на канцылярскія выдаткі і пісараў – 673,85 руб., разам 14655,31 руб. (да 26%) Утрыманне студэнтаў каштавала 11583,06 руб., вучняў вучылішча – 3486,99 ? руб., разам не менш 15070,05 руб. (не менш 26,7%) [25, арк. 4–23].

З другой паловы 1850-х гг. штогадовыя агульныя каштарысныя рахункі размеркавання прыходу і расходу розных відаў сум па земляробчаму інстытуту становяцца больш падрабязнымі (гл. табл. 1, 2).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Табліца 1. – Агульны рахунак руху прыхода-расходных сум па Горы-Горацкаму земляробчаму інстытуту за 1857 г. (з улікам выпраўленняў), руб. [26, арк. 454–471, 508–529].

Артыкулы сум	Прыход з рэшткам	Расход	Рэштак
Эканамічная сума інстытута	15989,17	9365,22	6623,95
Сумы дзяржаўнага казначэйства	595,15	595,15	
Сумы розных устаноў і асоб	5203,78	5861,39	
На пабудову мураванай царквы пры будынках інстытута	13050,37	5943,08	7107,28
На ўладкаванне пры будынках інстытута дравеснага гадавальніка	1300,63	96,5	1204,13
На ўладкаванні агарожы каля будынкаў інстытута	728,69	705,9	22,79
На перабудову аранжарэі пры будынках інстытута			29,2
На ўладкаванне грунтовага хлева пры інстытуце	70,49	40	30,49
На перабудову былога лазарэтнага дома для размяшчэння ў ім прыходскага вучылішча і свяшчэннаслужыцелей царквы	450	163,76	286,24
На пабудову мураванай лазні	2050	350	1700
На перабудову наведвальніцкіх пакояў інстытута	620,99	29,03	591,96
На ўтрыманне конскага завода інстытута	1200	790,07	409,93
На арганізацыю сельскагаспадарчай выстаўкі пры інстытуце	327	327	

Табліца 2. – Рух прыхода-расходных сум Горы-Горацкага земляробчага інстытута за 1858 г., руб. [27, арк. 150–151].

Прадметы размеркавання сум	Рэштак	Прыход	Разам з рэшткам	Расход	Рэштак
Штатныя сумы	197,66	43161,83	43359,49	43359,49	
Сумы розных устаноў і асоб грашыма	899,59	22072,17	22978,76	20490,27	2488,49
Сумы розных устаноў і асоб білетамі	6592,89	1939,56	8532,45	1750,83	6781,62

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Прадметы размеркавання сум	Рэштак	Прыход	Разам з рэшткам	Расход	Рэштак
Эканамічны капітал	1017,38	5837,39	6854,78	6533,66	321,11
Сумы дзяржаўнага казначэйства	231,23	221,3	452,54	445,04	7,5
Разам	8938,76	73232,26	82178,02	72579,29	9598,73
На ўтрыманне студэнтаў і вучняў		9958,14	9958,14	9685,05	273,08
Засталося пасля ўладкавання гадавальніка грашыма	148,71		148,71		148,71
Засталося пасля ўладкавання гадавальніка білетамі	669,85		669,85		669,85
На ўтрыманне коннага завода	103,66	1308,54	1412,21	1270,8	141,4
На рамонт будынкаў	381,71	1582,37	1964,08	1964,08	
На пабудову павецяў	25,84		25,84	25,84	
На асушэнне балот	158,04	1633,33	1791,37	1791,37	
Разам грашыма	3163,84	85782,1	88945,95	85565,64	3380,31
Разам білетамі	7262,74	1939,56	9202,3	1750,83	7451,47
Разам грашыма і білетамі	10426,58	87721,66	98148,25	87316,47	10831,78

З даных каштарысаў за 1857 і 1858 гг. відаць, што асноўныя крыніцы даходаў земляробчага інстытута ўключалі сумы штатныя, якія паступалі з Міністэрства дзяржмаёмасцей, з дадаткам водпуску з дзяржаўнага казначэйства, сумы устаноў і асоб грашыма і часткова білетамі дзяржаўнага казначэйства, грашовыя сродкі эканамічнага капіталу. У структуры грашовых паступленняў за 1858 г. асноўнае месца займала штатная сума (з рэшткам) у 43359,49 руб. (52,8%), з дадаткам 31511,21 руб. сумы розных устаноў і асоб грашыма і білетамі (38,3%), 6854,78 руб. эканамічнага капіталу (8,3%) і 452,54 руб. (0,6%) сумы

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

дзяржаўнага казначэйства. Амаль уся штатная сума выплачвалася: у 1856 г. з прызначаных па штату 35368,07 руб. было выдаткавана 34392 руб. (97,2%), а ў 1858 г. усе грошы [26, арк. 534 адв.–535 адв.]. Па-ранейшаму часта сумы заставалася незапатрабаванай і пераходзіла ў рэштак (у 1858 г. 10831,78 руб., ці 11% прыходу з рэшткам), а частка фінансавых сродкаў адлічалася для пабудовы, рамонту і ўладкавання, утрымання будынкаў рознага прызначэння.

У канцы 1850-х гг. усе штатныя вакансіі ў земляробчым інстытуце былі занятыя і нават пераўзыходзілі штатныя пасады (гл. табл. 3).

Табліца 3. – Штатны і наяўны асабовы склад земляробчага інстытута ў 1857 і 1858 гг., чал. [27, арк. 15–16 адв.].

Пасады	Штатныя	У наяўнасці	
	1848	1857	1858
Дырэктар	1	1	1
Богаслужэбная частка	2	3	3
Вучэбная частка	14	19	18
Пры вучэбных установах	2	3	4
Паліцэйская і гаспадарчая частка	8	13	12
Урачэбная частка	2	2	2
Разам з вучнямі у інстытуце		154	112
Разам з вучнямі ў вучылішчы		68	62
Прыслугі		67	70

Але частка выкладчыкаў сумяшчала некалькі пасад. Летам 1858 г. член вучонага камітэта стацкі саветнік А.М. Ламоўскі, які рэвізаваў земляробчы інстытут, адзначыў, што прафесары выкладалі некалькі прадметаў (разам у інстытуце іх выкладалася да 40) і «оставляют свои специальности, не занимаются наукою, погрязают в рутине учебной жизни, и конечно, теряют и знание и энергию» [1, с. 60–61].

Вольныя студэнты пры поўным утрыманні і карыстанні ўсімі навучальнымі дапаможнікамі плацілі толькі 125 руб. серабром у год [28, с. 8] – менш, чым у сталічных вузах. Выпускнікі маглі карыстацца ўрадавай грашовай дапамогай, якая праўда часта замянялася натуральнымі рэчамі. Так, першыя 38 выпускнікоў з Горы-Горацкай вучэбнай фермы ў 1850 г. атрымалі замест 400 руб. дапамогі (2 чал. па 42,5 руб., 13 чал. па 12,5 руб., 13 чал. па

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

8,4 руб., 10 чал. па 4,33 руб.) насення на 270,62 руб. і кніг на 31,4 руб. і інш. [29, с. 25]. Згодна з імянным імператарскім указам ад 4.10.1854 г. выпускнікі Горы-Горацкага земляробчага інстытута з ліку свае(уласна)коштных студэнтаў, пры ўмове службы па Міністэрству дзяржмаёмасцей не менш 3 гадоў, мелі права на прызначэнне дапамогі: на атрыманне з дзяржаўнай казны прагонных грошай да месца прызначэння, па 70 руб. на адзенне і 200 руб. жалавання на год з дня вызначэння на службу да закрыцця штатных вакансій ці паступовага замяшчэння штатных пасад. Гэтыя сумы залічваліся расходам на агульныя рэшткі ад штатных сум губернскага кіравання дзяржмаёмасцей, утрымліваемага на рахунак грамадскага сялянскага збору. Пры пакіданні службы раней 3-гадавога тэрміну, былыя студэнты павінны былі вярнуць палову асігнаванай ім сумы [30, с. 799]. У канцы 1859 г. студэнтам-стыпендыятам земляробчага інстытута з Каўказа былі павялічаны стыпендыі з 150 да 300 руб. у год кожнаму, сума на якія адпускалася з дзяржаўнага казначэйства [31]. У жніўні 1859 г. студэнты інстытута, як каморнікі і таксатары, займелі права знаходжання на вольных кватэрах з выдачай сум на пражыццё на рукі наяўнымі грашыма [32, арк. 3 адв.].

У снежні 1858 г. было прынята рашэнне аб адкрыцці пры земляробчым інстытуце класу для навучання прыватных землямераў і таксатараў, на які выдаткоўвалася 8370 руб. штогод [33; 34, приложения, с. 23]. Лепшыя вучні да 16-гадавога ўзросту землямерна-таксатарскіх класаў пры земляробчым вучылішчы атрымлівалі стыпендыі ад 60 да 120 руб. у год, на выдачу якіх асігнавалася штогод сума ў 6000 руб. [15, с. 89].

Земляробчы інстытут з правамі поўнага ўніверсітэта меў па сутнасці толькі адзін сельскагаспадарчы факультэт з 4-гадавым тэрмінам навучання студэнтаў. У выніку рэарганізацыі навучальнага працэсу ў снежні 1859 г. прадугледжвалася 3-гадавая падрыхтоўка спецыялістаў-аграномаў вузкага профілю, а 6-класнае земляробчае вучылішча павінна было даваць выхаванцам сярэднеспецыяльную адукацыю паводле гімназічнай праграмы. Новае вышэй зацверджанае палажэнне ад 8.12.1859 г. аб Горы-Горацкім земляробчым інстытуце з земляробчым вучылішчам пры ім даводзіла, што з сумы ў 60400 руб. на

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

ўтрыманне інстытута і вучылішча з дзяржаўнага казначэйства адпускалася сума ў 38580 руб. (63,9%), а астатнія 21820 руб. (36,1%) выдаткоўваліся з гаспадарчага капіталу Міністэрства дзяржаўных маёмасцей [35, с. 329].

Згодна з новым штатам асобна на земляробчы інстытут асігнавалася 51300 руб. На адміністрацыйную частку ў земляробчым інстытуце (дырэктару, дабавачных прафесару, абранаму на пасаду дэкана і інспектара вучэбнай часткі, аднаму з прафесараў ці ад'юнктаў, абранаму на пасаду члена праўлення, аднаму з ад'юнктаў, абраных на пасаду сакратара савета, за кіраўніцтва будаўнічай часткай, сакратару праўлення, бухгалтару, экзекутару і адначасова казначэю, на наём пісараў і канцылярскія выдаткі) адпускалася 7060 руб. (13,8%). Выкладчыкам (6 прафесарам, 5 ад'юнктам, праваслаўнаму законанастаўніку, за выкладанне рымска-каталіцкага закона, выкладчыку здымкі зямель, настаўніку малявання і чарчэння, лабаранту пры вучэбнай і даведачнай хімічнай лабараторыі, 2 лектарам французскай і нямецкай моў, дадатковых упраўляючаму фермай за практычныя практыкаванні ў сельскай гаспадарцы студэнтаў і вучняў, садоўніку і яго памочніку) адлічалася 18200 руб. (35,5%). Выхавальнікам (інспектару і 2 наглядчыкам над студэнтамі) выплачвалася 1700 руб. (3,3%). На ўтрыманне студэнтаў (на выдачу стыпендый 25 казённым студэнтам (па 150 руб. кожнаму), узнагароджванне іх медалямі, на экскурсіі па сумежных з Магілёўскай губернях і па ваколіцах інстытута) выкарыстоўвалася 4500 руб. (8,8%). На дапаможны службовы персанал (урачу пры інстытуце і вучылішчы, фельчару, дыякану, псаломшчыку, лютэранскаму пастару за выкананне трэб, наём служыцелей і вартавых у інстытуце і вучылішчы) выдаткоўвалася 4120 руб. (8%). Розныя гаспадарчыя патрэбы (на бальніцу і медыкаменты, царкву, утрыманне вучэбнай і даведачнай хімічнай лабараторыі, метэрыялагічнай абсерваторыі і фізічнага кабінета, на бібліятэку, мадэлі, інструменты, папаўненне калекцый і выпіску перыядычных выданняў, выданне запісак інстытута, друк праграм, каталогаў, табеляў і інш., асвятленне, ацяпленне, утрыманне ў чысціні інстытуцкіх пабудоваў, рамонт будынкаў і мэблі у інстытуце і вучылішчы, утрыманне 8 рабочых коней, саду, гадавальніка, цяпліц, на выдачу кватэрных грошай чынам інстытута, дробныя і

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

экстраардынарныя выдаткі) паглыналі 15720 руб. (30,6%). Асобная штатная сума ўтрымання земляробчага вучылішча склала 9100 руб., з якіх інспектар з прафесараў, ад'юнктаў ці іншых выкладчыкаў інстытута і вучылішча атрымліваў 300 руб. дадатковых (3,3%), 2 старшых і малодшы настаўнікі – 1960 руб. (21,6%), 2 рэпетытары і наглядчыкі – 720 руб. (7,9%). На ўтрыманне 60 казённых вучняў асігнавалася 5400 руб., ці па 90 руб. на кожнага (59,3%). На набыццё навучальных дапаможнікаў, выпіску перыядычных выданняў і інш. выплачвалі 200 руб. (2,2%), ацяпленне і асвятленне будынка – 400 руб. (4,4%), для выдачы ўзнагарод выхаванцам – 120 руб. (1,3%) [35, с. 500–502]. Сумы запаснога капіталу дазвалялася адпраўляць у крэдытныя ўстановы для росту працэнтамі ці выкарыстоўваць на пакупку крэдытных папер, і з дазволу міністра дзяржаўных маёмасцей на значны рамонт будынкаў інстытута, на вандроўкі прафесараў за мяжу, на пасылку лепшых студэнтаў для ўдасканалення ў агранамічных навуках.

У цэлым, па ўзроўні з мінулым штатным роспісам утрыманне Горы-Горацкага земляробчага інстытута з вучылішчам вырасла з 38580 руб. да 60400 руб., ці больш чым у 1,5 разы. Паменшылася ўдзельная вага грашовых асігнаванняў на адміністрацыю (з 13,5 да 12,2%) і на гаспадарчыя патрэбы (з 39,3 да 27%). Вырасла адносная доля штатных расходаў на забеспячэнне дзейнасці выкладчыцкага корпуса (з 29,2% да 33,4%), выхавальнікаў (з 1,8 да 4,0%), утрыманне навучэнцаў (з 13,1 да 16,6%), дапаможны адміністрацыйна-гаспадарчы персанал (з 3,1 да 6,8%).

Утрыманне старшага прафесара на пасадзе 7-га класа (1150 руб. жалавання і 250 руб. сталовых) не змянілася (малодшыя прафесары па пасадзе 8-га класа мелі 1080 руб. жалавання і 200 руб. сталовых), а ад'юнкта нязначна павялічылася (з 600 да 750 руб. жалавання пры 150 руб. сталовых). Штатная колькасць прафесараў і ад'юнктаў у земляробчым інстытуце павялічылася з 7 да 11, і адпаведна супольная сума іх утрымання з 6100 да 12900 руб. Паводле асобных вышэйшых загадаў ад 27.02. і 15.06.1861 г. было дадаткова прызначана выплаціць 2400 руб. на ўтрыманне ў земляробчым інстытуце 6 прыват-дацэнтаў, а 1200 руб. прызначаліся для дадатковага ўтрымання некаторых выкладчыкаў [12, с. 33]. Агулам, прафесарска-выкладчыцкі штат павялічыўся ў 1,5 разы, а сумы яго ўтрымання больш чым у 2

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

разы. Паводле вышэй зацверджанага 20.02.1861 г. дакладу міністра дзяржмаёмасцей аб павелічэнні ўтрымання прафесарам і выкладчыкам Горы-Горацкага земляробчага інстытута выдатнейшым педагогам маглі выдаваць дадаткова паўгадавы аклад па меркаванні міністра і гадавы пасля асобнага дакладу імператару на кошт гаспадарчага капіталу Міністэрства дзяржмаёмасцей [34, с. 108].

Шэраг асобных узаканенняў датычыўся асобных выплат навучэнцам. Камплект абмундзіравання пансіянера каштаваў 4,35 руб. [36, арк. 9, 26 адв., 29–30]. Яны карысталіся сталовай, лазарэтам, лазняй (пабудавана ў лістападзе 1851 г.). Указам ад 8.01.1861 г. было прадпісана штогод рыхтаваць 130 хлопчыкаў з дзяржаўных сялян, 1/4 частка якіх штогод прызначалася да выпуску. Таму задзельная плата выпускнікам вызначалася ў 825 руб. Па разліку на Горы-Горацкую ферму неабходна было асігнаваць 5055 руб. [34, приложения, с. 24–25]. 11.12.1861 г. імператарам быў зацверджаны даклад міністра дзяржмаёмасцей аб асігнаванні 1000 руб. на выдачу стыпендый для першапачатковага навучання малалетніх дзяцей у Горках. Справа ў тым, што прафесары і служачыя для навучання сваіх дзяцей адкрылі ў 1857 г. хатнюю школу. За навучанне ў школе дзяцей кіраўніку школы плацілі 50 руб. штогод за кожнага выхаванца на кошт рэшткаў сум Горацкіх навучальных устаноў [34, с. 115–116].

Паводле вышэй зацверджанага 8.03.1860 г. роспісу выдаткаў у 1860 г з Магілёўскай казёнай палаты было прызначана выплаціць на ўтрыманне Горы-Горацкага земляробчага інстытута, за вылікам на пенсіі 265,7 руб. і на карысць інвалідаў 35,8 руб., 38278,5 руб., з дадаткам утрымання 5 стыпендыятаў з Каўказа ў 750 руб., разам 39028,5 руб. З Аршанскага павятовага казначэйства было пералічана на студзеньскую трэць 9498,69 руб., майскую і вераснёўскую – 37598,97 руб., з якіх на ўтрыманне вучэбнай фермы было выдана 3370 руб., яе выхаванцаў – 4333,33 руб., на класы для землямераў і таксатараў – 5580 руб., на дабавачнае ўтрыманне інстытута і вучылішча па новаму штату – 21820 руб., на ўладкаванне хімічнай лабараторыі – 2000 руб. і інш., вераснёўскую трэць яшчэ 1099,37 руб. [37, арк. 14–15, 56–57, 89–90, 99–100, 104–105, 135–135 адв., 143].

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

У апошнія гады існавання земляробчага інстытута ў Горках працягвалася практыка прызначэння сум для ўладкавання асобных аб'ектаў. У 1859 г. міністр дзяржмаёмасцей М.М. Мураўёў зацвердзіў устаў інстытуцкага клуба, членамі якога маглі быць прафесары, студэнты, чыноўнікі і памешчыкі з гадавой платай са служачых па 6 руб., са студэнтаў – па 4 руб. з асобы штогод. На яго першапачатковае ўладкаванне адлічалася 1000 руб. Клуб быў адкрыты 5.02.1860 г. На ўладкаванне адкрытых вясной 1861 г. пладовага саду і гадавальніка было прызначана да выдачы 2400 руб. У 1861 г. па хадайніцтву Савета інстытута на новы сельскагаспадарчы музей пры інстытуце было асігнавана 2840 руб. У гэтым жа 1861 г. па ініцыятыве М.М. Мураўёва на рэшткі сумы да 1000 руб. было дазволена адкрыць школу для першапачатковага навучання служачых пры інстытуце. Асобныя сумы адпускаліся да канца 1863 г. на набыццё калекцый сельскагаспадарчых машын і прылад. Загадам ад 12.02.1862 г. было выдзелена 5000 руб. на ўтрыманне пры інстытуце конскага завода [12, с. 33, 35].

Паводле апошняга каштарысу на 1863 г. прапанавалі прызначыць на ўтрыманне Горы-Горацкага інстытута 76110 руб. (сапраўды асігнавана да выдачы 65300 руб.) [34, приложения, с. 37–38]. Асобныя сумы паступалі з гаспадарчага капіталу Міністэрства дзяржмаёмасцей. Усе выдаткі, уключаючы гаспадарчы капітал, гэтай навучальнай установы даходзілі да 74900 руб. штогод [38, с. 103–104; 12, с. 34].

Прыкладная сума выдаткаў з 1836 да 1862 гг. на патрэбы земляробчага інстытута, земляробчага вучылішча і вучэбнай фермы ў Горы-Горках склала 1 023 000 руб. (гл. табл. 4).

Табліца 4. – Дынаміка выдаткаў для забеспячэння дзейнасці земляробчага інстытута, земляробчага вучылішча і вучэбнай фермы ў Горы-Горках за 1836–1862 гг.

Час	Прадметы выдаткаў	Руб.
1836–1839	Уладкаванне маёнткаў і пабудова будынкаў	296000
1840–1844	Утрыманне земляробчай школы і ўзорнай запашкі	219000
1845–1859	На інстытут, вучылішча, ферму	247000
1860–1862	На інстытут, вучылішча і ферму	247000
1850–1862	На конскі завод і іншыя выдаткі	14000
Разам		1023000

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Разам, уключаючы страту арэнднай платы з маёнтка і аброчных галін, сума расходаў дасягала больш 1,5 млн. руб. [1, с. 82].

Адзначым, што не ўсе практычна-навуковыя цэнтры пры земляробчым інстытуце, зыходзячы з характару задач іх дзейнасці, былі самаакупнымі. Так, эксперыментальная вучэбная ферма пры Горы-Горацкім земляробчым інстытуце за 1854–1861 гг. пры агульным расходзе ў 73158 руб. на ўтрыманне выхаванцаў затраціла на вядзенне гаспадаркі 46536 руб., і мела толькі 36643 руб. даходу ад сельскагаспадарчай вытворчасці, г.зн. заставалася ў цэлым нерэнтабельнай (за выключэннем 1855 і 1860 гг.) (гл. табл. 5).

Табліца 5. – Даходы і расходы сельскагаспадарчай фермы пры Горы-Горацкім земляробчым інстытуце ў 1854–1861 гг., руб. [39, с. 29].

Год	Расходы		Даходы ад гаспадаркі
	На ўтрыманне выхаванцаў	На вядзенне гаспадаркі	
1854	9252	6609	2639
1855	11089	5222	5846
1856	10567	5006	4967
1857	12854	5070	3873
1858	7402	5324	3529
1859	7243	8876	5377
1860	7360	6074	5672
1861	7391	4355	4740
Разам	73158	46536	36643

У цэлым, Горы-Горацкі земляробчы інстытут быў агульнадзяржаўным спецыяльным цэнтрам аграрнай адукацыі і навукі для ўсёй Расійскай імперыі, а не толькі беларуска-літоўскіх губерняў. Так, у 1857–1858 навучальным годзе ў земляробчым інстытуце з 157 студэнтаў з 40 губерняў імператарскай Расіі было 19 казённакоштных (1 з Гродзенскай і 2 з Магілёўскай губерняў), 7 пансіянераў духоўнага ведамства (2 з Магілёўскай губерні), 2 прадстаўніка з Вольнага эканамічнага таварыства (1 з Віцебскай губерні), 2 каўказскіх выхадцаў, па 1 з сельскагаспадарчага таварыства Паўднёвай Расіі і Міністэрства народнай асветы, 26 сваекоштных (з Віцебскай і Ковенскай губерняў па 1, з Магілёўскай – 2), 99 вольнапрыходзячых (з

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Віленскай і Гродзенскай губерняў па 1, Віцебскай – 13, Ковенскай – 2, Мінскай – 3, Магілёўскай – 22) [40, с. 56–59]. Такім чынам, у земляробчым інстытуце было 49 прадстаўнікоў з 5 беларускіх губерняў, ці 31,2% студэнтаў. Да 1861 г. з 162 студэнтаў і слухачоў Горы-Горацкага земляробчага інстытута з Магілёўскай губерні паходзілі 32, Віцебскай – 9, Гродзенскай – 6, Віленскай і Мінскай – па 4, Ковенскай – 3, Смаленскай – 12, альбо разам з 6 беларуска-літоўскіх губерняў 58 чал. (35,8%) [38, с. 143–144]. У адрозненне ад земляробчага інстытута, адносная большасць навучэнцаў у сярэдніх сельскагаспадарчых навучальных установах, на якія прыпадаў асноўны кантынгент навучэнцаў, складалі мясцовыя ўраджэнцы беларуска-літоўскага краю і суседніх з нім раёнаў. У земляробчай школе ў 1857–1858 навучальным годзе вучыўся 41 ураджэнец з беларускіх губерняў, альбо 57,7% выхаванцаў [40, с. 91–92]. У земляробчае вучылішча з 1849 па 1864 гг. быў уключаны 221 чал., землямерна-таксатарскія класы з 1859 па 1864 гг. – 72 землямеры і таксатары, вучэбную ферму з 1845 па 1864 гг. – 528 выхаванцаў, у школу аўчароў з 1850 па 1864 гг. – 62 асобы [41, арк. 62]. З 490 выпускнікоў вышэйшага разраду земляробчай школы і студэнтаў земляробчага інстытута ў 1844–1863 гг. 55% вучыліся за ўласны кошт, 23,8 % – за кошт Міністэрства дзяржмаёмасцей, 16% – духоўнага ведамства, 3% – Вольнага эканамічнага таварыства, 1,4% – Каўказскага сельскагаспадарчага таварыства, 0,6% – сельскагаспадарчага таварыства Паўднёвай Расіі, 0,2% – Міністэрства народнай асветы [42].

Такім чынам, Горы-Горацкі земляробчы інстытут ведамства Міністэрства дзяржаўных маёмасцей – першы і адзіны ў імператарскай Расіі цэнтр вышэйшай спецыяльнай сельскагаспадарчай адукацыі і аграрнай навукі агульнадзяржаўнага значэння – з падпарадкаванымі яму земляробчым вучылішчам, вучэбнай фермай, землямерна-таксатарскімі класамі, школай аўчароў меў розныя крыніцы даходных паступленняў, і з канца 1850-х гг. атрымліваў сумы галоўным чынам з дзяржаўнага казначэйства і з гаспадарчага капіталу Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. У структуры даходаў розных відаў грашовых прыбыткаў, асноўныя сумы прыходу грошай уключалі не толькі штатныя сумы, але і фінансавыя сродкі розных устаноў і асоб (частка прыбывала

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

грашыма, частка – білетамі дзяржаўнага казначэйства), грашовыя рэсурсы гаспадарчага (эканамічнага) і дадатковага капіталу з рэшткаў штатных і іншых незапатрабаваных сум мінулых гадоў. Пры ўсёй складанасці ўліку спосабаў папаўнення даходнай часткі і разнастайнасці прадметаў выдаткаў земляробчага інстытута з іншымі сельскагаспадарчымі школамі ў яго юрысдыкцыі, тым не менш магчыма заключыць, што сума выдаткаў на гэтыя навучальныя ўстановы аграрнага профілю з канца 1840-х да пачатку 1860-х гг. вырасла не менш чым у 1,5 разы, прычым назіралася тэндэнцыя да памяншэння адноснай долі грашовых адлічэнняў для задавальнення дзейнасці кіраўніцкай адміністрацыі і гаспадарчых патрэб пры адначасовым росце ўдзельнай вагі штатных расходаў фінансавых рэсурсаў для забеспячэння працы адукацыйна-выхавальніцкага і дапаможнага адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу і для паляпшэння ўтрымання навучэнцаў.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Мещерский, И. И. Высшее сельскохозяйственное образование в России и заграницей / И. И. Мещерский. – СПб. : Тип. В. Киршбаума, 1893. – XXIV, 403, XXXVII с.
2. Об усилении способов Вольного экономического общества : утв. 14 нояб.1833 г. // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : в 55 т. – СПб., 1833. – Т. 8, отд-ние 1. – № 6567. – С. 657–662.
3. Вешняков, В. И. Комитет 1833 года об усовершенствовании земледелия в России / В. И. Вешняков // Рус. вестн. – 1869. – Т. 82, № 7. – С. 286–320.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 9047.
5. Цитович, С. Г. Горыгорецкий земледельческий институт – первая в России высшая сельскохозяйственная школа (1836–1864) / С. Г. Цитович. – Горки : Изд. Белорус. с.-х. акад., 1960. – 276 с.
6. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 542.
7. НГАБ. – Ф. 3157. Воп. 1. Спр. 426.
8. Высочайше утверждённое положение о Горыгорецкой земледельческой школе, распубликованное 22 мая // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : в 55 т. – СПб., 1836. – Т. 11, отд-ние 1. – № 9097. – С. 435–443.
9. НГАБ. – Ф. 2259. Воп. 1. Спр. 25.
10. О увеличении оклада жалованья директору Горыгорецкой земледельческой школы : утв. 3 янв. докл. зап. Министра гос. имуществ // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2. Дополнение к собранию. – СПб., 1844. – Ч. 2, доп. к т. 19. – № 17479 а. – С. 3.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

11. Обзор действий Департамента сельского хозяйства и очерк состояния главных отраслей сельской промышленности в России в течение 10 лет с 1844 по 1854 г. – СПб. : Тип. Имп. Акад. наук, 1855. – Отд. 2. – 705 с.
12. Гудков, Н. А. Краткий исторический очерк Горецких учебных заведений / Н. А. Гудков. – Орша : Тип. Я. Н. Подземского, 1890. – 45 с.
13. НГАБ. – Ф. 3293. Воп. 1. Спр. 23.
14. Летопись Белорусской государственной сельскохозяйственной академии (1840–2020 гг.) / Белорус. гос. с.-х акад. ; сост.: А. А. Герасимович, Н. А. Глушакова, В. М. Лившиц ; гл. ред. В. В. Великанов. – Гомель : Вечерний Гомель-Медиа, 2020. – 220 с.
15. Пономарёв, Н. В. Исторический обзор правительственных мероприятий к развитию селького хозяйства в России от начала государства до настоящего времени / Н. В. Пономарёв. – СПб. : Тип. В. Киршбаума, 1888. – XXIV, 402, 9 с.
16. НГАБ. – Ф. 2259. Воп. 1. Спр. 27.
17. НГАБ. – Ф. 2259. Воп. 1. Спр. 24.
18. О дополнительном постановлении к положению о Горыгорецкой земледельческой школе : сенат. указ 17 февр. 1842 г. // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : в 55 т. – СПб., 1842. – Т. 17, отд-ние 1. – № 15303. – С. 96.
19. Лившиц, В. М. Горы-Горецкий земледельческий институт (1836–1864 гг.): выдающиеся учёные и профессора / В. М. Лившиц, В. В. Немыкин, А. Р. Цыганов. – Горки : [б. и.], 1999. – 168 с.
20. Марченко, Т. Н. Становление Горыгорецкой земледельческой школы как высшего аграрного учебного заведения (1840–1848 гг.) / Т. Н. Марченко // Вестн. МГИРО. – 2014. – № 4(19). – С. 38–42.
21. Кузьмин, Н. Н. Низшее и среднее специальное образование в дореволюционной России / Н. Н. Кузьмин. – Челябинск : Юж -Урал. кн. изд-во, 1971. – 280 с.
22. НГАБ. – Ф. 2259. Воп. 1. Спр. 660.
23. Высочайше утвержденное положение об учреждении учебных ферм : утв. 28 мая 1841 г. // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : в 55 т. – СПб., 1841 – Т. 16, отд-ние 1. – № 14585. – С. 407–415 ; Т. 16, отд-ние 2. – К № 14585. – С. 117.
24. Высочайше утверждённое положение о Горыгорецком земледельческом институте и состоящих при нём земледельческом училище и учебной ферме : утв. 30 июня 1848 г. // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : в 55 т. – СПб., 1848. – Т. 23, отд-ние 1. – № 22414. – С. 455–463 ; Т. 23, отд-ние 2. – К № 22414. – С. 137–139.
25. НГАБ. – Ф. 2259. Воп. 1. Спр. 1205.
26. НГАБ. – Ф. 2259. Воп. 1. Спр. 1511.
27. НГАБ. – Ф. 2259. Воп. 1. Спр. 1622.
28. Боборыкин, В. Поездка в Горыгорецкий институт / В. Боборыкин. – М. : Унив. тип., 1857. – 16 с.
29. Первый выпуск воспитанников из Горыгорецкой учебной фермы в 1850 г. // Журн. М-ва гос. имуществ. – 1850. – Ч. 35, № 4–6. – С. 25.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

30. О назначении пособий своекоштным студентам Горыгорецкого земледельческого института при определении их на службу по Министерству государственных имуществ : именной указ 4 окт. 1854 г., объявл. Сенату Министром гос. имуществ // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : в 55 т. – СПб., 1854. – Т. 29, отд-ние 1. – № 28598. – С. 799.

31. Об увеличении размера стипендий студентам Горыгорецкого земледельческого института из кавказских воспитанников : именной указ 21 окт. 1859 г., объявл. Министру финансов председателем Кавк. ком. // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : в 55 т. – СПб., 1854. – Т. 34, отд-ние 2. – № 35011. – С. 175; О замене 5 вакансий казённых кавказских воспитанников Горыгорецкого земледельческого института тем же числом стипендиатов : имен. указ 7 июня 1859 г., объявл. члену Кавк. ком. // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : в 55 т. – СПб., 1854. – Т. 34, отд-ние 1. – № 34588. – С. 551.

32. НГАБ. – Ф. 2259. Воп. 1. Спр. 1666.

33. Высочайше утверждённый проект Положения о классах для образования частных землемеров и таксаторов при институтах: Константиновском межевом и Горыгорецком земледельческом : утв. 15 дек. 1858 г. // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : в 55 т. – СПб., 1858. – Т. 33, отд-ние 2. – № 33904. – С. 496–498 ; Т. 33, отд-ние 3. – К № 33904. – С. 408.

34. Сборник сведений по сельскохозяйственному образованию. – СПб. : Тип. В. Киршбаума, 1900. – Вып. 3 : Постановления по сельскохозяйственным учебным заведениям за время 1836–1899 гг. – XXIII, 415, 86 с.

35. Высочайше утверждённое положение о Горыгорецком земледельческом институте и состоящем при нём земледельческом училище : утв. 8 дек. 1859 г. // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : в 55 т. – СПб., 1859. – Т. 34, отд-ние 2. – № 35220. – С. 328–340; Т. 34, отд-ние 2. – К № 35220. – С. 500–502.

36. НГАБ. – Ф. 2259. Воп. 1. Спр. 1833.

37. НГАБ. – Ф. 2259. Воп. 1. Спр. 1636.

38. Москальский, Н. Горыгорецкий и Санкт-Петербургский земледельческие институты / Н. Москальский // Сборник сведений по Департаменту земледелия и сельской промышленности. – СПб. : Тип. В. Киршбаума, 1880. – Вып. 2. – С. 97–150.

39. Историческое обозрение пятидесятилетней деятельности Министерства государственных имуществ 1837–1887 гг. : в 5 ч. – СПб. : Тип. Киршбаума, Я. И. Либермана, 1888. – Ч. 4 : Сельское хозяйство. Коннозаводство. – 465 с.

40. Маслов, С. Обозрение Горыгорецкого земледельческого института / С. Маслов // Журн. сел. хоз-ва. – 1857. – № 11. – С. 33–65; № 12. – С. 91–106.

41. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 949.

42. Чем занимаются студенты бывшего Горыгорецкого земледельческого института // Журн. М-ва гос. имуществ. – 1864. – Ч. 87, № 9. – С. 90.

References:

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

1. Meshcherskii I. I. *Higher agricultural education in Russia and abroad*. St. Petersburg, V. Kirshbaum Publ., 1893. XXIV, 403, XXXVII p. (in Russian).
2. On strengthening the methods of the Free Economic Society: approved on November 14, 1833. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2. T. 8, ch. 1* [Complete collection of laws of the Russian Empire. Collection 2. Vol. 8, pt. 1]. St. Petersburg, 1833, pp. 657–662 (in Russian).
3. Veshnyakov V. I. Committee of the year of 1833 on the improvement of agriculture in Russia. *Russkii vestnik* [Russian Bulletin], 1869, vol. 82, no. 7, pp. 286–320 (in Russian).
4. *National Historical Archives of Belarus (NGAB)*. F. 1297. Vol. 1. Ref. 9047. (in Belarusian).
5. Tsitovich S. G. *Gorygoretsky Agricultural Institute – the first higher agricultural school in Russia (1836–1864)*. Gorki, Publication of the Belarusian Agricultural Academy, 1960. 276 p. (in Russian).
6. *National Historical Archives of Belarus.* F. 295. Vol. 1. Ref. 542. (in Belarusian).
7. *National Historical Archives of Belarus*. F. 3157. Vol. 1. Ref. 426. (in Belarusian).
8. Regulations on the Gorygoretsky Land School approved by the highest authority, published on May 22. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2. T. 11, ch. 1* [Complete collection of laws of the Russian Empire. Collection 2. Vol. 11, pt. 1]. St. Petersburg, 1836, pp. 435–443 (in Russian).
9. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2259. Vol. 1. Ref. 25. (in Belarusian).
10. On increasing the salary of the headmaster of the Gorygoretsky agricultural school: memorandum of the Minister of State Property, approved on January 3, 1844. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2. Dopolnenie k sobraniyu* [Complete collection of laws of the Russian Empire. Collection 2. Addendum to the collection]. St. Petersburg, 1844, pt. 2, to 19 vol., p. 3 (in Russian).
11. *Review of the actions of the Department of Agriculture and an outline of the state of the main branches of rural industry in Russia for 10 years from 1844 to 1854*. St. Petersburg, Printing house of the Imperial Academy of Sciences, 1855, dept. 2. 705 p. (in Russian).
12. Gudkov N. A. *Brief historical sketch of the Gorecki educational institutions*. Orsha, Ya. N. Podzemskii Publ., 1890. 45 p. (in Russian).
13. *National Historical Archives of Belarus*. F. 3293. Vol. 1. Ref. 23. (in Belarusian).
14. Gerasimovich A. A., Glushakova N. A., Livshits V. M. (comp.). *Chronicle of the Belarusian State Agricultural Academy (1840–2020)*. Gomel, Vechernii Gomel'-Media Publ., 2020. 220 p. (in Russian).
15. Ponomarev N. V. *Historical review of governmental measures for the development of agriculture in Russia from the beginning of the state to the present time*. St. Petersburg, V. Kirshbaum Publ., 1888. XXIV, 402, 9 p. (in Russian).
16. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2259. Vol. 1. Ref. 27. (in Belarusian).
17. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2259. Vol. 1. Ref. 24. (in Belarusian).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

18. On an additional resolution to the regulation on the Gorygoretsky agricultural school. Senate decree of February 17. 1842. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2. T. 17, ch. 1* [Complete collection of laws of the Russian Empire. Collection 2. Vol. 17, pt. 1]. St. Petersburg, 1842, p. 96 (in Russian).

19. Livshits V. M., Nemykin V. V., Tsyganov A. R. *Gory-Goretsky Agricultural Institute (1836–1864): outstanding scientists and professors*. Gorki, 1999. 168 p. (in Russian).

20. Marchenko T. The Developing of Gorygoretskaya Agricultural School as a Higher Agricultural Institution (1840–1848 years). *Vestnik MGIRO = MSIDE Newsteller*, 2014, no. 4 (19), pp. 38–42 (in Russian).

21. Kuz'min N. N. *Lower and secondary specialised education in pre-revolutionary Russia*. Chelyabinsk, South Ural Book Publishing House, 1971. 280 p. (in Russian).

22. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2259. Vol. 1. Ref. 660. (in Belarusian).

23. Regulations on the establishment of educational farms approved by the highest authority, approved on May 28, 1841. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2* [Complete collection of laws of the Russian Empire. Collection 2]. St. Petersburg, 1841, vol. 16, pt. 1, pp. 407–415 ; vol. 16, pt. 2, to No. 14585, p. 117. (in Russian).

24. Regulations on the Gorygoretsky Agricultural Institute and the Agricultural School and Educational Farm attached to it approved by the highest authority, approved on June 30, 1848. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2* [Complete collection of laws of the Russian Empire. Collection 2]. St. Petersburg, 1848, vol. 23, pt. 1, pp. 455–463 ; vol. 23, pt. 2, to No. 22414, pp. 137–139. (in Russian).

25. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2259. Vol. 1. Ref. 1205. (in Belarusian).

26. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2259. Vol. 1. Ref. 1511. (in Belarusian).

27. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2259. Vol. 1. Ref. 1622. (in Belarusian).

28. Boborykin V. V. *A trip to the Gorygoretsky Institute*. Moscow, University Printing House, 1857. 16 p. (in Russian).

29. The first graduation of students from the Gorygoretsk educational farm in 1850. *Zhurnal Ministerstva gosudarstvennykh imushchestv* [Journal of the Ministry of State Property], 1850, no. 4–6, p. 25 (in Russian).

30. On the assignment of allowances to the students of the Gorygorets Land Institute, who are on their own account, when they enter the service of the Ministry of State Property: personal decree of October 4, 1854, announced to the Senate by the Minister of State Property. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2. T. 29, ch. 1* [Complete collection of laws of the Russian Empire. Collection 2. Vol. 29, pt. 1]. St. Petersburg, 1854, p. 799 (in Russian).

31. On increasing the amount of scholarships for Caucasian students of the Gorygoretsky Agricultural Institute: a personal decree of October 21, 1859, announced to the Minister of Finance by the chairman of the Caucasian Committee. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2. T. 34, ch. 2* [Complete

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

collection of laws of the Russian Empire. Collection 2. Vol. 34, pt. 2]. St. Petersburg, 1859, p. 175 (in Russian); On replacing 5 vacancies of state-owned Caucasian students of the Gorygoretsky Agricultural Institute with the same number of scholarship holders: personal decree of June 7, 1859, announced to a member of the Caucasian Committee. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2. T. 34, ch. 1* [Complete collection of laws of the Russian Empire. Collection 2. Vol. 34, pt. 1]. St. Petersburg, 1859, p. 551 (in Russian).

32. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2259. Vol. 1. Ref. 1666. (in Belarusian).

33. Approved by the highest authority draft regulations on classes for education of private surveyors and tax collectors at the following institutes: Konstantinovsky Land Surveying Institute and Gorygoretsky Land Surveying Institute: approved on December 15, 1858. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2* [Complete collection of laws of the Russian Empire. Collection 2]. St. Petersburg, 1858, vol. 33, pt. 2, pp. 496–498 ; vol. 33, pt. 3, to No. 33904, p. 408. (in Russian).

34. *Compendium of information on agricultural education. Issue 3. Regulations on agricultural educational institutions for the period 1836–1899.* St. Petersburg, V. Kirshbaum Publ., 1900. XXIII, 415, 86 p. (in Russian).

35. Regulations on the Gorygoretsky Agricultural Institute and the Agricultural School attached to it approved by the highest authority: approved on December 8, 1859. *Polnoe sobranie zakonov Rossiiskoi imperii. Sobranie 2* [Complete collection of laws of the Russian Empire. Collection 2]. St. Petersburg, 1859, vol. 34, pt. 2, pp. 328–340 ; vol. 34, pt. 2, to No. 35220, pp. 500–502. (in Russian).

36. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2259. Vol. 1. Ref. 1833. (in Belarusian).

37. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2259. Vol. 1. Ref. 1636. (in Belarusian).

38. Moskal'skii N. Gorygoretsky and St. Petersburg Agricultural Institutes. *Compendium of information on the Department of Agriculture and Rural Industry. Issue 2*. St. Petersburg, V. Kirshbaum Publ., 1880, pp. 97–150 (in Russian).

39. *Historical review of fifty years of activity of the Ministry of State Property 1837–1887. Part 4. Agriculture. Horse breeding*. St. Petersburg, Kirshbaum Publ., Ya. I. Liberman Publ., 1888. 465 p. (in Russian).

40. Maslov S. Review of the Gorygoretsky Agricultural Institute. *Zhurnal sel'skogo khozyaistva* [Journal of Agriculture], 1857, no. 11, pp. 33–65 ; no. 12, pp. 91–106 (in Russian).

41. *National Historical Archives of Belarus*. F. 2001. Vol. 1. Ref. 949. (in Belarusian).

42. This is what the students of the former Gorygoretsky Agricultural Institute do. *Zhurnal Ministerstva gosudarstvennykh imushchestv* [Journal of the Ministry of State Property], 1864, no. 9, p. 90 (in Russian).

Дата паступлення артыкула 17.07.2023
Received 17.07.2023

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 378.663:635.012:001(476)(470+571)
https://doi.org/10.5281/zenodo.8333796

Л. И. Носевич

Научно-практический центр НАН Беларуси по картофелеводству и плодоовощеводству, Самохваловичи, Беларусь

«НЕ ПРИТАЩЕННАЯ» НАУКА: ИНСТИТУЦИАЛИЗАЦИЯ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ОПЫТНОГО ДЕЛА В РОССИИ И БЕЛАРУСИ

Аннотация. В статье раскрывается история становления и основные этапы деятельности опытного поля Горыгорецкого земледельческого института, описано его влияние на расширение научных исследований в области земледелия и растениеводства. Отражен решающий вклад профессоров и преподавателей института в создание четко работающего механизма функционирования опытного поля. Особо подчеркивается приоритет института в создании первого в мировой практике опытного поля, которое стало первым опытным учреждением в истории, организованном в высшем сельскохозяйственном учебном заведении и беспрерывно действовавшим на протяжении четверти века.

Ключевые слова: Горыгорецкий земледельческий институт, XIX век, высшее образование, сельскохозяйственная наука, история опытного поля, земледелие и растениеводство.

Для цитирования. Носевич, Л. И. «Не притащенная» наука: институциализация сельскохозяйственного опытного дела в России и Беларуси / Л. И. Носевич // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси, Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории, Науч. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 115–137.

Л. І. Насевіч

Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па бульбаводству і пладаагародніцтву, Самахвалавічы, Беларусь

«НЕ ПРЫЦЯГНУТАЯ» НАВУКА: ІНСТЫТУЦЫЯЛІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ДАСЛЕДЧАЙ СПРАВЫ Ў РАСІІ І БЕЛАРУСІ

Анатацыя. У артыкуле раскрываецца гісторыя станаўлення і асноўныя этапы дзейнасці даследчага поля Горыгорацкага земляробчага інстытута,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

апісаны яго уплыў на пашырэнне навуковых даследаванняў у галіне земляробства і раслінаводства. Адлюстраваны рашаючы ўклад прафесараў і выкладчыкаў інстытута ў стварэнне дакладнага механізма функцыянавання даследчага поля. Асабліва падкрэсліваецца прыярытэт інстытута ў стварэнни першага ў сусветнай практыцы даследчага поля, якое стала першай даследчай установай у гісторыі, арганізаванай у вышэйшай сельскагаспадарчай навучальнай установе і безперапынна дзейнічаючай на працягу чвэрці века.

Ключавыя словы: Горыгорацкі земляробчы інстытут, XIXст., вышэйшая адукацыя, сельскагаспадарчая навука, гісторыя даследчага поля, земляробства і раслінаводства.

Leonid I. Nosevich

Scientific and Practical Centre of the National Academy of Sciences of Belarus for Potato, Fruit and Vegetable Growing, Samokhvalovichi, Belarus

"NON-BROUGHT-IN" SCIENCE: INSTITUTIONALIZATION OF AGRICULTURAL EXPERIMENTATION IN RUSSIA AND BELARUS

Abstract. The article reveals the history of the formation and the main stages of the experimental field of the Gorygorki Agricultural Institute, describes its influence on the expansion of scientific research in the field of agriculture and crop production. The crucial contribution of professors and lecturers of the institute to the creation of a well-operating mechanism for the functioning of the experimental field is reflected. The priority of the institute is especially emphasized in creating the first experimental field in the world practice, which became the first experimental institution in history, organized in a higher agricultural educational institution and continuously operating for a quarter of a century.

Key words: Gorygoretski Agricultural Institute, XIX century, higher education, agricultural science, history of an experimental field, farming and crop production.

For citation. Nosevich L. I. "Non-brought-in" science: institutionalization of agricultural experimentation in Russia and Belarus. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the II International scientific conference dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023. Minsk, 2023, pp. 115–137 (in Russian).

Рассматривается, почему и как получилось, что сельскохозяйственное опытное дело оказалось не «притащенным» к нам из Западной Европы, а имеет российское происхождение. Отмечается главенствующая роль в его становлении и институциализации министра государственных имуществ графа П.Д. Киселева, ставшего «сиятельным патроном» Горыгорецкого земледельческого института, а также

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

определяющая роль профессоров и преподавателей института С.Ф. Федорова, Б.А. Целлинского, Б.А. Михельсона, И.А. Стебута в создании четкого механизма функционирования Горыгорецкого опытного поля. Отмечается вклад каждого из них в период широкого развития научных исследований в области земледелия и растениеводства. Во многом это стало возможным с началом работы опытного поля школы – первого в России научно-опытного учреждения [1, с. 12–16; 2, с. 1–9]. В результате в высшей отраслевой школе в России и Беларуси начались проводится экспериментальные исследования в области земледелия.

Первая попытка приложения точных экспериментальных методов естествознания к решению вопросов сельского хозяйства принадлежит зарубежным опытным учреждениям. К.А. Тимирязев в своей популярной лекции «Полвека опытных станций», прочитанной на годичном заседании Политехнического музея в Москве в 1885 году отмечал, что первые опытные станции были организованы в Бехельбронне в Эльзасе Жаном Батистом Буссенго и в Ротамстеде Джоном Беннетом Лоозом совместно с Джозефом Генри Гильбертом, и что организацию этих первых опытных станций «с полным правом должны отнести к 1835 г.» [3, с. 84].

В Германии начало опытного дела относят к 1852 году, когда в Меккерне близ Лейпцига начала функционировать сельскохозяйственная опытная станция, работа которой в первые годы ее существования связана с именем Э. Вольфа, а в последующие годы – О. Кельнера. Первые сельскохозяйственные опытные учреждения в Западной Европе были открыты (Италия – 1870 г., Бельгия – 1872 г., Испания – 1875 г., Швеция – в 1877 г.). В Соединенных Штатах Америки первое опытное учреждение было организовано по инициативе группы профессоров в штате Коннектикут в 1875 году, в Канаде – в 1887 году [4].

Вопрос начала систематической, планомерной работы по созданию опытных полей (станций, учреждений) в России продолжает оставаться дискуссионным. Так, Н.И. Пшеничный в своей докторской диссертации указывает, что первые указания о необходимости развития сельскохозяйственного опытного дела и России связаны с именем М.В. Ломоносова, который принимал

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

самое живое участие в создании и направлении деятельности Императорского Вольного экономического общества (ИВЭО). Его идеи нашли свое отражение во многих интересных и целесообразных мероприятиях этого Общества, к числу которых принадлежало опубликование в «Трудах» Общества в 1769 г. (ч. 13) «Приглашения сельских домостроителей к чинению некоторых опытов, касающихся до хлебопашества». Эти «приглашения» представляют собой не что иное, как подробную инструкцию по постановке полевых опытов. Инструкция указывает на необходимость «часто повторенными опытами положить верные правила, по коим бы каждый поселянин земледелие свое надежно и с несомненным избытком производить мог». Для постановки полевых опытов рекомендовалась соответствующая тема, схема и методика проведения работ. Сказанное выше позволяет считать, что начало опытного дела в России можно отнести к 1769 году [5, с. 12]. Однако такое заключение Н.И. Пшеничного не соответствует действительности потому, что такого типа «наставления» в то время и значительно ранее печатали, например, монастыри для прихожан.

Дырэктар Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства і кармоў В.П. Самсонаў, падводзячы вынікі дзейнасці гэтай навуковай установы за 1991 год, адзначыў, што галоўнымі прычынамі, якія заміналі Рэспубліцы Беларусь мець стабільны ўраджай збожжавых 35–40 ц/га з усіх пасяўных плошчаў, з’яўляліся: недахоп сучасных сродкаў абароны, рэгулятараў росту, добрай уборачнай тэхнікі [1, арк. 29].

У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў пасяджэння Прэзідыума Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь 16 снежня 1992 г. быў стан матэрыяльна-тэхнічнай і навукова-даследчай базы Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь. Было адзначана, што “наяўная матэрыяльна-тэхнічная база навуковых устаноў

Акадэміі не ў поўнай меры адпавядае сучасным патрабаванням” [2, арк. 146].

Так, у асобных інстытутах адчуваўся востры недахоп вытворчых плошчаў, асабліва ў БелНДІ лёну, БелНДІ агародніцтва, БелНДІ аховы раслін. У гэтых інстытутах на аднаго навуковага супрацоўніка прыходзілася адпаведна 3,68 м^2, 4,25 м^2 і 5,5 м^2. Адсутнасць уласных сродкаў негатыўна адбілася на перааснашчэнні навуковых установ і эксперыментальных заводаў новымі прыборамі, лабараторным абсталяваннем, вылічальнай тэхнікай, станкамі. Наяўныя ў інстытутах асноўныя прыборы (амінакіслотныя аналізатары, спектрафатометры, храматографы, электронныя мікраскопы), якія знаходзіліся ў эксплуатацыі ўжо 10 і больш гадоў, маральна і фізічна састарэлі [2, арк. 147].

Складаная сітуацыя склалася ў навуковых установах і з малагабарытнай селекцыйнай тэхнікай, якая выкарыстоўвалася на вопытных дзялянках. Да 1990 года такая тэхніка паступала ў рэспубліку цэнтралізавана праз установы Дзяржаграпрама СССР, з Фінляндыі, Чэхаславакіі, заводаў Саюза. Аднак у выніку распаду СССР пастаўкі малагабарытнай тэхнікі, запасных частак былі спыненыя і для іх набыцця патрабаваліся валютныя сродкі. Не была забяспечаная Рэспубліка Беларусь і закваскамі для малочнай і мясной прамысловасці, якія раней пастаўляліся з краін Балтыі і сенняшняга СНД. Нестабільнасць абстаноўкі і цяжкасці з пастаўкай заквасак у Рэспубліку, якія ўзнікаюць пры гэтым, настойліва патрабавалі стварэння ў Рэспубліцы біялагічнага цэха па вытворчасці заквасак на базе Беларускага навукова-даследчага канструктарска-тэхналагічнага інстытута мясной і малочнай прамысловасці. Гэта давала магчымасць забяспечыць да 1995 года прадпрыемствы рэспублікі закваскамі для ўсіх відаў натуральнамалочнай прадукцыі, да 1996 года – для сыраробства і вытворчасці дыетычных і дзіцячых прадуктаў, да 2000 года – для вытворчасці мясных і каўбасных вырабаў.

Недастатковая ўвага да развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы эксперыментальных гаспадарак не дазваляла мець ім больш высокі ўзровень інтэнсіўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. Так, для выканання дзяржаўнага заказу па штогадовай пастаўцы элітнага насення збожжавых, зернебабовых і крыжакветных

культур, шматгадовых траў, павышэння іх якасці згодна з нарматывам, не хапала больш за 160 трактароў, 600 грузавых аўтамабіляў, 26 сушыльна-ачышчальных комплексаў і іншай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Вышэй адзначанае сведчыла, што матэрыяльна-тэхнічная база навукова-даследчых устаноў, навукова-вытворчых аб'яднанняў Акадэміі аграрных навук не дазваляла вырашаць задачы па распрацоўцы высокаэфектыўных рэсурсазберагальных, экалагічна бяспечных тэхналогій вытворчасці, перапрацоўкі і захоўвання прадукцыі сельскай гаспадаркі, не забяспечвала выканання дзяржаўнага заказу па вытворчасці і якасці элітнага насення сельскагаспадарчых культур і рэалізацыі племяннога маладняку сельскагаспадарчых жывёл [2, арк. 147–155].

Нягледзячы на ўсе цяжкасці пераходнага перыяду, аграрная навука рэспублікі рабіла паступовыя крокі, накіраваныя на выхад са складанай сітуацыі. Так, у 1993 г. былі перададзены на дзяржаўнае сортавыпрабаванне 27 новых гатункаў і гібрыдаў сельскагаспадарчых культур, прынята да раянавання 16 гатункаў. Навуковымі ўстановамі Аддзялення жывёлагадоўлі і ветэрынарыі Акадэміі аграрных навук былі створаны селекцыйныя статкі кароў з сярэдняй прадуктыўнасцю па найвышэйшай лактацыі 7 150 кг малака з тлустасцю 3,9%. У галіне механізацыі, энергетыкі і эканомікі былі распрацаваны і прадстаўлены на дзяржаўныя прыёмачныя выпрабаванні 15 узораў машын і абсталявання. Больш за 36 узораў тэхнікі прайшлі даследчыя выпрабаванні і вытворчую праверку. На вытворчасць было пастаўлена 7 новых машын і абсталявання [3, арк. 3–4].

Для вырашэння пастаўленых задач у 1994 г. на фінансаванне праграмы "Агракомплекс", якая выконвалася Акадэміяй аграрных навук Рэспублікі Беларусь, было выдаткавана 6 789,5 млн руб. Нягледзячы на складанае становішча аграрнай навукі ва ўмовах эканамічнага крызісу, у галіне раслінаводства быў завершаны шэраг распрацовак, накіраваных на павышэнне прадукцыйнасці і ўстойлівасці земляробства. У выніку, каля 70% пасяўной плошчы збожжавых культур і 80% бульбы ў рэспубліцы было занята гатункамі беларускай селекцыі. У галіне механізацыі і энергетыкі ў 1994 г. на папярэднія і прыёмачныя выпрабаванні было прадстаўлена 76 узораў машын і

абсталявання, 29 тэхнічных сродкаў прайшлі даследчыя выпрабаванні і вытворчую праверку. Па выніках прыёмачных выпрабаванняў у 1994 г. было рэкамендавана да пастаноўкі на серыйную вытворчасць 11 машын [4, арк. 3–4].

Як сведчаць архіўныя дакументы, навуковыя ўстановы Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь у асноўным выканалі даследаванні па пяцігадовай рэспубліканскай навукова-тэхнічнай праграме “Агракомплекс” і ўнеслі важкі ўклад у вырашэнне задач, накіраваных на навуковае забеспячэнне развіцця сельскагаспадарчых і перапрацоўчых галін аграпрамысловага комплексу. Так, быў выкананы шэраг распрацовак па тэхналогіях вырошчвання сельскагаспадарчых культур, створаны новыя гатункі, формы угнаенняў, ветэрынарныя прэпараты. Былі прадстаўлены на дзяржаўныя прыёмачныя выпрабаванні 93 ўзоры новых машын і абсталявання. У выніку да пастаноўкі на вытворчасць былі рэкамендаваны 32 тэхнічныя сродкі і 48 – да выпуску доследна-прамысловымі партыямі [5].

Акадэміяй аграрных навук былі прапанаваны сельскай гаспадарцы рэспублікі новыя сістэмы прыродаахоўных севазваротаў, якія забяспечвалі павышэнне прадуктыўнасці раллі на 3–4 ц/га кармавых адзінак пры зніжэнні прымянення гербіцыдаў на 50%, змяншэнні сабекошту прадукцыі на 7–9% і энергетычных выдаткаў на 11–14%. Былі распрацаваныя новыя прыёмы перадпасяўной апрацоўкі насення, якія дазвалялі знізіць дозу пратручвальніка на 50% і інш. [5].

Быў выкананы шэраг распрацовак, накіраваных на ўдасканаленне тэхналогіі вырошчвання сельскагаспадарчых культур. Тут неабходна адзначыць сістэму энергазберагальнай асноўнай апрацоўкі глебы, якая дазваляла знізіць расход паліва ў 2,5 разы, правесці пасеў культур у лепшыя агратэхнічныя тэрміны. Калектыву аўтараў работы “Распрацоўка метадаў і вынікі селекцыі высокапрадукцыйных рэсурсазберагальных гатункаў яравога ячменю і азімага жыта” у 1994 г. Пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь была прысуджана Дзяржаўная прэмія ў галіне навукі і тэхнікі.

БелНДІ аховы раслін былі распрацаваныя 22 тэхналогіі аховы асноўных сельскагаспадарчых культур ад шкодных арганізмаў,

якія дазвалялі дадаткова атрымліваць 5–7 ц/га збожжа, 40–60 ц/га бульбы, 90–100 ц/га пладоў і гародніны, 100–150 ц/га цукровых буракоў і кармавых карняплодаў, 1,5–2 ц льновалакна, 5–7 ц насення рапсу. Апрабацыя гэтых тэхналогій супрацоўнікамі Беларускага навукова-даследчага інстытута аховы раслін забяспечыла атрыманне чыстага даходу 32,7 млрд. руб. і эканомію 25 тыс. т умоўнага паліва [5].

Упершыню ў Беларусі на прыкладзе збожжавых культур распрацаваны комплекс камп'ютарных задач па экспертнай ацэнцы экалагічнай бяспекі сістэм абароны раслін. Гэта дазволіла з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі ажыццявіць селектыўны адбор сродкаў абароны раслін, знізіць пестыцыдную нагрузку на 20–25%, што забяспечвала эканомію на прапанаваны аб'ём укаранення (1,7 млн га збожжавых культур) 786 т пестыцыдаў).

Па падпраграме "Бульба" былі створаны і перададзены на дзяржаўнае выпрабаванне 9 сартоў пры плане – 3, а таксама раянавана 6 сартоў. Новыя сарты былі больш устойлівыя да комплексу хвароб і, як правіла, перавышалі стандарт па ўраджайнасці. У цэлым па рэспубліцы гатункі селекцыі БелНДІ бульбаводства займалі больш за 80% пасяўной плошчы.

Упершыню ў Рэспубліцы Беларусь было распрацавана 5 стандартаў, якія рэгламентавалі тэхналогіі захоўвання і перапрацоўкі журавін звычайных, абляпіхі, глогу, шыпшынніка, айвы японскай. БелНДІ пладаводства былі рэалізаваны 98 тыс. саджанцаў пладова-ягадных культур, 103 тыс. штук расады суніц і 368 тыс. чаранкоў.

Па выніках даследаванняў прапанавана да вытворчасці 76 распрацовак у галіне жывёлагадоўлі і ветэрынарнай медыцыны, распрацаваны і ўдасканалены сродкі дыягностыкі і прафілактыкі найбольш распаўсюджаных інфекцыйных хвароб.

Па выніках выканання падпраграмы "Перапрацоўка прадукцыі жывёлагадоўлі" было распрацавана 7 тэхналогій, 14 адзінак абсталявання і 6 новых відаў прадукцыі. Адной з найбольш важных са скончаных распрацовак з'ўлялася: тэхналогія вытворчасці спірту з малочнай сыроваткі, якая дазваляе атрымаць з 1 т малочнай сыроваткі 20 л этылавага спірту, 17 кг вуглекіслаты, 150 кг альбумінавага малака. Этылавы спірт, атрыманы з малочнай сыроваткі, па сваіх якасных

паказчыках адпавядаў аднатыпнаму прадукту, выпрацаванаму з высакаякаснага збожжа ці з бульбы. Тэхналогія вытворчасці этылавага спірту з малочнай сыроваткі ўкаранёна на Пружанскім масласырзаводзе [5].

Укараненне навуковых распрацовак па падпраграме “Механізацыя” за 1991–1995 гг. дазволі атрымаць эканомію паліва – 15,8 тыс. т, металу – 6,8 тыс. т. Па выніках выпрабаванняў былі рэкамендаваныя да пастаноўкі на вытворчасць мадэрнізаваныя аўтамабілі ЗІЛ-130 і ГАЗ-53 для працы на дызельным паліве. У параўнанні з базавымі аўтамабілямі была забяспечана эканомія паліва да 60%. Была выпушчаная вопытная партыя мадэрнізаваных аўтамабіляў у колькасці 500 шт., а на 8 заводах і 22 вытворчых аб’яднаннях райаграпрамтэхнікі была арганізавана серыйная іх вытворчасць [5].

Такім чынам, Акадэміяй аграрных навук Рэспублікі Беларусь на працягу 1992–1995 гг. былі дасягнуты пэўныя поспехі ў працэсе ўкаранення дасягненняў аграрнай навукі ў сельскагаспадарчую вытворчасць.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальной акадэміі навук Беларусі (далей – ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 101. Воп.1. Спр. 39.
2. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 101. Воп.1. Спр. 41
3. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 101. Воп.1. Спр.2.
4. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 101. Воп.1. Спр.3.
5. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 101. Воп.1. Спр.4.

References:

1. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 101. Op.1. Spr. 39. (in Belarusian).
2. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 101. Op.1. Spr. 41. (in Belarusian).
3. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 101. Op.1. Spr. 2. (in Belarusian).
4. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 101. Op.1. Spr. 3. (in Belarusian).
5. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 101. Op.1. Spr. 4. (in Belarusian).

Дата паступлення артыкула 27.06.2023
Received 27.06.2023

УДК 001.32(092)
https://doi.org/10.5281/zenodo.8333833

В. Н. Морозов

Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И.С. Лупиновича Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

ВЫПУСКНИКИ ГОРЫ-ГОРЕЦКОГО ЗЕМЛЕДЕЛЬЧЕСКОГО ИНСТИТУТА – АВТОРЫ ПЕРВОГО ЭНЦИКЛОПЕДИЧЕСКОГО СПРАВОЧНИКА СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫХ ЗНАНИЙ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ

Аннотация. Статья посвящена выпускникам Горы-Горецкого земледельческого института, профессорам Петровской земледельческой и лесной академии И.Н. Чернопятову, И.А. Стебуту и А.П. Людоговскому. Излагаются краткие биографии этих ученых и анализируется их вклад в развитие аграрной науки Российской империи во второй половине XIX в.

Ключевые слова: И.Н. Чернопятов, И.А. Стебут, А.П. Людоговский, Горы-Горецкий земледельческий институт, Петровская земледельческая и лесная академия, история сельского хозяйства, история аграрной науки, «Настольная книга для русских сельских хозяев», история книги.

Для цитирования. Морозов, В. Н. Выпускники Горы-Горецкого земледельческого института – авторы первого энциклопедического справочника сельскохозяйственных знаний Российской империи / В. Н. Морозов // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси, Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории, Науч. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 215–224.

В. М. Марозаў

Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І.С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

ВЫПУСКНІКІ ГОРЫ-ГАРАЦКАГА ЗЕМЛЯРОБЧАГА ІНСТЫТУТА – АЎТАРЫ ПЕРШАГА

ЭНЦЫКЛАПЕДЫЧНАГА ДАВЕДНІКА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ВЕДАЎ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Анатацыя. Артыкул прысвечаны выпускнікам Горы-Горацкага земляробчага інстытута, прафесарам Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі І.М. Чарнапятаву, І.А. Сцебуту і А.П. Людагоўскаму. Выкладаюцца кароткія біяграфіі гэтых навукоўцаў і аналізуецца іх унёсак у развіццё аграрнай навукі Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст.

Ключавыя словы: І.М. Чарнапятаў, І.А. Сцебут, А.П. Людагоўскі, Горы-Горацкі земляробчы інстытут, Пятроўская земляробчая і лясная акадэмія, гісторыя сельскай гаспадаркі, гісторыя аграрнай навукі, “Настольная кніга для рускіх сельскіх гаспадароў”, гісторыя кнігі.

Viachaslau N. Marozau

I. S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

GRADUATES OF THE GORY-GORETSKY AGRICULTURAL INSTITUTE WHO WERE THE AUTHORS OF THE FIRST ENCYCLOPEDIC REFERENCE BOOK OF AGRICULTURAL KNOWLEDGE OF THE RUSSIAN EMPIRE

Abstract. The article is dedicated to I.N. Chernopyatov, I.A. Stebut and A.P. Ludogovsky, graduates of the Gory-Goretsky Agricultural Institute, professors of the Petrovskaya Agricultural and Forestry Academy. Brief biographies of these scientists are presented and their contribution to the development of agrarian science of the Russian Empire in the second half of the XIX century is analyzed.

Keywords: I.N. Chernopyatov, I.A. Stebut, A.P. Ludogovsky, Gory-Goretsky Agricultural Institute, Petrovskaya Agricultural and Forestry Academy, history of agriculture, history of agrarian science, "Handbook for Russian Farmers", history of the book.

For citation. Marozau V. N. Graduates of the Gory-Goretsky Agricultural Institute who were the authors of the first encyclopedic reference book of agricultural knowledge of the Russian Empire. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the II International scientific conference dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023. Minsk, 2023, pp. 215–224 (in Russian).

Белорусская государственная сельскохозяйственная академия (далее – БГСХА; ранее – Горы-Горецкая земледельческая школа и Горы-Горецкий земледельческий институт), являясь старейшим в Европе высшим учебным

заведением аграрного профиля, имеет давние научные традиции. Из ее стен за более чем 180 лет существования вышло несколько поколений исследователей, оставивших заметный след в развитии аграрной науки. Одними из таких выпускников являются Илья Никитич Чернопятов (1822–1879), Иван Александрович Стебут (1833–1923) и Алексей Петрович Людоговский (1840–1882) – авторы «Настольной книги для русских сельских хозяев» – первого российского универсального справочника по сельскому хозяйству.

Инициатором создания этой книги был Комитет сельскохозяйственной консультации (далее – КСХК) при Императорском московском обществе сельского хозяйства (далее – МОСХ) – общественной организации по содействию развитию аграрной отрасли в Российской империи, основанной в 1820 году [1, с. 54]. Он был образован в 1871 году по инициативе И.А. Стебута [1, с. 63], в его состав входили и И.Н. Чернопятов с А.П. Людоговским [1, с. 64]. В числе задач КСХК было указано «разрешение различных вопросов по всем отраслям сельскохозяйственной промышленности» [2, с. 3]. КСХК решил издать недорогую справочную книгу, которая давала бы «русскому хозяину возможность найти в нем настолько достаточное разъяснение интересующих его сельскохозяйственных вопросов, чтобы он, затем, если бы и не был в состоянии сам решить вопрос совершенно определенно, мог, по крайней мере, предложить его специалисту в форме, допускающей определенное решение» [2, с. 4]. В качестве образца были взяты имевшие хождение в России того времени труды западноевропейских авторов, а для рассмотрения были отобраны вопросы, которые по опыту своей работы КСХК посчитал особенно существенными для российских аграриев. Из практики отечественного сельского хозяйства были позаимствованы и данные, на которых основывались изложенные в книге выводы.

В 1875–1876 годах были изданы первые два тома «Настольной книги…». Первый том был посвящен вопросам аренды и устройства имения, описанию земли и почвы,

сельскохозяйственных строений и инвентаря, способов использования земли, видам и производству удобрений, использованию рабочего скота; во втором рассматривались животноводство (скотоводство, птицеводство, рыбоводство, пчеловодство), технические культуры, финансовый контроль и учет. И.А. Стебутом была написана земледельческая часть книги, И.Н. Чернопятовым – скотоводческая, а А.П. Людоговским – экономическая. Еще одним автором-составителем «Настольной книги…» стал почвовед Анатолий Александрович Фадеев (1846/1849–1915), чьему перу принадлежат вопросы технического производства. Подготовленный материал был структурирован, хорошо иллюстрирован и снабжен таблицами и всевозможными приложениями. В 1880 году свет увидел третий том, разделенный на две книги. Обе представляли собой переиздания известных работ других авторов: первая книга – сочинения главного садовника Петровской академии Рихарда Шредера (1822–1903) «Русский огород, питомник и плодовый сад», вторая – очерки директора академии Федора Арнольда (1819–1902) «Хозяйство в русских лесах». В итоге получилась, по мнению современников из Императорского Вольного экономического общества, «нечто вроде сельскохозяйственной энциклопедии, но в то же время не энциклопедия, а скорее сборник разных трактатов, которые могут быть сведены в три главные отдела: земледелие, зоотехния и сельские технические производства» [3, с. 178]. Это было первое в России систематизированное научное издание по данной теме на русском языке [4, с. 61], которое стало библиографической редкостью уже в XIX веке [1, с. 64].

Таким образом, БГСХА является альма-матер первых энциклопедистов отечественной аграрной науки – И.Н. Чернопятова, И.А. Стебута и А.П. Людоговского. Интересны биографии этих ученых.

И.Н. Чернопятов родился 17 июля 1822 года в дворянской семье [5, с. 263]. Он был в составе первого выпуска высшего разряда Горы-Горецкой земледельческой школы 1846 года [6, с. 23] (через 2 года высший разряд преобразуют в

земледельческий институт). Поступив на службу в корпус гражданских топографов (землемеров) классным топографом, И.Н. Чернопятов был сразу же откомандирован совершенствовать свои знания в Лифляндию (Прибалтика), а через 2 года – направлен в Германию, где 2 года изучал искусственное орошение лугов и разработку торфа. Пока будущий ученый жил за границей, корпус гражданских топографов был преобразован в корпус межевщиков Департамента сельского хозяйства Министерства государственных имуществ, поэтому в Россию в ноябре 1850 года И.Н. Чернопятов вернулся младшим запасным землемером новой структуры. В июне следующего года он был назначен исполняющим обязанности помощника управляющего Казанской учебной фермой, а в октябре – сдал в Горы-Горецком земледельческом институте экзамен на звание агронома. В 1853–1863 годах И.Н. Чернопятов работал в санкт-петербургском Лесном и межевом институте: сначала – преподавателем сельского хозяйства 3-го разряда, а с 1859 года – наставником-руководителем отдела естественных наук. В это время он стал членом многих научных обществ: Российского общества садоводства (1859), Вольного экономического общества (1860), а также членом-корреспондентом Учебного комитета Министерства государственных имуществ (1861). В июле 1863 года И.Н. Чернопятов был назначен профессором образовывавшейся в Москве Петровской земледельческой и лесной академии и вновь был отправлен в научную командировку в Европу, успев перед этим защитить в Московском университете диссертацию «Об овечьей шерсти» на получение степени магистра сельского хозяйства и лесоводства. Вернувшись из поездки спустя полтора года, в октябре 1865 года И.Н. Чернопятов был утвержден ординарным профессором, став одним из первых профессоров Петровской академии. Здесь И.Н. Чернопятов преподавал зоотехнию (а с 1870 года еще и заведовал фермой) до выхода в отставку в октябре 1878 года по выслуге 30 лет. Менее чем через полгода после этого, 1 мая 1879 года, Илья Никитич скончался [5, с. 263].

Научное наследие И.Н. Чернопятова включает в себя ряд руководств по разным разделам сельского хозяйства, работы по воспитанию домашнего скота. Кроме того, ученый собрал уникальную коллекцию шерсти из 643 образцов, получившую премию Венской выставки 1873 года [5, с. 263].

И.А. Стебут родился 31 января 1833 года в городе Великие Луки Псковской губернии в семье аптекаря, принадлежавшей к дворянскому роду предположительно белорусского происхождения [1, с. 26]. В Горы-Горецком земледельческом институте он учился в 1850–1854 годах и после получения степени агронома остался там помощником управляющего учебной фермой (сначала – младшим, а через год – старшим) [1, с. 30, 32]. Подобно И.Н. Чернопятову, И.А. Стебут прошел длительные стажировки в Прибалтике и Европе, где посещал образцовые хозяйства и слушал лекции в сельскохозяйственных вузах. После возвращения в Горки в октябре 1860 года И.А. Стебут был назначен исполняющим обязанности младшего профессора и стал преподавать полеводство и луговодство в институте [7, с. 225], а также земледелие в Горы-Горецком земледельческом училище [1, с. 40]. С образованием в Москве Петровской академии ученый осенью 1864 года был переведен туда [1, с. 47], и в октябре 1865 года стал исполняющим обязанности профессора кафедры земледелия [1, с. 50]. Через месяц И.А. Стебут защитил в Санкт-Петербургском университете магистерскую диссертацию «Известкование почвы» (одним из оппонентов на защите был Дмитрий Менделеев) [1, с. 50], а в январе 1866 года, незадолго до начала лекционной работы в Петровской академии, он был утвержден ее ординарным профессором [7, с. 225], присоединившись к И.Н. Чернопятову в ряду первых профессоров этого учебного заведения. Кроме того, И.А. Стебут и И.Н. Чернопятов стали единственными на тот момент специалистами по сельскому хозяйству в Петровской академии [1, с. 52]. Вскоре И.А. Стебут возглавил первую в России кафедру растениеводства [7, с. 225], приложив огромные силы к ее организации и становлению. В январе 1867 года ученый был избран членом МОСХ и сразу же

развил в нем активную деятельность. Как было упомянуто выше, именно по инициативе И.А. Стебута в МОСХ был организован КСХК [1, с. 63]. Ученый работал в Петровской академии до ее закрытия в 1894 году (с перерывом в 1875–1876 годах [1, с. 66–67]), затем занимался организованным им опытном хозяйством в Тульской губернии, а в 1898 году стал председателем Ученого комитета Министерства земледелия и государственных имуществ, пробыв на этой должности до 1908 года [7, с. 226]. Здесь И.А. Стебут главное внимание уделял вопросам сельскохозяйственного образования (в основном, женского), а также организации и деятельности сельскохозяйственных опытных учреждений. В 1904–1906 годах он стал первым заведующим Высших женских сельскохозяйственных курсов [1, с. 76] (сейчас – Санкт-Петербургский государственный аграрный университет). И.А. Стебут встретил революцию в России и умер в Москве 20 октября (по другим данным – 2 ноября [1, с. 78]) 1923 года [7, с. 225].

И.А. Стебут считается одним из основоположников отечественной агрономической науки. Его основные научные работы посвящены растениеводству и агрохимии. В своем капитальном двухтомном труде «Основы полевой культуры» (1873–1879) ученый привел результаты колоссальной работы по классификации сложившейся на тот момент в стране системы хозяйствования, обобщению достижений тогдашней аграрной науки и опыта земледельческой практики. Также он разработал первую российскую классификацию полевых растений, положив в ее основу густоту стояния. Именно И.А. Стебут впервые показал значение подбора определенных культур и сортов для различных климатических и почвенных зон. Он же положил начало широкому изучению известкования почвы в России. Кроме того, И.А. Стебут был энтузиастом внедрения в аграрное производство техники и, как уже указывалось, высшего сельскохозяйственного образования для женщин. Именно благодаря его настойчивости в начале XX века в Санкт-Петербурге были открыты первые в России Высшие женские сельскохозяйственные курсы, получившие вскоре имя

И.А. Стебута. Ученый был основателем и первым редактором печатного органа МОСХ «Русское сельское хозяйство» [7, с. 226], издававшегося в 1869–1876 годах.

Так же выходец из дворянского рода (предположительно, белорусского происхождения) А.П. Людоговский родился в 1840 году. В 1861 году он получил степень агронома в Горы-Горецком земледельческом институте [8, с. 147], где одним из его преподавателей был И.А. Стебут [1, с. 40]. Служебную карьеру А.П. Людоговский начал счетным чиновником Московского отряда уравнения денежных сборов с государственных крестьян, одновременно преподавая в Московской земледельческой школе. По поручению губернского статистического комитета А.П. Людоговский проводил исследования особенностей структуры почвы, ее обработки, удобрения, севооборотов и чередования сельскохозяйственных работ в Московской губернии, а также влияния на эти проблемы климатических изменений. После непродолжительной работы в Ковенской люстрационной комиссии, в апреле 1864 года он вернулся в Горки, теперь уже в качестве преподавателя [8, с. 147], где успел недолго поработать с И.А. Стебутом. В марте 1865 года А.П. Людоговский был назначен помощником директора Департамента сельского хозяйства Министерства государственных имуществ [8, с. 147] и вскоре переехал в Санкт-Петербург. В 1867–1868 годах он преподавал на кафедре земледелия переведенного сюда из Горок земледельческого института, а через два года оказался на кафедре сельскохозяйственной экономии Петровской академии, где занимал должности экстраординарного (с мая 1870 года) и ординарного профессора (с февраля 1871 года) [8, с. 147]. В том же 1870 году А.П. Людоговский получил на физико-математическом факультете Петербургского университета степень магистра сельского хозяйства [9, с. 815]. В Петровской академии А.П. Людоговский проработал до мая 1876 года, когда был вынужден оставить службу по состоянию здоровья. Ученый тяжело болел (он страдал параличом правой половины тела и расстройством речи) и умер в Москве 11 февраля 1882 года [8, с. 147].

Главной работой А.П. Людоговского считается «Основы сельскохозяйственной экономии и сельскохозяйственного счетоводства» (1875), в которой он изложил созданное им учение о системах хозяйства, ставшее первым оригинальным учением, предложенным отечественной аграрной мыслью [8, с. 147]. В 1870–1871 годах А.П. Людоговский был соредактором журнала «Русское сельское хозяйство», сменив на этой должности И.А. Стебута [1, с. 58].

Таким образом, пример трех выпускников Горы-Горецкого земледельческого института – И.Н. Чернопятова, И.А. Стебута и А.П. Людоговского, добившихся замечательных успехов в области аграрной науки и аграрного образования, служит ярким свидетельством того, что уже в XIX веке БГСХА представляла собой крупный центр сельскохозяйственной мысли, сконцентрировавшим большой научно-образовательный потенциал.

Список использованных источников:

1. Балашев, Л. Л. Иван Александрович Стебут (1833–1923) / Л. Л. Балашев. – М. : Наука, 1966. – 168 с.
2. Настольная книга для русских сельских хозяев : [в 3 т.] / сост.: А. П. Людоговский [и др.]. – СПб. : А. Ф. Девриен, 1875–1880. – Т. 1. – 1875. – 920 с.
3. Нохрина, В. А. Оценка трудов Московского общества сельского хозяйства Вольным экономическим обществом в XIX веке / В. А. Нохрина // Науч. тр. Вольного экон. о-ва России. – 2020. – Т. 226, № 6. – С. 168–186. https://doi.org/10.38197/2072-2060-2020-226-6-168-186
4. Морозов, В. Н. «Настольная книга для русских сельских хозяев», составленная выпускниками Горы-Горецкого земледельческого института, как первый энциклопедический справочник сельскохозяйственных знаний Российской империи / В. Н. Морозов // Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов, 2023 : материалы VII Междунар. науч. конф., Брест, 24–25 мая 2023 г. : в 2 т. / Междунар. ассоц. акад. наук [и др.] ; сост.: Л. А. Авгуль, Н. В. Вдовина. – Минск ; М., 2023. – Т. 2. – С. 59–64.
5. Чернопятов Илья Никитич // Московские профессора XVIII – начала XX веков. Естественные и технические науки / В. А. Волков, М. В. Куликова. – М., 2003. – С. 263.
6. Летопись Белорусской государственной сельскохозяйственной академии (1840–2015 гг.) / Белорусская государственная сельскохозяйственная академия ; авт.-сост.: А. А. Герасимович, В. М. Лифшиц. – Изд. 6-е, перераб. и доп. – Горки : БГСХА, 2015. – 212 с.

7. Стебут Иван Александрович // Московские профессора XVIII – начала XX веков. Естественные и технические науки / В. А. Волков, М. В. Куликова. – М., 2003. – С. 225–226.

8. Людоговский Алексей Петрович // Московские профессора XVIII – начала XX веков. Естественные и технические науки / В. А. Волков, М. В. Куликова. – М., 2003. – С. 147.

9. Попов, М. Людоговский, Алексей Петрович / М. Попов // Русский биографический словарь : [в 25 т.] / Имп. Рус. ист. о-во. – СПб., 1914. – Т. 10 / под ред. Н. Д. Чечулина, М. Г. Курдюмова. – С. 815.

References:

1. Balashev L. L. *Ivan Aleksandrovich Stebut (1833–1923).* Moscow, Nauka Publ., 1966. 168 p. (in Russian).

2. Ludogovskii A. P., Stebut I. A., Chernopyatov I. N. (comp.) [et al]. *Handbook for Russian farmers. Vol. 1.* St. Petersburg, A. F. Devrien Publ., 1875. 920 p. (in Russian).

3. Nokhrina V. A. The evaluation of proceedings of Moscow agricultural society by the free economic society in the 19th century. *Nauchnye trudy Vol'nogo ekonomicheskogo obshchestva Rossii = Scientific Works of the Free Economic Society of Russia*, 2020, vol. 226, no. 6, pp. 168–186 (in Russian). https://doi.org/10.38197/2072-2060-2020-226-6-168-186

4. Morozov V. M. “Handbook for Russian Rural Owners”, compiled by graduates of the Gorygoretsk Agricultural Institute, as the first encyclopedic reference book of agricultural knowledge of the Russian Empire. *Berkovskie chteniya. Knizhnaya kul'tura v kontekste mezhdunarodnykh kontaktov, 2023: materialy VII Mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii, Brest, 24–25 maya 2023= Berkovskye Chteniya. Book Culture in the Context of International Contacts, 2023: materials of the 7th International scientific conference, Brest, May 24–25, 2023*. Minsk, Moscow, 2023, vol. 2, pp. 59–64 (in Russian).

5. Chernopyatov Ilya Nikitich. *Moscow professors (in the 18th - the beginning of the 20th centuries). Natural and technical sciences*. Moscow, 2003, p. 263 (in Russian).

6. Gerasimovich A. A., Lifshits V. M. *Chronicle of the Belarusian State Agricultural Academy (1840–2015)*. 6th ed. Gorki, Belarusian State Agricultural Academy, 2015. 212 p. (in Russian).

7. Stebut Ivan Alexandrovich. *Moscow professors (in the 18th - the beginning of the 20th centuries). Natural and technical sciences*. Moscow, 2003, pp. 225–226 (in Russian).

8. Lyudogovsky Alexey Petrovich. *Moscow professors (in the 18th - the beginning of the 20th centuries). Natural and technical sciences*. Mosow, 2003, p. 147 (in Russian).

9. Popov M. Ludogovsky, Alexey Petrovich. *Russian biographical dictionary. Vol. 10*. St. Petersburg, 1914, p. 815 (in Russian).

Дата поступления статьи 21.06.2023
Received 21.06.2023

УДК 272:929 Бэта+638.1
https://doi.org/10.5281/zenodo.8333839

С. В. Мяньчэня

Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І.С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

КСЁНДЗ ГЕНРЫК БЭТА ЯК ПАПУЛЯРЫЗАТАР БЕЛАРУСКАГА ПЧАЛЯРСТВА

Анатацыя. Артыкул прысвечаны дзейнасці беларускага і польскага рэлігійнага дзеяча Генрыка Бэты (1886–1965) па папулярызацыі пчалярства сярод беларускіх сялян і яго выданню «Pčalina – żywiolka malaja, a karysci daje mnoha» (Пецярбург, 1911 г.).

Ключавыя словы: пчалярства, беларускі нацыянальны рух, каталіцкі касцёл.

Для цытавання. Мяньчэня, С. В. Ксёндз Генрык Бэта як папулярызатар беларускага пчалярства / С. В. Мяньчэня // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси, Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории, Науч. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 225–230.

С. В. Меньченя

Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И.С. Лупиновича Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь
Белорусский государственный аграрный технический университет, Минск, Беларусь

КСЁНДЗ ХЕНРИК БЕТА КАК ПОПУЛЯРИЗАТОР БЕЛОРУССКОГО ПЧЕЛОВОДСТВА

Аннотация. Статья посвящена деятельности белорусско-польского религиозного деятеля Генрика Беты (1886–1965) по популяризации пчеловодства среди белорусских крестьян и его изданию «Pčalina – żywiolka malaja, a karysci daje mnoha» (Петербург, 1911).

Ключевые слова: пчеловодство, белорусское национальное движение, католическая церковь.

Siarhej V. Mianchenya

I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus
Belarusian State Agrarian Technical University, Minsk, Belarus

PRIEST HENRIK BETA AS A POPULARIZER OF BELARUSIAN BEEKEEPING

Abstract. The article is dedicated to the activity of the Belarusian and Polish religious figure Henryk Betta (1886–1965) in popularizing beekeeping among Belarusian peasants and his publication "Pčalina – žywiolka malaja, a karysci daje máhoj" (Petersburg, 1911).

Key words: beekeeping, Belarusian national movement, Catholic church.

For citation. Mianchenya S. V. Priest Henrik Beta as a popularizer of belarusian beekeeping. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the II International scientific conference dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023. Minsk, 2023, pp. 225–230 (in Belarusian).

Імя Генрыка Бэты малавядома ў шырокім грамадстве, аднак ён адыграў важную ролю не толькі ў развіцці беларускай каталіцкай царквы, але і ў станаўленні беларускага пчалярства.

Нарадзіўся Г. Бэта 7 лістапада 1886 г. у сям'і беларусаў-каталікоў каля мястэчка Сухаволя Сакольскага павета Гродзенскай губерні (суч. – Сакульскі павет Падляскага ваяводства). Вучыўся ў Сейнскай духоўнай семінарыі (суч. – Сейны, Падляскае ваяводства), дзе навучалася шмат будучых літоўскіх святароў. Ужо з 1904 г. у Сейнах выкладалася літоўская мова, а семінарысты былі задзейнічаны ў кантрабандзе літоўскіх выданняў у Расійскую імперыю. Верагодна, што такая актыўная нацыянальная праца абудзіла і самасвядомасць Бэты. Па сведчанням Ю. Туронка, менавіта Бэта з'яўлялся аўтарам ідэі стварэння беларускага гуртка ў Рыма-каталіцкай духоўнай акадэміі ў Пецярбургу, дзе ён працягнуў адукацыю пасля завяршэння семінарыі, аднак знайсці аднадумцаў сярод навучэнцаў у яго не атрымалася. У 1911 г., калі Бэта быў на апошнім курсе навучання, у акадэмію паступілі Люцыян Хвецька і Павел Пякарскі, якія і рэалізавалі ідэю гуртка [1, с. 458–459].

Пра супрацоўніцтва Бэты з беларускім асяродкам Пецярбурга дакладнай інфармацыі няма, аднак менавіта з дапамогай суполкі «Загляне сонца ў наша ваконца» у 1911 г. беларускай лацінкай у польскай друкарні К. Пянткоўскага выйшла яго кніга «Пчаліна – жывёлка малая, а карысці дае многа» («Pčalina – žywiolka malaja, a karysci daje mnoha»). Гэта адно з першых беларускіх выданняў, цалкам прысвечаных пчалярству. Кніга мела больш за 100 старонак і складалася з прадмовы і двух частак. Наклад выдання

на жаль невядомы. Ю. Туронак адзначаў, што Бэта выдаў яго за свой кошт [1, с. 458]. Аўтар скарыстаўся псеўданімам Бярозка (Henryk Bierozko), паходжанне якога верагодна звязана з сугучнасцю лацінскай назвы дрэва – *Betula alba* – з яго сапраўдным прозвішчам.

Мэтавай аўдыторыяй выдання «Пчаліна – жывёлка малая…» былі сяляне, што вынікае з прадмовы «Браткі родныя!». Тут аўтар адзначае цяжкае эканамічнае становішча беларускіх сялян і ў якасці сродку выпраўлення гаспадаркі раіць завесці пчол: «Кажаш, мала маеш зямлі – пчале яе і ня трэба…; мала маеш сенажаці – пчолам сена ў корм не ідзе; наракаеш на цяжкую працу – каля пчолаў яе амаль зусім няма. Трохі толькі павучыся, каля пчолак пахадзі, і яны прынясуць табе тое, што і ня снілася ніколі!»[1] [2, с. 3–4]. Паспяховасць пчалярскай дзейнасці звязвалася з жаданнем чалавека вучыцца, тым больш, што з'явілася магчымасць атрымліваць веды на роднай мове.

Першая частка кнігі «Вулей, пасечныя прылады, пчолы і іх жыццё» змяшчае інфармацыю аб пчлярскіх прыладах, пчолах, іх хваробах, іншых аспектах пчалінага жыцця, а таксама рэкамендацыі на пакупцы і перавозцы раёў. Г. Бэта раіў чытачам завесці рамавы варшаўскі вулей, прыводзіў падрабязнае апісанне яго дэталяў, схему, парады па выбару матэрыяла для будаўніцтва, яго этапы. У спіс пчалярскага інвентара ўваходзілі сіта, рукавіцы, нож для вашчыны, машынка для яе прыклейвання, дымар, матачнік, раёўня, адгародная пласціна, медагонка-цэнтрыфуга. Пазначалася, што з гэтага можна зрабіць самому, а што лепей купіць, прыводзіўся і прыблізны кошт пакупкі [2, с. 19–23]. Ставіць вулей раілася роўна, лепш пасярод маладых дрэў, падалей ад кузні і хлявоў. Распаўсюджаны і сёння звычай ставіць вулей лятком на поўдзень, Бэта крытыкуе – ад гэтага пчолы вясной рана вылятаюць і гінуць. Каб пазбегнуць гэтага, найлепшым напрамкам аўтар лічыць усход, бо летам для пчол будзе раней пачынацца «працоўны» дзень, а восенню яны будуць раней хавацца, каб не памерзнуць [2, с. 24]. У якасці адзінак вымярэння даўжыні і аб'ёму ўжываюцца тэрміны цаля, арыўш, фунт, гарнец.

[1] Тут і далей цытаванне ідзе ў транслітарацыі на кірылічны алфавіт з улікам сучасных граматычных і лексічных норм беларускай мовы – *М. С.*

У даволі даступнай форме і падрабязна апавядае аўтар пра асаблівасці пчалінай сям'і. Пры гэтым сустракаюцца і такія лірычныя адступленні: «Вось і між намі, Беларусамі, ёсць такіх трутняў ці ня мала. Бацька з маткай праліваюць апошнюю кроплю крыві, каб выкіраваць свайго сынка на чалавека, а ён, дабіўшыся куска хлеба, ды яшчэ з маслам, цураецца ня толькі бацькоўскай мовы, але нават і саміх бацькоў, бо яны мужыкі, цёмныя, невукі, а ён пан, разумны!» [2, с. 33]. З пункту гледжання сучаснай навукі, у звестках Бэты ёсць недакладнасці. Так аўтар называе тэрмін жыцця пчалы ў адзін год, у той час працоўныя пчолы жывуць 25–35 дзён, а вось трутні насамрэч могуць пражыць год, а матка – да 3–5. Аднак такія акалічнасці каштоўнасці кнігі Бэты не змяншаюць.

Купляць пчол раілася вясной, калі яны ўжо зрабілі першы аблёт, і магчыма было ацаніць іх працаздольнасць. Падыход да справы павінны быў быць такі, як пры пакупцы каня, каб не змарнаваць грошы. Перавозіць пчол рэкамендавалася ў начы, час ад часу спыняючыся, калі дарога была доўгая, то ў дзень раілася спыняцца і даваць магчымасць пчолам вылятаць [2, с. 49].

Другая частка кнігі «Гаспадарка ў вуллі» ўтрымлівала каляндар гаспадарчых работ, падзелены на тры часткі: вясна, лета і восень–зіма. Тут давалася 31 парада, ад падрыхтоўкі да першага аблёту і да зімавання пчол. Значная частка летніх парад датычылася раенню пчол: прыкметам пачатку раення, спосабам, як засцерагчыся ад уцёкаў роя і як прыняць новых пчол. Зімой у пчаляра асаблівых клопатаў не было, раілася не турбаваць пчол, рыхтавацца да новага гаспадарчага года і чытаць адпаведную літаратуру [2, с. 93–94].

Атрыманы за гаспадарчы год мёд рэкамендавалася падзяліць: частку аставіць пчолам на зіму, частку сваёй сям'і, частку прадаць. Пры гэтым Г. Бэта засцерагаў сваіх чытачоў ад падману пакупнікоў: «некаторыя вясковыя бортнікі сыплюць у мёд муку–цукар, л'юць ваду, сіроп, або іншыя, часам вельмі шкодныя для здароўя прыбавы. Толькі чалавек без сумлення будзе рабіць гэта, бо ён за некалькі грошаў гатоў прадаць чужое здароўе, а часам і жыццё… Іншыя вымаўляюцца тым, што я, кажа, прадам жыду. А ці жыд не чалавек? – хацеў бы я спытаць» [2, с. 95].

Г. Бэта прыводзіць і даволі цікавыя рэцэпты алкагольных напояў на аснове мёда: старасвецкі мёд, сыры мёд, мёд шыпячы, вішняк, мядовае піва. Найбольш хутка можна прыгатаваць шыпячы мёд, які ўжо праз некалькі дзён прыдатны для піцця. У якасці смакавых дадаткаў для яго падыходзяць імбір, ваніль, карэнні фіалак [2, с. 98–99].

У 1912 г. Г. Бэта быў накіраваны на служэнне на Беласточчыну, кніга «Пчаліна – жывёлка малая…» рэалізоўвалася праз рэдакцыі «Нашай Нівы» і каталіцкай газеты «Bielarus» і каштавала 30 капеек [3, с. 3; 4, с. 12]. З апошняй Г. Бэта падрымліваў трывалую сувязь: тут быў надрукаваны як мінімум адзін яго артыкул «Wialikaja dziela» (№ 17, 1914), у 1915 г. асобнай кніжкай выйшаў яго сцэнічны твор «Betlejka», у сельскагаспадарчым раздзеле газеты друкаваліся парады па пчалярству на аснове яго кнігі. З Вялікодным нумарам газеты за 1914 г. кніга была даслана ўсім падпісчыкам «Bielarus»'а [5]. Нумар быў быў канфіскаваны ўладамі, але пасля судовага разбіральніцтва судовая палата адмяніла гэтае рашэнне, і кніга ўсё ж трапіла да чытачоў [6, с. 8].

У 20–30-я гг. Генрык Бэта з'яўляўся прафэсарам семінарыі ў Сейнах, рэктарам духоўнай семінарыі і рэктарам Місіянерскага інстытуту ў Ломжы. Пры гэтым ён захоўваў сувязі з беларускім каталіцкім асяродкам, ён вёў перапіску з Адамам Станкевічам, быў падпісчыкам часопіса «Chryścijanskaja Dumka», аднак сам у ім не друкаваўся. Памёр Г. Бэта 1 кастрычніка 1965 г. у Ломжы, дзе і быў пахаваны [7]. У гісторыю Г. Бэта ўвайшоў як рэлігійны і грамадскі дзеяч, драматург і пчаляр.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Туронак, Ю. Падрэзаныя крылы / Ю. Туронак // Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. – Вільня, 2006. – С. 457–462.
2. Bierozko, H. Pčalina – žywiolka malaja, a karysci daje mnoha / H. Bierozko – Pieciarburh : Druk. K. Piantkouskaha, 1911. – 103 s.
3. Наша Ніва. – 1912. – № 3.
4. Biełarus. – 1913. – № 39.
5. Biełarus. – 1914. – № 14–15.
6. Biełarus. – 1914. – № 18.
7. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст.: жыццярысы, мартыралогія, успаміны / аўт.-уклад. Ю. Гарбінскі. – Мінск ; Мюнхен : Беларус. кнігазбор, 1999. – 720 с.

References:

1. Turonak Yu. Clipped wings. *Modern history of Belarus*. Vilnius, 2006, pp. 457–462 (in Belarusian).
2. Bierozko H. *The bee is a small creature, but it does a lot of good.* Petersburg, K. Piantkovskii Publ., 1911. 103 p. (in Belarusian).
3. *Our Niva*. 1912. N 3. (in Belarusian).
4. *Bielarus*. 1913. N 39. (in Belarusian).
5. *Bielarus*. 1914. N 14–15. (in Belarusian).
6. *Bielarus*. 1914. N. 18. (in Belarusian).
7. Garbinski Yu. *Belarusian religious figures of the 20th century: biographies, martyrology, memoirs*. Minsk, Munich, Belaruski knigazbor Publ., 1999. 720 p. (in Belarusian).

Дата паступлення артыкула 31.07.2023
Received 31.07.2023

УДК 929 Наркевич-Иодко+631(476)«18/19»
https://doi.org/10.5281/zenodo.8333841

Н. Ю. Берёзкина

Заслуженный деятель культуры Республики Беларусь, Минск Беларусь

ВКЛАД Я. НАРКЕВИЧА-ИОДКО В РАЗВИТИЕ СЕЛЬСКОГО ХОЗЯЙСТВА: ПО МАТЕРИАЛАМ ПЕЧАТИ КОНЦА XIX – НАЧАЛА XX в.

Аннотация. Рассматривается научная деятельность выдающегося белорусского ученого Я. Наркевича-Иодко в области сельского хозяйства. Он проводил опыты по использованию атмосферного электричества для повышения роста растений. Ученый разработал приборы, которые использовались в сельском хозяйстве: террогигрометр (лизиметр) для измерения температуры почвы на разных глубинах; градоотводы для защиты посевов от гроз и градобитий.

Ключевые слова: история науки, сельское хозяйство, электрокультура, градоотводы, лизиметр.

Для цитирования. Берёзкина, Н. Ю. Вклад Я. Наркевича-Иодко в развитие сельского хозяйства: по материалам печати конца XIX – начала XX в. / Н. Ю. Березкина // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси, Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории, Науч. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 231–238.

Н. Ю. Бярозкіна

Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, Мінск, Беларусь

УКЛАД Я. НАРКЕВІЧА-ЁДКІ Ў РАЗВІЦЦЁ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ: ПА МАТЭРЫЯЛАХ ДРУКУ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Анатацыя. Разглядаецца навуковая дзейнасць выдатнага беларускага вучонага Я. Наркевіча-Ёдкі ў галіне сельскай гаспадаркі. Ён праводзіў доследы па выкарыстанні атмасфернай электрычнасці для павышэння росту раслін. Вучоны распрацаваў прылады, якія выкарыстоўваліся ў сельскай гаспадарцы: тэрагіграметр (лізіметр) для вымярэння тэмпературы глебы на розных глыбінях; градаадводы для абароны пасеваў ад навальніц і градабіццяў.

Ключавыя словы: гісторыя навукі, сельская гаспадарка, электракультура, градаадводы, лізіметр.

Natalya Yu. Beryozkina

The Honored Figure of Culture of the Republic of Belarus, Minsk, Belarus

CONTRIBUTION OF J. NARKIEWICZ-JODKO IN THE DEVELOPMENT OF AGRICULTURE: BASED ON MATERIALS FROM THE PRESS OF THE LATE 19TH – EARLY 20TH CENTURIES

Abstract. Scientific activity of the outstanding Belarusian scientist J. Narkiewicz-Jodko in the field of agriculture is considered. He conducted experiments on the use of atmospheric electricity to increase the growth of plants. The scientist developed devices that were used in agriculture: a terrahygrometer (lysimeter) for measuring soil temperature at different depths; hail drains to protect crops from thunderstorms and hailstorms.

Keywords: history of science, agriculture, electroculture, hail drains, lysimeter.

For citation. Beryozkina N. Yu. Contribution of J. Narkiewicz-Jodko in the development of agriculture: based on materials from the press of the late 19th – early 20th centuries. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the II International scientific conference dedicated to the 95th anniversary of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, September 29, 2023. Minsk, 2023, pp. 231–238 (in Russian).

С именем выдающегося белорусского ученого-естествоиспытателя Якова Оттоновича Наркевича-Иодко связаны проведение в Минской губернии систематических метеорологических наблюдений, имеющих как научное, так и практическое сельскохозяйственное значение, опыты по изучению атмосферного электричества и его влияния на растения, изобретение ряда приборов, предназначенных для использования в сельском хозяйстве. В своей деятельности он уделял значительное место совершенствованию сельскохозяйственного производства, был действительным членом Императорского Вольного экономического общества по отделу сельского хозяйства и отделу сельскохозяйственной экономики и статистики, членом Минского общества сельского хозяйства, почетным членом Императорского Российского общества садоводства.

Я. Наркевич-Иодко неоднократно выступал на общих собраниях и заседаниях секций Минского общества сельского хозяйства, принимал участие в обсуждении различных вопросов, связанных с организацией сельскохозяйственной деятельности, был экспертом и участником сельскохозяйственных и кустарно-промышленных выставок, получал награды за представленные на выставках экспонаты.

Одним из направлений исследований, о котором Я. Наркевич-неоднократно рассказывал членам общества сельского хозяйства, было изучение колебаний подпочвенной температуры на различных глубинах [1], измерение почвенной влаги и степени «просачивания» разных почв. Как делегат от Минского общества сельского хозяйства 5 января 1890 г. на секции агрономии VIII съезда врачей и естествоиспытателей в Петербурге ученый прочел реферат «О наблюдении почвенной температуры» и продемонстрировал фотографии почвенных разрезов, сделанных при температурных наблюдениях на разных глубинах [2, с. 3]. Наблюдения над температурой почвы производились с использованием изобретенного им для измерений степени влажности почвы прибора террогигрометра (лизиметра) [3, с. 3].

В зале Санкт-Петербургского Императорского географического общества в присутствии метеорологической комиссии член-сотрудник общества и корреспондент Главной физической обсерватории Я. Наркевич-Иодко сделал «интересный доклад о новоизобретенной им системе исследования и измерения степени влаги почвенной на разной ее глубине и в разнохарактерных типах почвы» [4]. В подтверждение теоретических данных он продемонстрировал сконструированный для этой цели новый аппарат – лизиметр или террогигрометр. Собравшиеся ученые и специалисты после всестороннего осмотра нового прибора и произведенных опытов признали этот лизиметр «вполне целесообразным и отличающимся точностью определения требуемых данных» [4].

